АГАТА ТУШЫНСКА

# Рускія ў Варшаве

## Змест


Апухцін . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .61
Арол . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .63
Артельщик . . . . . . . . . . . . . . . . . . .63
Афіцэры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .64
Балярыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .65
Бардэлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .66
Бібула . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .67
Бюракратыя . . . . . . . . . . . . . . . . .69
Вайсковае становішча . . . . . . . . .70
Вайсковая служба . . . . . . . . . . . .72
Войска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
Войска на вуліцы . . . . . . . . . . . . .75
Вусы і бароды . . . . . . . . . . . . . . . .79
Гарбата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .80
Гарэлка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .83
Генерал-губернатары . . . . . . . . .84
Грамадская прыбіральня . . . . . .85
Гузікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .85
Гурко . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .86
Даўгі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .87
Дзве мовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . .88
Дзень Ярдана . . . . . . . . . . . . . . . .90
Друк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .90
Жандары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .91
Замак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .93
Казармы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .94
Кацап . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .96
Клуб паляўнічых . . . . . . . . . . . .96
Конныя скачкі . . . . . . . . . . . . . . .96
Крупчатка . . . . . . . . . . . . . . . . . . .98
Лётаючы універсітэт . . . . . . . . . .98
Літвакі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .99
Марыя Андрэеўна . . . . . . . . . . . .99
Мундзір гімназіста . . . . . . . . . . .101
Мундзір студэнта . . . . . . . . . . . .101
Мяжа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .101
Мяшаныя сем'і . . . . . . . . . . . . . .105
Обер-паліцмайстар . . . . . . . . . .106
Ордэны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .106
Паляк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .107
Пансіёны для дзяўчат . . . . . . . .107
Помнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .108
Праваслаўныя могілкі . . . . . . . .109
Праваслаўныя святы . . . . . . . . .112
Пячаткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .112
Ранг, альбо чын . . . . . . . . . . . . .113
Расійкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .115
Расійскія раёны . . . . . . . . . . . . .115
Рублі і капейкі . . . . . . . . . . . . . .116
Рускі клуб . . . . . . . . . . . . . . . . . .117
Самавар . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .118
Свабода . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .118
Старынкевіч . . . . . . . . . . . . . . . .119
Суды . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .120
Сцягі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .122
Табельныя дні . . . . . . . . . . . . . .122
Участак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .125
Хабары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .128
Царква . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .129
Царскі універсітэт . . . . . . . . . . .136
Цукар марожаны . . . . . . . . . . . .137
Цыгарэты і запалкі . . . . . . . . . .139
Цытадэль . . . . . . . . . . . . . . . . . .140
Цэнзура . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .142
Цялесныя пакаранні ў войску .144
Чорная біжутэрыя . . . . . . . . . . .145
Школа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .147
Шыльды . . . . . . . . . . . . . . . . . . .150
Юльянскі каляндар . . . . . . . . . .152

Post scriptum . . . . . . . . . . . . . . .152
Рэкамендаваная літаратура . . .152
Пасляслоўе . . . . . . . . . . . . . . . . .154

У 1869 г. у Бельведэрскім парку Варшавы стаяў помнік Аляксандру I, Імператару Усяе Русі, Усмірыцелю Польшчы, Дабрачынцу.

У 1869 г. у Варшаве было тры склады ікры на вуліцы Сенатарскай і больш за дзесяць гуртовых складоў гарбаты, якія належалі маскоўскаму купцу Васілію Клімушыну.

У 1869 г. Цытадэль называлі жандарам Варшавы, і былі думкі, каб адкрыць кандытарскую, якая «аправаславіць палякаў пры дапамозе шакаладак».

У 1869 г. у Варшаве выраблялі ўпрыгожванні для мундзіраў, здымаліся апартаменты ў гатэлі «Санкт-Пецярбургскі», што размяшчаўся на вуліцы Гусяй (Gęsiej), а ў лабараторыі Варшаўскай ваеннай акругі прадавалі феерверкі.

Нельга было насіць нацыянальнага адзення нават у якасці маскараднага касцюма. Самы нецэнзурны прыметнік тады быў «польскі». У падручніках гісторыі дзеці чыталі: *Польша, главный город Варшава, народ ехидный, поклоняется Римскому Папе...*

Усюды, дзе толькі магчыма, будынкам надавалі рускі выгляд і стыль, пры гэтым знішчаючы аўтэнтычныя помнікі стылёвай архітэктуры. Гмахі ўрада ў гарадах — зазвычай гэта былі сканфіскаваныя палацы польскіх магнатаў — пакрывалі на рускі лад зялёнай бляхай і фарбавалі ў яскравыя колеры, на ўзор Кастрамы, Тулы, Калугі. На вуліцах нельга было пабачыць надпісу, які не быў бы перакладзены на рускую мову. На сценах дамоў былі завешаны дзвюхмоўныя шыльды, такім чынам, каб увесь горад мог служыць практычным дапаможнікам у навучанні рускай мовы. Вуліцы, палацы, сады хрысцілі імёнамі найгучнейшых *усмирителей*. Шмат касцёлаў перарабілі на цэрквы. Будаваліся новыя праваслаўныя храмы з залатымі купаламі ў тых месцах, дзе іх было найлепш відаць: на Саксонскай плошчы, на Плошчы на Раздарожжы, каля Пецярбургскага вакзала, пры ўездзе ў горад з боку Волі, Макатова, Жэраня. Пад канец веку праваслаўных храмаў было каля дваццаці.

У 1869 г. па варшаўскіх вуліцах ездзілі палкі чэркесаў у высокіх папахах, з загнутымі шаблямі з боку і кінжаламі за поясам. Маскоўская капела гучна грала «імператарскі гімн і мангольскія песні». Гандляры марозівам у чырвоных кашулях і белых фартухах выкрыквалі: *«Сахар мароз!»* Царскія афіцэры імкнулі на брычках з гумовымі коламі ў грамадзе шлюшак, што шалясцелі карункавымі сукенкамі. Па дарожках крочылі папы з доўгімі валасамі, вусатыя і барадатыя расійскія генералы з адхіленымі бартамі вайсковых шынялёў, а за імі — у адлегласці пару крокаў — казакі з нагайкамі. Балэндаліся простыя жаўнеры з высокімі скуламі і вузкімі вачамі і паліцэйскія — *околоточные*, якіх яшчэ называлі сальцісонамі (зельцамі).

Таемны агент, які стаяў бы (а ён пэўна стаяў), напрыклад, на рагу вуліцы Ардынацкай і Новага Свету, паміж вялікай крамай купца Чэрскага з каланіяльнымі таварамі і мясной крамай Гамера, налічыў бы за кароткі час больш за дзесяць абмундзіраваных асобаў. Вось пайшоў пан адвакат з вуліцы Мядовай, двое чыноўнікаў з фінансавага аддзелу і некалькі настаўнікаў. Усе ў капелюшах з вялікімі палямі іваўчком на абадку і, канечне ж, з кійком у руцэ. Пасля студэнты

ў цяжкіх бясформавых сурдутах і шапках, скроеных на ўсходні манер. Гімназісты ў формах шэрага колеру афіцэрскіх шыняльёў. У існасці, кожны трэці жыхар Варшавы насіў адзенне паводле афіцыйнага пакрою. Душа, цела, пашпарт і уніформа — вось з чаго складаецца чалавек паводле рускага прыслоўя.

Каб усё адбывалася пару гадоў пазней, таемны агент мог бы дапісаць да свайго данясення падслуханае абразлівае апісанне сабора на Саксонскай плошчы і яго званіцы, ахрышчанай «вежай уціску праваслаўя», альбо візантыйскага фасада Палаца Сташыца (найменшай абразай было, калі яго называлі эмаляваным вялікарускім гаршком). Шматлікімі эпітэтамі абзывалі і аўтара, што перарабляў гэтыя будынкі, Апухціна. Але цяпер таемны агент хвалюецца, ці не замала будзе данясення пра некалькі нядобранадзейных размоваў па-польску, таму ён старанна запісвае нумар дома і адчыненае акно, з якога ўжо не першы раз даносяцца ўпэўненыя такты паланеза Агінскага. Вядома, агент з радасцю пазначыць, што вайсковыя дудкі і бас царкоўных званоў досыць добра заглушаюць гэтыя такты.

Гэтыя дзве мелодыі нібы сімвалы двух светаў, якім давялося суіснаваць у сталіцы *Привислинья*. Знешняга (ці толькі знешняга?) накінутага свету пераможцаў і таго, якога «нацыянальны дух» супраць цара «ўсё ж па-польску шэпча».

Аднак сляды прысутнасці рускіх выцертыя з мастацкага вобразу таго часу, вобразу ўнутрана падзеленага, ня тоеснага сваёй рэальнай форме.

Тэкст уяўнага данясення вулічнага агента з шматлікіх прычынаў не мог бы з'явіцца на старонках аповесці Баляслава Пруса. Чужы для яе таксама тон ліставання іншаземцаў з Варшавы пасля паўстання 1863 г.

Дацкі крытык і гісторык літаратуры Георг Брандэс (Georg Brandes) пісаў:

*Плошча горада вялікая, але гэта заняпалае хараство і жахлівыя ўспаміны, якія хаваюцца ў сценах горада і аб якія мінак спатыкаецца на кожным кроку, ствараюць балючае ўражанне. У мінулым стагоддзі пасля Парыжа гэта быў найпрыгажэйшы горад Еўропы. На сённяшні дзень — правінцыйны расійскі горад. Калісьці — старадаўні і прыгожы, цяпер заняпалы і знявечаны. З кожным днём нішчыцца ўсё больш, а дзеля яго знешняга развіцця і росквіту ўлада нічога не робіць. Сэрца кроіцца, калі глядзіш на гэтыя марна брукаваныя вулачкі, ці на гэтыя брыдкія фігуры з пясчаніка, якія нібы ўпрыгожваюць Саксонскі сад, асабліва, калі вяртаешся з такога старадаўняга горада, як Вена.*

І далей:

*Рух на вуліцах немалы, на кірмашах жыццё кіпіць, так як і ўсюды, дзе купля-продаж адбываюцца пад голым небам. Але кожны іншаземец, безумоўна, вельмі здзівіцца, калі сустрэне трохі большую групу людзей, напрыклад, на шпацыры па галоўных вуліцах у нядзелю, ідзе не пабачыш таго вясёлага і святочнага выгляду ў жыхароў, які гэтак характэрны для вялікіх гарадоў.*

*Тут, наадварот, куды ні зірнеш — панурыя і заклапочаныя твары. Ніколі не давядзецца быць сведкам якога-небудзь жартоўнага ўчынку на вуліцы*[1].

Станіслаў Вакульскі жыве ў гэтым горадзе. Ён вядзе сваю справу, кахае, перажывае, есць біфштэксы, ездзіць на скачкі і на шпацыр па Алеях. Праглядае газеты, у якіх поўна інфармацыі пра стан дарог, формы выпечкі з розных пякарняў і ваганняў аўры. Можа, цікавяць яго экспанаты новаадкрытага Заалагічнага парку, ці жанчына, якая мае бараду даўжынёй 28 сантыметраў і на якую можна паглядзець, купіўшы білет у Літоўскім гатэлі на вуліцы Сенатарскай? Мы гэтага не ведаем. Не ведаем мы і таго, ці хадзіў ён на афіцыйныя (што гэта магло б значыць?) прыёмы, якія ладзіліся ў Ратушы, ці злаваўся ён з нагоды ўчынкаў войска (якога?), якое размяшчалася ў Лазенках. Не будзе ён злавацца на неабходнасць новай шыльды ў вітрыне крамы — канечне ж, па-руску, і не будзе сварыцца за брычку з афіцэрам.

Рэалістычны сусвет «Лялькі» ў пэўным сэнсе несапраўдны. Злеплены з аскепкаў штодзённасці, ён не кранае найбольш характэрных і найбольш непрыемных яе элементаў. Нагадвае цудоўную калекцыю старых фотакартак, старанна вырэтушаваных, так што нават цяжка паказаць замазаныя месцы; без дапамогі павелічальнага шкла гісторыі цяжка здагадацца, што яны ўвогуле былі. Нібы спецыяльна, аўтар не карыстаецца расійскімі колерамі. Ці было гэта з прычыны «кайданак на пяры» аўтара Варшаўскіх хронік? Не толькі. Гэта быў і жэст самаабароны. Байкот, які пярэчыць існаванню праціўніка, тым самым абяззбройваючы яго. Гэты ўнутраны погляд інстынктыўна адкідае ўсё, што чужое, варожае, замацаванае сілай, тое, што не заўважае змены дэкарацый, ані актуальнага рэпертуару — гэтая з'ява характэрная для эпохі пасля паўстання. Так у грамадзкім жыцці, як і ў мастацтве, і ў літаратуры.

Аднак, калі досыць лёгка можна змяніць сцэнаграфічны элемент да «Лялькі», накласці трошкі візантыйскага пакосту на гмахі і вуліцы, змяніць колеры, дадаць фігуры ў мундзірах, нашмат рызыкоўнейшай становіцца спроба рэканструяваць штодзённыя залежнасці. Намаляваць планы, сферы і паверхі сутыкнення, сустрэчы з чужой стыхіяй. Сустрэчы не на абодвух баках барыкадаў, але ва ўмовах штодзённасці, яшчэ больш небяспечных, бо яны пагражаюць асвоіць бунт і не кантраляваць узаемнага пранікнення ўплываў.

Дзве адрозныя, антаганічныя супольнасці, падзеленыя не толькі розніцаю палітычных інтарэсаў, але свядомыя сваёй культурнай, цывілізацыйнай і рэлігійнай розніцы, змушаны да суіснавання. «Гэта калі б апусціць арла ў ваду і загадаць яму плаваць разам з акуламі», — пісаў Бястронны[2].

Аляксандр Блок, рускі, здаецца, разумеў гэтую недарэчнасць:

[1] G. Brandes. Polska. Lwow, 1898. S. 13, 16.

[2] S. Bezstronny (S. Buszczyński). Okrucieństwa Moskali. Chronologiczny rys prześladowania potomków Słowian przez carow i moskiewski narod od dawnych wieków aż po dni dzisiejsze. — Lwów, 1890.

*Ці не з тае прычыны Варшава панурая, што ў гэтай сталіцы гаспадарыць нахабная зграя расійскіх ваенных філістэраў? Што будуе рускія саборы нейкі саноўнік-злодзей у тым месцы, дзе вока цешыў бы толькі каталіцкі касцёл? Што ўсё сказанае губернатарам — шэры, непранікальны змрок, і раз'юшаны паляк трымае ў кішэні дулю ў ягоны бок?*[3]

Неабходнасць жыцця ў сталай дваістасці і маральнай неадназначнасці пакінула след і на сцягах з надпісам «арганічная праца», і ў свядомасці тых, што неслі гэтыя сцягі. Штодзённасць не заключалася ў выкананні патэтычных жэстаў, аднак яна безупынна паказвала сваё палітычнае аблічча. Акурат таму яна патрабавала не меншай пільнасці і гатоўнасці да ахвярнасці, чым змаганне, якое носіць назву гераічнага. Можа, гэтая штодзённасць не эфектная на ўзроўні пучка радысу, пачка гарбаты ці бутэлькі гарэлкі, — больш яна належыць да той ананімнай гістарычнай цішыні, якая ўсё ж акрэслівае колер жыцця. І дзякуючы гэтай дробязнасці, прысутнасці ва ўсіх сферах, з'яўляецца не менш важнай за рытуал месцаў нацыянальнай памяці.

У бакавым крыле вялікага царскага палаца ў Крамлі ўжо ў мінулым стагоддзі быў арсенал. Турыст, што сюды завітаў, меў магчымасць агледзець 22 бюсты каралёў і слаўных мужоў польскіх, якія былі зроблены з мармуру і размяшчаліся на першым паверсе. Паверхам вышэй, у вялікай круглай зале, быў выстаўлены польскі трон, а каля яго карона, якую насіў апошні польскі кароль, Станіслаў Аўгуст. У суседняй зале, насупраць ношы пад балдахінам Карла XII з Палтаўскай бітвы, былі выстаўлены на экспазіцыю 60 сцягоў, здабытых у палякаў у 1831 і 1863 гг., падзіраўленых кулямі, з польскімі надпісамі, а каля іх, направа, памастацку выкананая закрытая шафа. У гэтай шафе захоўвалася ў якасці музейнага экспаната Канстытуцыя 3 Мая, у пэўным сэнсе «дыплом шляхетнасці Польшчы ў адносінах да іншых краін Еўропы». Нават у даведніку выгляд гэты рабіў «балючае ўражанне». А што ўжо казаць, задумаўся б турыст, — якія пачуцці павінен мець паляк у гэтай сітуацыі?

*Паляк, гледзячы на гэта ўсё, напэўна мае ўражанне, падобнае да таго, калі б ён чытаў уласнае прозвішча на магільным валуне*[4].

Законы не ведаюць, хто такія палякі, усе падданыя цара — расіяне. Уведзенае ў 1862 г. ваеннае становішча ў Каралеўстве фармальна ніколі не было скасавана. Праз трынаццаць гадоў пасля паўстання, падчас поўнага спакою, адначасна з увядзеннем агульнага судовага закону, была прынята пастанова Камітэта да Спраў Польскага Каралеўства аб

*захаванні права мясцовай адміністрацыі накладаць грашовыя і асабістыя пакаранні, без суда, за палітычныя правіны і непадпарадкаванне закону аб ваенным становішчы.*

[3] Цыт. паводле: A. Galis. Osiemnście dni Aleksandra Błoka w Warszawie. Warszawa, 1976. S. 124.
[4] Пар.: G. Brandes. Цыт. твор. С. 320.

Гэтая пастанова, якую называлі «часовай мерай», дзеяла да 1905 г.

У 1864 г. быў створаны Урадавы Камітэт, пад намінальным кіраўніцтвам намесніка Берга, аднак фактычным кіраўніком быў заўзяты палякажэр князь Уладзімір Чаркаскі, а таксама фанатычны вораг польскай шляхты і заходняй культуры Мікалай Мілюцін. Паволі і паслядоўна праводзяцца «рэформы», мэта якіх — ліквідаваць рэшткі ілюзорнай і сімвалічнай незалежнасці Польскага Каралеўства; заціраецца адміністрацыйная адасобленасць, знішчаюцца намяркоўна незалежныя арганізацыі. 1866—1869 гг. прыносяць ліквідацыю Адміністрацыйнай рады, Дзяржаўнай рады і Урадавых камісій: веравызнання і народнай асветы, унутраных спраў, даходаў і фінансаў. У 1868 г. польская мова выдалена з усіх аддзелаў урадавай службы.

*А тое, што паляк з палякам могуць уголас і пры людзях гаварыць на сваёй «другараднай» мове; далей, што паляк можа гэта самае рабіць пры дапамозе друку, зразумела, што ў межах цэнзуры, — гэта, паводле маскалёў, дастаткова «шчасця», як для «марнага ляха»; зусім шчаслівы ён будзе толькі тады, «калі мы зробім яго маскалём», гэта значыць, тады, калі ўрэшце ён пазбудзецца свайго «некультурнага» польскага «мясцовага дыялекту», які гамуе развіццё*[5].

Адзінае — у тэатры і касцёле, толькі ў літургіі і катэхізме можна было карыстацца польскай мовай (а ўжо акты грамадзянскага стану пісаліся па-руску). У 1869 г. закрылі Галоўную школу, а на яе месцы адкрылі расійскі універсітэт.

Спачатку адукацыйныя ўстановы, праз пару гадоў і суд (1876), а ў хуткім часе і ўся адміністрацыя пяройдзе ў рукі рускіх (рэестр з 1897 г. паказаў 1,1 % службоўцаў польскай нацыянальнасці на дзяржаўных пасадах). Будуць створаны новыя адміністрацыі для ўсіх 10 губерняў Каралеўства: Варшаўская вайсковая акруга, III Жандарская акруга, Варшаўскае ўпраўленне сувязі, Варшаўская навуковая акруга, Варшаўская судовая палата, Варшаўская падліковая палата, пракуратура Каралеўства Польскага. На месцы іх кантраляваў генерал-губернатар, а падпарадкаваныя яны былі адпаведным міністэрствам у Пецярбургу. Абмундзіраваныя чыноўнікі пачнуць выдаваць рашэнні ў грамадзянскіх, крымінальных пытаннях, у справах прапіскі, пашпартных; заграбуць пад сябе прэсу, грамадскія аб'яднанні, культурныя мерапрыемствы. Будуць вырашаць, як выкарыстаць бюджэт горада, дзелячы яго на свой одум. У 1887 г. на асвету было вылучана — калі пералічыць на кожнага жыхара горада — 24 капейкі. Хоць трошкі радуе той факт, што эканомілі не толькі на навуцы, але і на прадстаўнічых будынках у псеўдавізантыйскім стылі.

*Усе гэтыя чыноўнікі — гэта не проста выканаўцы ўсіх тых цыркуляраў, інструкцый, часовых прадпісанняў, якія маюць там ролю закону, але гэта*

[5] Nieco o słusznej nienawiści Polaków do Moskali. Warszawa, 1902. S. 2.

*дзеячы і прапагандысты вынішчэння польскай мовы, польскай цывілізацыі, нацыянальнай рэлігіі, і ўрэшце — нават самога права палякамі звацца,*

— пісаў Антоні Тышкевіч[6].

Пасля смерці Берга (1874) ужо не аднаўлялі функцыі намесніка, і тыя з яго наступнікаў, хто займаў месца ў Замку, называліся генерал-губернатарамі. Каралеўства стала ўнутранай расійскай тэрыторыяй. Варшаўскі магістрат быў дзяржаўнай расійскай установай, падпарадкаванай «Начальніку краю» і Міністэрству ўнутраных справаў. Большае значэнне, чым гарадскі галава, меў яго фармальны намеснік, які ажыццяўляў рэальную ўладу, — обер-паліцмайстар. Пачынаючы ад сямідзесятых гадоў — спачатку ва ўрадавай карэспандэнцыі, пасля ў расійскай публіцыстыцы — з'яўляецца назва «Привислинский Край» («Привислинье»), хоць ніякі афіцыйны ўказ на гэтую тэму ніколі не быў абнародаваны.

І гэта была не адзіная прыхаваная інфармацыя. Цэнзура стварала ў прэсе і літаратуры такую рэчаіснасць, якая супадала з «паноўнай на дадзены момант фікцыяй». Усе матэрыялы, прызначаныя да друку і літаграфавання, павінны былі прайсці цэнзуру. Ёй не падлягалі толькі запрашэнні на вяселлі і балі, этыкеткі, рахункі, папера да запакоўкі тавару, візітныя карткі, цэннікі без рэкламы, аб'явы аб продажы рэчаў і перамене месца пражывання. А надпісы на жалобных вянках ужо падлягалі цэнзуры.

*Сутнасцю расійскай сістэмы ёсць жорсткая ўлада, самадзяржаўная, заснаваная на прымусе, гвалце і тэроры, — пісаў Станіслаў Кашуцкі, — на сваволі бюракратыі, на ўтрыманні народу ў рабскім прыгнёце, на безупынным праследзе, правакаванні і знішчэнні з бязлітаснай жорсткасцю ўсялякіх праяў сапраўднай ці надуманай «нядобранадзейнасці»*[7].

А гэтае паняцце, як і «нелегальнасць» у Расіі, вельмі неакрэсленае і пастаянна зменлівае. Бывае, залежыць таксама і ад «ветру, якім вее ў генерал-губернатара». У пэўны момант усё можа зрабіцца нелегальным. Гэта забяспечвала абсалютную беспакаранасць з аднаго боку, а з другога, пагражала непрадбачанымі наступствамі. Прывід Сібіры нязводна лунаў над сучаснікамі.

Антоні Залескі так характарызаваў Расію:

*...патрэба формы і знешняга культу, а ў душы нігілізм, містыцызм, неабмежаваны сум і будыйская нірвана, дзіўным чынам змяшаныя; бязмежны сервілізм і дзёрзкасць, знешняя пакора і цвёрдасць і ўпартасць, даведзеныя часам да геройства; аграмаднае пачуццё месіянства і магутнасці дзяржавы і народу расійскага, а побач самалюбства і брыдкая і нізкая эксплуатацыя грамадства — вось сённяшняя Расія. Так што абсалютны хаос, элементар-*

[6] Hrabia Leliwa (A. Tyszkiewicz). Zarys stosunków polsko-rosyjskich. Kraków, 1895. S. 174.

[7] S. Koszutski. Co nam Rosja dała i co nam wzięła? Warszawa, 1917. S. 4.

*ныя стыхіі, спрэчныя і супрацьлеглыя духі рухаюць гэтую грамаду, што ферментуецца ўнутры пад уплывам новых цывілізацыйных павеваў. Усё гэта ўтрымлівалася дагэтуль у абдоймах самадзяржаўя, аднак цяпер яно пачынае расхіствацца. Для Польшчы прыліў і ўздзеянне такіх стыхій падобна да атруты, маральнай гангрэны і адначасова патопу*[8].

У 400-тысячнай Варшаве 1880-х гг. рускія без войска складалі 3 % ад усяго насельніцтва. Іх лічба хутка ўзрастала, з 17 тысяч у 1892 г. да 35 тысяч, г. зн. 4,1 %, у 1913 г. (У тым жа годзе ім належала 321 камяніца.) Павялічваўся таксама акупацыйны гарнізон — ад каля 6 тысяч у 1880-я гг., да 30 тысяч у 1890-я і 50 тысяч напярэдадні 1905 г. У арміі служыла прыкладна тры чвэрці рускіх, якія жылі ў горадзе, там таксама працавала і большая частка расійскай інтэлігенцыі (а не ў школах і ўстановах). Цывільныя чыноўнікі, купцы, галоўным чынам у каланіяльнай і тэкстыльнай галінах, нешматлікія рамеснікі (муляры і тынкоўшчыкі) дапаўнялі склад расійскай калоніі (ніколі не гаварылася аб расійскім грамадстве). Адсотак непісьменных сярод праваслаўных быў ніжэйшы, чым у іншых групах, значная перавага мужчынаў над кабетамі, дзяцей і старых было нямнога.

Варшава не лічылася найлепшым месцам службы для прыстойнага расіяніна. У ссылку, гэта значыла пасаду ў Прывіслінні, адпраўляліся тыя, каму з нейкіх прычынаў (галоўным чынам праз недахоп кваліфікацыі) не хапіла пасады ў Расіі. Звычайна чыноўніцкі персанал пакідаў жадаць лепшага як з гледзішча ўзроўню адукацыі, маральных якасцяў, так і тактоўнасці, сумленнасці ў выкананні службовых абавязкаў. Ужо Міцкевіч пісаў аб «адных лайдаках», якіх прысылаюць сюды з Масквы.

*Ад іх нічога не патрабуецца, — дадаваў Юзаф Пілсудскі на старонках «Robotnika» ў 1895 г. — Ад суддзі не патрабуецца ведання законаў, ад інжынера — механікі, ад настаўніка — педагогікі; дастаткова быць рускім, каб усё, у тым ліку і грамадскія фінансы, сталі даступныя для яго. Сынкі буржуазіі, дваранства і папоў, самазадаволеныя кансерватары і незадаволеныя лібералы ахвотна ішлі на заклік уладаў і стваралі бандыцкія банды, званыя чынавенствам*[9].

Чыноўніка хтосьці назваў найбольш нацыянальным стварэннем расійскай цывілізацыі і прамысловасці.

Выняткі, якія складалі заслужаныя варшаўскія рускія, — прэзідэнт Старынкевіч, якому горад абавязаны водаправодам і каналізацыяй, альбо разумны і кампетэнтны старшыня дырэкцыі Варшаўскіх дзяржаўных тэатраў Сяргей Муханаў, — толькі пацвярджалі правіла.

[8] A. Zaleski. Towarzystwo warszawskie. Listy do przyjaciołki przez Baronową XYZ (pierwodruk 1886 w krakowskim „Czasie”). Warszawa, 1971. S. 449–450.

[9] Józef Piłsudski. Rusyfikacja. Pisma. T. I. Warszawa, 1937. S. 97.

Да службы ў Прывіслінні царскі ўрад заахвочваў дадаткамі да заробкаў (кожныя пяць гадоў — 15 %), больш кароткім тэрмінам выслугі да пенсіі, невысокімі прафесійнымі патрабаваннямі, а перш за ўсё адносна лёгкай магчымасцю зрабіць кар'еру за ўзорную службу і — што яшчэ больш спакушала — памножыць сваю маёмасць з дапамогай хабару.

Хабарніцтва — найважнейшая характэрная рыса расійскіх чыноўнікаў. Яно было, як пісаў Салтыкоў-Шчадрын, абавязковым дадаткам і папраўкай да самадзяржаўнай канстытуцыі. Яго памеры і формы залежалі ад пасады і калібру справы, якую трэба было залагодзіць. Тады і паўстала прымаўка: не такі д'ябал страшны, калі бярэ ў лапу.

Формаў хабарніцтва больш ці менш яўнага было шмат. Яны рэгулявалі дачыненні паміж акупантам і падуладным насельніцтвам. Хабар парадаксальным чынам зрабіўся прыладай барацьбы ў руках абедзвюх супольнасцяў. З аднаго боку, ён быў нейкім інструментам аблашчвання і прыручэння чужых, «гуманізацыі» акупацыйных адносінаў, быў своеасаблівым спосабам грамадскай самаабароны. З другога — быў чымсьці накінутым звыш, вёў рускіх да паглыблення дэградацыі, палягчаў урастанне ў рэчаіснасць новай сістэмы. Падобным чынам данасіцельства паўсюль узнагароджвалася «шчодра рангам і вышэйшай пасадай». А таксама антысеміцкія настроі.

Інспіраваныя дзяржавай пасля смерці цара Аляксандра II жыдоўскія пагромы не абышлі і Каралеўства. На Каляды 1881 г. у Варшаве адбыліся сутычкі, да якіх пасіўна прыглядалася паліцыя. Генерал-губернатар Альбедынскі не дазволіў арганізаваць сярод палякаў грамадзянскай гвардыі, якая б сачыла за парадкам. Толькі пасля двух дзён беспарадкаў царскія ўлады пастанавілі ўмяшацца. Як вынік, было шмат трагічных здарэнняў. Французскі консул у сваім рапарце адзначаў, што пацярпела 2001 жыдоўская сям'я, у тым ліку 948 поўнасцю згалелі. Нанесена шкоды на 1200 тысяч рублёў.

Улады клапаціліся, каб рускія пачуваліся ў Варшаве як у сябе дома. Расійская калонія ўяўляла хутчэй замкнёнае грамадства, стварала ўласныя формы свецкага жыцця. Афіцэрскі корпус варшаўскага гарнізона меў уласныя палкавыя рэстараны. У 1864 г. быў заснаваны Рускі клуб, яму далі элеганцкае памяшканне на вуліцы Новы Свет у канфіскаваным палацы Замойскіх. Антоні Залескі (пад псеўданімам «Baronowa X. Y. Z.») назваў гэтую сядзібу «галоўнай стаўкай набеглай арды». У 1866 г. было заснавана Расійскае дабрачыннае таварыства, з бюджэтам каля 18 тысяч рублёў ужо ў 1885 г. Арганізоўваліся таксама расійскія спартовыя клубы, аматарскія прадстаўленні, чытанні, вечарыны. Напрыканцы стагоддзя папулярнасцю карысталася «Александрина» — вялікая рэстарацыя са сцэнай на другім паверсе дома на рагу Новага Света і Свентакшыскай. У час кіравання Гурка павялічылася лічба расійскіх дабрачынных установаў. Стараліся культываваць праваслаўны празелітызм сярод беднейшага польскага насельніцтва. Але без поспеху. Жонка генерал-губернатара, зняслаўленая і ненавісная Марыя Андрэеўна, мела бзік на «дабрачыннасці», збірала грошы на цэрквы, прытулкі і капліцы, у тым ліку сярод палякаў.

Тон рускага жыцця ў Варшаве задавалі вайскоўцы. Іх прысутнасць у горадзе была відаць на кожным кроку. Яны правакавалі насельніцтва ўвесь час. А казармы і баракі з чырвонай цэглы на Чарнякоўскай, плошчы Жалезнай Брамы, на Закрачымскай, Канвікторскай, Маршалкоўскай, у Лазенках рабілі ўражанне чагосьці «чужога і варварскага» побач з палацамі і камяніцамі. Як і агляд войскаў маскоўскімі генерал-губернатарамі перад саборам на плошчы Красіцкіх. Як і стыль жыцця і манера бавіць вольны час, якія непазбежна робяцца прыкладам для пераймання.

Азартныя гульні і гучныя авантуры, моцна запраўленыя алкаголем, былі улюбёнымі забавамі прыхадняў з Усходу. Яны вялі разгульны лад жыцця, пераўзыходзячы нават магчымасці «шырокай» расійскай душы. Больш заможныя афіцэры (звычайна гвардыя) рабіліся героямі варшаўскага паўсвету. Гулялі заўзята звычайна на Аградовай, Шырокай, Свентаерскай, бязглузда раскідаючы грошы, здабываючы танную папулярнасць. Асаблівую сімпатыю яны выклікалі ва ўладальнікаў рэстаранаў — праз шчодры гасцінец. А вясёлыя дзяўчаты, якія любяць як адзявацца, так і раздзявацца, піць у нумарах і гуляць, вельмі цанілі расійскіх апекуноў.

*Не будзе мяне мама біць,*
*што змагла сто злотых зарабіць —*
*у Пракульскай пад клёнамі*
*зарабіла... з уланамі!*

— пялі прыпеўкі на падворках легкадумныя дзяўчаткі, а парк на Пракульскай палякі абыходзілі стараной[10].

Патрыёты абвінавачвалі акупантаў у спрыянні распуснасці, мэтанакіраванай дэмаралізацыі грамадства, атрыманні даходаў з публічных дамоў і выкарыстоўванні іх дзеля аператыўных мэтаў. «Патронкай расійскага бязладдзя была царыца Кацярына», — з горыччу напіша Баляслаў Карэйва, аўтар кнігі пад красамоўнай назвай «Дзве маральнасці і барацьба з бязладдзем»[11]. Сапраўды, расійская паліцыя кантралявала і наведвала публічныя дамы не толькі дзеля праверкі гігіены; можа, крыху перабольшвае гісторык прастытуцыі Юзаф Мацко, сцвярджаючы, што ўсе ўладальнікі бардэляў, альфонсы, сутэнёры і прастытуткі былі штатнымі супрацоўнікамі ахранкі[12]. Варшаўскія бардэлі служылі як палітычным мэтам, так і прыватным інтарэсам прадстаўнікоў расійскай улады, адміністрацыі, войска.

Погляд на тэму маралі расійскіх войскаў можна скласці на падставе аналізу пакаранняў. Так, найбольшая іх колькасць тычыцца крадзяжоў і п'янства. З 100 пакараных 67 караліся за крадзеж; столькі ж за п'янства. Вельмі рэдка сустракаюцца пакаранні за непаслушэнства альбо дэзерцірства.

[10] F. Galiński. Gawędy o Warszawie. Warszawa, 1937. S. 137.

[11] B. Koreywo. Dwie moralności a walka z nierządem. Poznań, 1925. S. 5.

[12] J. Macko. Prostytucja, nierząd, handel żywym towarem. Warszawa, 1927. S. 40.

«Мая душа вырынае іх з сябе арганічным чынам» («Moja dusza wydala ich z siebie w sposyb organiczny»), — запэўнівае паэт. У свядомасці палякаў глыбока ўкаранілася ўпэўненасць, што «яны гэта ўсё ператрываюць». Гэтае ўнутранае крэда, якое грунтавалася на захаванні адметнасці, падавалася адзінай паспяховай метадай ратавання нацыянальнай годнасці. Байкот рускіх зрабіўся своеасаблівым ладам жыцця, патрыятычным абавязкам, як куплянне польскіх кніг і падпісванне на газеты.

Выключэнне з грамадства пагражала таму, хто не прыстасоўваўся да прынятых у польскім асяроддзі правілаў паводзінаў з захопнікам. Але супольнасці бывалі розныя.

«Мур размежавання на працягу апошніх гадоў узмацніўся, ахопліваючы ўсе класы нашага грамадства», — пісаў у 1895 г. Мечыслаў Афманскі[13]. Гэтае цверджанне не цалкам праўдзівае, аднак яго і нялёгка праверыць. Вельмі цяжка акрэсліць маштаб з'явы байкоту. Ясна, было б перабольшваннем казаць пра ўсё грамадства. Польская арыстакратыя гадамі падтрымоўвала кантакт з элітай улады. Звужэнне справы выключна да сферы інтэлігенцыі таксама можна было б паставіць пад пытанне. Тым больш, што збліжэнне прыхільнікаў левых рэвалюцыйных рухаў Польшчы і Расіі не было рэдкасцю. Мы ведаем шмат польскіх патрыётаў, якія былі «сябрамі маскалёў» і маглі адрозніваць народ ад яго ўлады. (Адносна прадстаўніцтва расіян на землях «Привисленского края» гэта было нялёгкай задачай.) Гаворка не ідзе пра выбраных людзей альбо пра асабіста праяўленыя сімпатыі. Гэта тычыцца больш шырокай з'явы, якую немагчыма абмінуць у разважаннях аб грамадскім жыцці палякаў пасля 1863 г. Перыядзе, неаднародным паводле сваёй палітычнай формы, падчас якога новую дынаміку атрымалі і польска-расійскія дачыненні (гады пасля паўстання і пазнейшыя Гурка і Апухціна непараўнальныя з канцом стагоддзя, які азначыўся візітам Мікалая II — 1897 г., адкрыццём помніка Міцкевічу — 1898 г., пабудовай Політэхнічнага інстытута — 1899—1901 гг.).

Байкот ахопліваў розныя сферы жыцця. Ад тавараў, мовы і асобаў — да рускай літаратуры і тэатру.У яго былі розныя формы, розныя ўзроўні паслядоўнасці ў ажыццяўленні. Прамысловая дзейнасць была вельмі залежная ад палітычнай і вайсковай улады і несла з сабой неабходнасць кантактаў з высокапастаўленымі расіянамі. Эканамічныя сувязі ўзмацнялі, апроч прыватнага, таксама дзяржаўны капітал. І звычайна яны не заканчваліся службовымі дачыненнямі. Буйныя фінансісты без ваганняў падраджаліся на дзяржаўныя пастаўкі. Купцы і фабрыканты дзякуючы ўгодам з Расіяй неаднойчы зараблялі салідныя капіталы. Залатадайныя канцэсіі зрабілі з Блёхаў і Кроненбергаў буйных верхаводаў. Аднак і ім выпадала з знявагай глядзець на пераадзетых у парадную форму жаўнераў, якія забаўляліся ў Варшаве. Арыстакратыя, як і даўней, не цуралася Замка. Яго паркеты і пышнасць былі зусім чужыя толькі работніку або рамесніку. Для яго расіянін у мундзіры прадстаўляў уладу, а на яе загад за любое парушэнне —

[13] Orion (M. Offmański). Charakterystyka rządów Aleksandra III na ziemiach polskich (1881—1894). Lwów, 1895. S. 61.

абвінавачанне ў бадзяжніцтве ці размову на палітычныя тэмы ў карчме — маглі кінуць у халодную, аддаць на цялесныя пакаранні альбо выслаць у рэкруты. Побач з свядомым інтэлігентам ці мешчанінам менавіта ён быў важным, патэнцыйным удзельнікам байкоту. З-за свайго сацыяльнага стану работніку ці рамесніку былі даступныя толькі некаторыя яго формы.

Найпрасцейшы парыў апісвае ў сваім апавяданні Вычулкоўская-Сурынова. Гераіняй з'яўляецца маладая гувернантка:

*Насустрач ёй ідзе расійскі афіцэр. Пані Антолька перабегла на другі бок і ледзь не трапіла пад* истинно русские *капыты рысакоў, якім кіраваў тоўсты фурман. На вуліцы Доўгай грае вайсковая музыка. Пані Антолька затыкае вушы далонямі ў шаўковых пальчатках і не дазваляе сабе і іншым слухаць гэтай музыкі*[14].

Ізабэла Ленцка такіх жэстаў не робіць. Мы не ведаем, ці было ёй вядома няпісанае права купляць толькі ў польскіх крамах і заказваць тавары ў польскіх рамеснікаў. Забарона купляць у рускіх тычылася найперш афіцэрскай крамы ў Новым Свеце ў былым палацы Замойскіх, у якім забяспечваўся Замак і ўсё вышэйшае вайсковае камандаванне, размешчанае ў Варшаве. (Таксама гэта тычылася рынкаў, дзе расіяне гандлявалі мясам, салам, алеем ці мылам.) Не належала таксама купляць тавары, якія былі маркіраваныя толькі надпісамі на расійскай мове. Галоўным чынам гэта тычылася цыгарэтаў і запалак, пушкі ад якіх былі размаляваны ў «багамазы», што прадстаўлялі бяседныя сцэны з жыцця расійскіх генералаў. Цыгарэты, дзеля іх «маскальскага паходжання», якія гэтую згубную прывычку ў нас распаўсюдзілі, байкатавала рэдактар «Bluszcza» Марыя Ільніцкая, жонка сібірскага ссыльнага, забараняючы курыць падчас аўторкавых сходаў у сваім доме.

Сапраўдныя палякі, як пішуць патрыятычныя брашуры, звычайна не ўжывалі расійскіх назваў вуліц і плошчаў (мост Кербедзя рэдка называюць Аляксандраўскім), на вакзале наймалі польскага насільшчыка, а не расійскага *артельщика*. Таксама лічылі, як і раней, у злотых і грошах.

Без расійскіх цыгарэтаў можна было абысціся, цяжэй было адмовіцца ад звычаю піць гарбату. У той час у Варшаве была выключна расійская гарбата, і пілі яе на ўзор рускіх — з шклянак. Яе стараліся купляць не ў расійскіх крамах, дарма што іх было вельмі шмат, аднак маскоўскія купцы, якія гандлявалі гарбатай (такія, як Істомін, Шумілін) нават пры такім раскладзе зараблялі немалыя капіталы. Неабходным сімвалам хатняй утульнасці ў тагачаснай Варшаве стаў бліскучы самавар. Жоўтыя масянжовыя самавары з Тулы хутка пачалі замяняць нікелевыя польскія, якія вырабляліся на месцы. Нягледзячы на непрыязнасць расійскіх тавараў, некаторыя з іх прыжыліся на доўгія гады: побач з шампанскім і халвой — каўказская нафта, пецярбургскія ніткі, рыжскія галёшы і ландрынкі, назва якіх паходзіць ад прозвішча расійскага фабрыканта Ландрына.

[14] J. Wyczołkowska-Surynowa. Warszawianki. Warszawa, 1920. S. 215

Падчас шматгадовага сужыцця, у тым ліку эканамічнага, немагчыма было пазбегнуць такога роду ўплываў. Гэта, аднак, была самая лагодная форма навязвання ўласных упадабанняў і волі. Грамадскі астракізм прывёў да таго, што паляк не мог беспакарана ўзяць у грамадскіх месцах рускай газеты. Баючыся грамадскага асуджэння, ён не адважваўся зайсці ў царкву ўдзень для задавальнення сваёй цікавасці. А мелодыя саборных звонаў гучала прывабна, як запэўнівае Бенедыкт Хэрц.

*Ведаў, што як паляку яны не павінны мне падабацца, аднак (што паробіш?) слухаў іх — на маё асабістае засмучэнне — з прыемнасцю... Гэта быў першы разлад у маёй душы*[15].

Цяжка адказаць на пытанне, якім быў — з аднаго боку — фактычны абсяг вонкавага ўздзеяння Расіі, а з другога — воля да супрацьву і непадпарадкавання чужым узорам. Бывала і так, што абедзве пазіцыі выяўляліся ў адной біяграфіі. Фердынанд Хёсік (Hoesick) успамінае сваё захапленне парадам войска на Макатоўскім полі ў маладосці, свой шчыры плач па вестцы аб удалым замаху на цара Аляксандра II, а пазней усё большае непрыняцце, «інстынктыўную агіду» да ўсяго, што «патыхала Расіяй і Усходам»[16].

Штодзённай абаронай, якая стварала псіхічную дыстанцыю, а тым самым і пэўную форму незалежнасці, быў смех.

«Слоўнічак запазычаных выразаў для карыстання грамадзянамі Каралеўства Польскага» («Słowniczek obcych wyrazeń dla użytku obywateli Królestwa Polskiego») Антонія Арлоўскага і Уладыслава Бухнэра падае набор тагачасных жартаў, што дакументуюць незалежнасць духу. Вось некалькі прыкладаў:

*ad acta — ільготы для Каралеўства; штык — канстытуцыйны інструмент; шар — акружны камісар падчас ваеннага становішча; пастарунак — Дума ў Варшаве; цывілізацыя — слова, выключанае з карыстання ў Расіі; хуліганства — права на асабістую свабоду; саджанец — пераняссенне вахмістра з Сызрані ў Каралеўства на пасаду настаўніка рэлігіі ў гарадскую школу; ілюзія — скасаванне ваеннага становішча; канстытуцыя — пералом некалькіх рэбраў, адрыванне рукі і нагі, пяць куляў у галаве ці жываце; vis major — далонь жандара велічынёй з дыню.*

І яшчэ некалькі папулярных тады анекдотаў:

— *Што вы робіце, калі ў вас закрываюць адно выданне?*
— *Валімся са смеху на падлогу, а потым падымаемся і ствараем іншае.*

[15] B. Hertz. Na taśmie 70-lecia / Oprac. L. B. Grzeniewski. Warszawa, 1966. S. 35.
[16] F. Hoesick. Powieść mojego życia. Wrocław — Kraków, 1959. T. 1. S. 174—175.

*— Прабачце, як адсюль дабрацца да турмы для палітычных?*
*— О, кашляні. вашаць, вось тут на рагу тры разы, а пасля вас туды давядуць.*

*— Ці праўда, што на пошце ў Каралеўстве збіраюцца ўвесці «польскі язык»?*
*— А так, для налеплівання марак*[17].

Візіты на пошту, у рэгістрацыйнае бюро, на чыгуначны вакзал выклікалі ў палякаў неабходнасць непасрэдна кантактаваць з чыноўнікамі. Наколькі дзейнічалі абарончыя механізмы? Станіслаў Кашуцкі пісаў:

*Выпрацоўваюцца звычкі на расійскі капыл: замест далікатнасці, ветлівасці ў адносінах культывуецца пыха, нахабнасць, брутальнасць, асабліва да слабейшых і залежных людзей. Да якой ступені было непазбежным прыняцце такога тону? Да людзей, якім даводзіцца вырашаць пытанні ва ўрадавых установах, загадзя ставіліся паблажліва, ніхто не шкадаваў іхнага часу, і на кожным кроку ім даводзілася сутыкацца з залежнасцю ад «улады»*[18].

Штодзённае жыццё прымушала разглядаць шэраг справаў з урадавымі органамі. У такіх выпадках байкот тычыўся мовы гутаркі. У зборы палітычных дырэктываў для палякаў пад расійскім панаваннем, т. зв. «Нацыянальных запаветах», чытаем у трэцім пункце:

*Да ўсіх чыноўнікаў, губернатараў, вайскоўцаў, суддзяў і на пошце звяртацца толькі па-польску, а калі яны адказваюць па-маскоўску, гаварыць ім «не разумею», бо кожны ўраднік абавязаны ведаць польскую мову*[19].

У практыцы рэдка ўдавалася паразумецца з чыноўнікам без дапамогі чужой для просьбіта мовы. Ніводзін суд у Каралеўстве Польскім не разглядаў скаргаў, напісаных па-польску, трэба было перакладаць на рускую мову нават прозвішча пад прашэннем. Ад 1883 г. перасталі прымаць сведчанні ад сведкаў на польскай мове, якія *павінны* ведаць рускую мову. Аляксандр Мушыга, які падчас працэсу аб забойстве Марыі Вісноўскай адмовіўся карыстацца рускай мовай, падкрэсліваючы, што хоць ён і быў выхаваны ва Украіне, усё ж пачуваецца палякам, адразу быў выдалены з Варшавы.

Такім чынам, рускай мовай карысталіся адно для адміністрацыйных патрэб, пад прымусам. Аднак ва ўсіх школах, вышэйшых і ніжэйшых навучальных установах яна служыла для выкладання ўсіх прадметаў, нават для вывучэння польскай мовы. «Нацыянальныя запаветы» радзілі так:

[17] Krogulec i Ner. Buch. (A. Orłowski, W. Buchner). Roku pierwszego konstytucji. Satyry. Kraków, 1907. S. 10, 62, 107—111.
[18] S. Koszutski. Цыт. твор. С. 22—23.
[19] Przykazania narodowe. Zbiór wskazówek politycznych dla Polaków pod panowaniem rosyjskim. Wyd. przez stronnictwo demokratyczno-narodowe w zaborze rosyjskim po 1905 roku. S. 5—6.

*Перасцерагаць дзяцей, якія ходзяць у школу, а таксама старэйшых, каб не гаварылі па-руску, не ўжывалі рускай лаянкі, не спявалі рускіх песень, бо кожны сапраўдны паляк павінен гаварыць на той мове, на якой матка навучыла яго пацерам*[20].

«Разговоры на польском наречии» ў школе падчас перапынку каштавалі вучням шматгадзіннага карцару альбо двойкі па цэнзуры з-за «непадпарадкавання правілам аб гутарковай мове». Таксама каралася чытанне кніжак, адрозных ад бібліятэчных. Не толькі Міцкевіча альбо Славацкага ў замежных выданнях, але Байрана, Дантэ, Шэкспіра ў арыгінале. Школьныя кнігазборы былі пад пільным наглядам урада. Адпаведнае прадпісанне забараняла вучням мець якія-небудзь публікацыі, не дазволеныя «гімназійнай уладай». Кнігі, рэкамендаваныя Міністэрствам асветы альбо Духоўным упраўленнем у справах праваслаўнага вызнання, стараліся байкатаваць. Не зважаючы на рэпрэсіі, моладзь гэтак жа ставілася да вечарын, арганізаваных Расійскім Чырвоным крыжам — з-за русіфікатарскага характару гэтай установы. Цяжэй было сабатаваць удзел ва ўрачыстасцях, на якіх з-за ўзмоцненага кантролю было добра відаць нават спазненне; аднак, спяваючы вернападданніцкія гімны, як успамінаў Ванькавіч, стараліся адно адкрываць рот. Да абавязкаў вучня належала таксама святкаваць усе праваслаўныя і ўрадавыя святы. Трыццаць шэсць разоў на год былі вымушаны падчас вечаровых ілюмінацый аглядаць ініцыялы цара і царыцы, складзеныя з напоўненых лоем лямпачак. З мэтай рэлігійнай прапаганды выкарыстоўваліся ўсе ўрадавыя і рэлігійныя гадавіны. Вельмі шмат іх прыпала на перыяд кіравання Аляксандра III (трохсотгоддзе далучэння Сібіры — 1882, сотая гадавіна далучэння Крыма — 1883, дзевяцісотгоддзе Хросту Русі — 1888).

Царская школа тых гадоў атасаямлівалася з прозвішчам куратара Варшаўскай навучальнай акругі Аляксандра Львовіча Апухціна, паслядоўнага і ініцыятыўнага русіфікатара. Кракаўскі «Diabeł» даносіў аб цыркуляры, які забараняў навучэнцам навучальных устаноў... думаць па-польску.

Апухцін стварыў школу, як казаў Прус, «з слёзаў, крыкаў і поту». «Бюракратыя і русіфікацыя» мелі адну мэту — ператварэнне «праўдзівых палякаў у яшчэ больш праўдзівых рускіх». Гэты вялікі канвеер дэнацыяналізацыі ўрэшце выхоўваў толькі нянавісць да ўсяго, што было расійскім. Да настаўнікаў і ўрада, які іх прызначаў, народу, які іх выхаваў, цэлай сістэмы, якая санкцыянавала ўсё гэтае бяспраўе. І калі юнак накідаў гэтае пякельнае месца, ён ужо быў гатовы кандыдат у палітычныя агітатары. (Хоць не кожны і не адразу.) Школа, навязваючы погляды на свет, крайне адрозныя ад тых, якія былі прынятыя дома, абражала народныя і рэлігійныя пачуцці, вучыла крывадушнасці і ілжывасці, канфармізму, засяроджванню энергіі выключна на сваім выжыванні. Шырока распаўсюджаная сістэма даносаў прызвычаіла да няшчырасці. Так можна было выхаваць, як той казаў, «герояў альбо крэтынаў». Увесь час даводзілася развяз-

[20] Przykazania narodowe. Zbior wskazówek politycznych... С. 6.

ваць фундаментальныя пытанні. Штодзень трэба было выбіраць: «апусканне ў подласць альбо крывадушнасць».

*Прымус не толькі вучыцца, але і гаварыць на чужой мове, пагардлівае стаўленне школьных уладаў да палякаў і пераслед польскай мовы будзяць у ім усведамленне, што Польшча ў няволі, пачуццё народнай крыўды, — напіша Марыя Дамброўская аб Станіславу Стампоўскім. — Адно дэнацыяналізуючая сістэма царскай школы зрабіла для яго Польшчу чымсьці блізкім, што патрабуе пазнання і актыўнай пазіцыі. Але Стампоўскі не запыняецца на пошуку ў сабе жывых пачуццяў польскасці, ані замыкаецца ў іх. У таемнай вучнёўскай суполцы ён будзе нагбом чытаць недазволеную польскую літаратуру, аднак таксама будзе чытаць і забароненыя расійскія радыкальныя грамадскія і палітычныя выданні*[21].

Гэткае стаўленне да рускай літаратуры было характэрнае. Спачатку ігнараваная, бо яна «шчыльна і сцісла адасабляла ад ворага на кожным участку барацьбы, у тым ліку і на на духоўным», аднак з часам яна пачала служыць адной з формаў пратэсту[22].

Расійскую мову вучылі з абавязку, але і з неабходнасці, бо без яе ведання немагчыма было скончыць гімназію. У «Сізіфавых працах» Жаромскі[23] пісаў:

*Марцінэк добра гаварыў па-расійску: пісаў на гэтай мове сачыненні, вывучваў на памяць урокі, нават мысліў устойлівымі выразамі, аднак несвядома ставіўся да гэтага «прадмета» як да мовы школы, мёртвай, як да віду сучаснай лаціны*[24].

І такая адукацыя не магла не паўплываць на польскасць дзяцей нават з найбольш патрыятычных сем'яў.

Жыхары падрасійскай Польшчы выпрацавалі ў сабе пэўную псіхічную адпорнасць на гэтую мову, якая атакавала мінака на кожным кроку. Прыезджыя з-за мяжы рэагавалі менш стрымана. «Толькі гэтая мова... быццам уласную забыліся!» — азмрочыўся Людвік Сольскі. Стараліся знайсці якое-небудзь іншае, ускоснае выйсце з моўнай дылемы. На паратунак прыйшла модная французская мова, другая дапаможная мова палякаў. Па-французску пісалі адрасы на лістах, ужывалі яе для азначэння музычных кампазіцый, а таксама для подпісу абавязковых шыльдаў. Па-французску звярталіся да рускіх, калі выпадкова аказваліся ў адной кампаніі. Нейтральным месцам такіх спатканняў быў тэатр. Абсалютна польскі, хоць і пад рускай уладай, ён прыцягваў разнастайных

[21] M. Dąbrowska. Wstęp / S. Stempowski. Pamiętniki (1870—1914). Wrocław, 1953. S. VIII.

[22] A. Brückner. O literaturze rosyjskiej i naszym do niej stosunku dziś i lat temu trzysta. Warszawa, 1906. S. 11.

[23] Стэфан Жаромскі (14.10.1864—20.11.1925) — польскі празаік, публіцыст, драматург, называны «сумленнем польскай літаратуры». *(Заўв. перакл.)*

[24] S. Żeromski. Syzyfowe prace. Warszawa, 1973. S. 160.

прыхільнікаў таленту тэатральных зорак. Толькі з сцэны і з алтара публічна гучала польская мова.

Узрушэнні, якія прыносілі сказаныя ўголас польскія словы, адбіралі, як піша Эліза Ажэшка, «у нерваў магчымасць нармальнай працы, не дазвалялі думкам сабрацца, гасілі рэфлексію на карысць пачуццяў...»[25]

«Польскія кампаніі з расійскімі не таварышуюць», «вайсковы мундзір у польскім таварыстве робіць непрыемнае ўражанне...» — вельмі шмат такога кшталту сказаў можна прачытаць ва ўспамінах аб той эпосе. Трэба зазначыць, аднак, існаванне частых і ідавочных выключэнняў з гэтага правіла. Голас сумлення часам заглушала прага нажывы або шыкоўнага жыцця, патрэбу жэсту замяняў матэрыяльны інтарэс ці капрыз.

Ежы Ляшчынскі назваў марнатраўцамі тых, хто братаўся з найвышэйшымі царскімі чыноўнікамі, такімі, як генерал Гурко, цэнзар Янкуліо, куратар Апухцін ці жандарскія начальнікі. Больш радыкальныя патрыёты знойдуць для іх акрэслення менш вытанчаныя эпітэты. «Нацыяльныя запаветы» ў гэтай сферы былі вельмі катэгарычныя. Трэба

*пазбягаць тых, хто сябруе, п'е з жандарамі, стражнікамі, начальнікамі і іншымі маскалямі; трэба з іх пры кожнай магчымасці насміхацца, кпіць, асабліва з дзяўчат і жанчын, каб усім астатнім убіць у галаву, што такія людзі ня вартыя ніякай пашаны.*

І далей:

*Стражнікаў і жандараў і іншых маскалёў дадому не запрашаць, не размаўляць, а калі сам улезе, выганяць яго чым пад руку патрапіць, не даваць яму ні пра каго ніякіх звестак*[26].

Антоні Слонімскі ўспамінаў, што калі яго дзядзька, царскі палкоўнік, хацеў наведаць сваю швагерку, Антоніеву матку, то ішоў да ахоўніка, каб даведацца, ці няма доктара Слонімскага дома, і толькі тады цішком, кухоннымі сходамі, падымаўся наверх.

Рускага афіцэра ніколі не прымалі ў польскіх дамах, нават роднага сына, які насіў усім ненавісны мундзір, не пушчалі на большыя таварыскія зборкі. Было немагчыма, каб у доме Эдварда Леа ці Тадэвуша Корзана, у салоне Аляксандра Краўсгара альбо на вядомых пятнічных зборках Караля Бені з'явіўся расійскі чыноўнік ці вайсковец. Хатнія таварыскія зборкі былі адзінай формай свабоднага выяўлення пачуццяў, выказвання часта нецэнзурных поглядаў. Літаратурныя і палітычныя дыскусіі, якія вялі там прадстаўнікі свету навукі і мастацтва, не былі прызначаны для непаклікаdebных. Так прыватная сфера дома як найстражэй абаранялася ад уплываў неадпаведных людзей.

[25] E. Orzeszkowa. Listy zebrane. T. IV. Wrocław, 1958. S. 198–199.

[26] Przykazania... Цыт. твор. С. 6

Афіцэр, самы прыстойны —

*не быў, прынамсі ў тутэйшых кампаніях, пажаданым госцем, — тлумачыла сяброўцы Баранеса XYZ, — і калі ў Варшаве ўвогуле не было прынята, каб паненкі хадзілі на публічныя балы, то пераважна праз тое, каб не знаёміліся і не танчылі з імі*[27].

Не бывалі афіцэры на польскіх балах і маскарадах, у клубах. У Купецкім клубе, дзе збіралася заможнае мяшчанства, забаранялася прымаць вайскоўцаў. Грамадзянскі клуб (Obywatelska) трымаўся ў сціслым і замкнёным коле. Толькі на Новы год людзі ў мундзірах дапускаліся ў Купецкі клуб. На Сенатарскай, 26 бавіўся ўвесь афіцыйны свет.

У нядзелю асноўнай забавай для заможных варшавян былі конныя скачкі. Тут таксама палякі спатыкаліся з рускімі. Разам з тэатрам гэта было другое такога кшталту месца. Трэцім быў Клуб паляўнічых, які быў створаны з мэтай навязвання таварыскіх кантактаў польскай арыстакратыі з тытуляванымі прадстаўнікамі варшаўскіх расіянаў. Там панаваў азарт. Гульня ішла высока. Зрэшты, карты лічыліся рускай спецыяльнасцю. Марыя Андрэеўна, арганізаваўшы раўт у гонар святых Кірыла і Мяфодзія, хочучы надаць патрыятычнаму сходу «чыста нацыянальную афарбоўку, сама села за карты з цыгарэтай у зубах»[28]. А палякі пісалі працяг «Нацыянальных запаветаў»: «Трэба асцерагацца п'янства, палення тытуню і заўзятага гуляння ў карты, бо гэта набівае кішэні ворагу»[29]. У 1905 г. у Варшаве, апрача скідання гербаў і расійскіх шыльдаў, вылівалі гарэлку ў канавы і палілі манапалькі.

Палякі абміналі Замак. Аднак на адбываных там досыць часта афіцыйных балах — «нягледзячы на ўсю агіду», як пісаў французскі консул, пэўныя колы мусілі прысутнічаць. І не для ўсіх гэта быў прыкры абавязак. Толькі ў час Гурка назіралася імкненне паменшыць колькасць гэтых візітаў. Маладым Гуркам, афіцэрам гвардыі, нават іх палкавыя калегі не падавалі рукі.

Польскія паненкі не бывалі ў Замку, хоць Гуркова жонка старалася з усёй сваёй грубіянскай натуры навязліва падтрымліваць прыязныя дачыненні з польскай арыстакратыяй. Часцей за сваіх жонак бывалі там (паводле службовых абавязкаў) мужчыны. Аўгуст Панятоўскі, папулярны граф Гуча, улюбёнец варшаўскай моладзі, адмаўляўся ад удзелу ў прыёмах Марыі Андрэеўны. Ён выразна цураўся Замка ў час Гурка, не займаў ніякіх афіцыйных пасадаў, што яшчэ больш павялічвала сімпатыі варшавянаў да яго.

Напэўна, першай полькай, якая вырашыла з'явіцца на прыёме ў Замку, была акторка баранэса Людэ. Мо і не першая, але сам факт, што ўвогуле там з'явілася, пацвярджае звычай акторак унікаць таварыскага байкоту. Прыгажуня Вісноўская прымала афіцэраў у сваім будуары. Атрымаў розгалас раман

[27] A. Zaleski. Towarzystwo Warszawskie. Цыт. твор. С. 206.
[28] Тамсама. С. 204.
[29] Przykazania... Цыт. твор. С. 7.

Месалкі з Скалонам, а яе фотаздымак, дзе яна цалуе гусара, упрыгожваў вітрыны шматлікіх крамаў. Захаплялыным зоркам сцэны грамадства дазваляла больш, а патрыятычнага *savoir-vivre* не захоўвалі, што да іх, так рыгарыстычна. Толькі калі маладыя Барценеў застрэліў Віснеўскую падчас любоўнай сустрэчы ў таемнай кватэрцы, пра акторку пачалі ўголас няўхвальна гаварыць. Яе хаўтуры байкатаваліся, дарма што яшчэ нядаўна яе ўзносіла і абсыпала кветкамі ўся Варшава. Пра тое, што праўду нялёгка было праглынуць, сведчыць легенда, якая прыпісвала Віснеўскай удзел у нацыянальнай змове і гэтым тлумачыла неабходнасць яе кантактаў з рускімі.

Афіцэры ў парадных мундзірах былі нярэдкімі гасцямі ў рэстаранах гатэля «Брыстоль» і Брулёўскага, часта сядзелі ў першых радах тэатраў, асабліва оперы і аперэткі. Нарцыза Жміхоўская паведамляла ў лісце пра нейкага Падаляка:

*Я заспела тут шмат не задаволеных ім асобаў; адно што не ў нездароўі, а ў пэўнай бесхрыбетнасці яго вінавацяць. Калі Казя ў гэтай самай ложы заўважыла мундзір, то ажно захварэла, як прыйшла з тэатра*[30].

Гераіні сцэнічных захапленняў рэдка перажывалі падобныя згрызоты сумлення. Прыманне знакаў увагі належала да рытуалу тэатральнай кар'еры, а расіяне былі гарачымі аматарамі, пераважна балерын. Расійскія прыхільнікі іх аголеных пышнасцяў складалі на сцэне кашы з кветкамі, кідалі да ног зорак букеты. Здараліся таксама і шлюбы. І дарма што іх трактавалі як нацыянальную здраду, яны не былі такою рэдкасцю, як можна меркаваць.

Аднак жа Антоні Халанеўскі паўтарае:

*Прыналежнасць да двух розных светаў, асуджаных на тое, каб пастаянна адштурхоўвацца, загадзя вызначала непазбежнасць польска-расійскага канфлікту, падобна як прадвызначае яго неразвязальнасць*[31].

Летам 1865 г. Норвід[32] пісаў да Канстанцыі Гурскай:

*Бедная Варшава бавіцца сама абы-чым, як нешчаслівае дзіця, якому сапсавалі нервы, адзін раз настройваючы іх на агромны тон вялікага адчаю, другі раз на сапсаваныя радасці і забаўкі*[33].

Пульс польскага жыцця ва ўсходнім уборы быў паскораны, ненатуральна інтэнсіўны, раздзерты паміж скрайнасцямі гучнай забавы і малітвы за Айчыну.

Нечаканая жывучасць палякаў, сіла іх нацыянальнай ідэнтычнасці здзіўляла. Наколькі ўдалося захаваць індывідуальнасць, нягледзячы на такое вялікае

[30] N. Żmichowska. Listy. Kraków, 1906. T. 3. S. 410.

[31] A. Chołoniewski. Istota walki polsko-rosyjskiej. Kraków, 1916. S. 10.

[32] Цыпрыян Каміл Норвід (24.09.1821—23.05.1883) — польскі паэт, празаік, драматург, скульптар, мастак і філосаф. *(Заўв. перакл.)*

[33] C. K. Norwid. Wszystkie pisma. T. 8. Cz. 1. Warszawa, 1937. S. 520—521.

«духоўнае пусканне крыві»? Стэфан Жаромскі апіша «жудасныя сляды хваробы, што высмоктвае з нас сілы». Яе прычынай будзе фактычная бяздзейнасць на фоне патрэбы дзеяння. Яе сімптомам — аслабленне жыццёвай энергіі, страчанай на бяссільны супрацiў.

Ён так гэта тлумачыць:

*немагчымасць удзелу ў працы і кар'ерах вышэйшай і ніжэйшай адміністрацыі, ва ўстановах з шырокім абсягам дзеяння, у навуковых і універсітэцкіх ініцыятывах, уціск і сваволя на кожным кроку, збядненне ў выніку завышаных сельскагаспадарчых падаткаў, разлад усялякіх органаў бяспекі асобы і маёмасці, усеагульны аграрны крызіс, словам, усе нашыя беды і турботы павінны былі адбіцца на грамадскім жыцці, на тэмах размовы, на светапоглядзе і ладзе жыцця моладзі абодвух полаў. Карнавальнае і салоннае жыццё зрабілася марнаваннем часу, а не пацехай. Яму не ставала праўдзівай весялосці, вастрэйшага досціпу, матэрыялу для ажыўленай дыскусіі. Людзі, народжаныя і адукаваныя ў крыху шчаслівейшых умовах, выміраюць, маладыя глядзяць у будучыню без промняў, без надзеі, з горыччу, якая штодня мацнее, бяздзейныя і безнадзейныя*[34].

Заплямленая «пакорай да няволі» тагачасная Варшава адначасова была «лунапаркам «Привислинского края».

Праграма байкоту, што ахплівала грамадскія задачы, у сферы прыватнага жыцця спрабавала змагацца з новай з'явай, з тым найбольш небяспечным тыпам дэнацыяналізацыі, якога на першы погляд не выдаюць ніякія вонкавыя праявы. Можна было б яго назваць русіфікацыяй праз дэмаралізацыю, праз распаўсюджванне п'янства, даносы, хабарніцтва, некампетэнтнасць, антысемітызм. Ніколі дагэтуль палякам, як нацыі, не даводзілася пачынаць барацьбы з гвалтам, маючы за зброю адно вартасці. У гэтым заключаецца выключнасць і нетыповасць грамадскай сітуацыі. Гвалт над цывільным насельніцтвам, ціск чужых звычаяў, дэмаралізацыя змушалі пераглядаць маральныя нормы. Такія каштоўнасці, як паслухмянасць, дысцыплінаванасць, працавітасць, лаяльнасць, рэалізм, разважнасць, сталі чымсьці двухсэнсоўным. Паслухмянасць і лаяльнасць пераходзілі ў калабарацыю, рэалізм і разважнасць межавалі з подласцю, ад якой засцерагаў у сваім гучным артыкуле 1905 г. Станіслаў Віткевіч, працавітасць часта азначала выслужванне перад чужым і ўзмацненне яго пазіцыі.

Падрыў адназначнасці нормаў суіснавання, маральная сумятня, санкцыянаванне сервілізму і нецалерантнасці павінны звесці на нішто сілу і збройны тэрор. Дзеля гэтага такімі важнымі былі ўсе праявы пасіўнага і актыўнага супраціву.

Амаль немагчыма акрэсліць іх маштаб, хоць паўныя цвярджанні цяжка паставіць пад сумнеў. Грамадства было супраць захопніка, яго пастгочвала перакананне немагчымасці супрацьдзеяць злу, яно не магло ўрэшце свабодна выказваць сваіх поглядаў і стаўлення да рэчаіснасці. Сітуацыю дадаткова ўскладняе

[34] A. Zaleski. Цыт. твор. С. 436—437.

ідэалагічная і інтэлектуальная складанасць перыяду 1863—1905 гг. З аднаго боку, у гэты час дамінуе ідэалогія пазітывізму, на першы погляд капітулянцкая і мінімалісцкая, але яна ў выніку прыводзіць да росту радыкальных настрояў. З другога, асабліва пад канец стагоддзя, назіраецца адыход ад пазітывісцкіх ідэалаў. Пачынае дамінаваць радыкальна-інтэлігенцкая ідэалогія.

Калі палітычная публіцыстыка шмат увагі надавала перасцярогам і мабілізацыі нацыі, то, мабыць, напрыканцы стагоддзя ступень абыякавасці польскага грамадства мусіла быць даволі вялікай. Эдвард Абрамоўскі пісаў аб падзеленай свядомасці:

*Гавораць аб варварстве расійскай дзяржавы, аб людскіх крыўдах, якія прычыняе няволя, аднак мы адначасна паводзім сябе так, як быццам гэтая няволя і расійская дзяржава нам патрэбныя і намі шанаваныя. Не прычыняем ёй ніякай шкоды; маўкліва згаджаемся на ўсе яе загады, вучымся ў яе школах, ходзім у яе суды, дапамагаем яе паліцыі, плацім усё, чаго ад нас патрабуюць, ідзём у войска праліваць кроў за яе справу. Паміж нашымі перакананнямі і нашым жыццём няма згоды. Ненавідзім маскоўскую няволю, а жывём добраахвотна як нявольнікі*[35].

Падтрымка духу супрацiву ды нацыянальнай свядомасці, бясспрэчна, спрычынілася да ўваскрашэння незалежнай польскай дзяржавы. Яна была таксама вынікам «змовы» супраць захопніка, да якой заклікаў Абрамоўскі, байкоту яго прававой інфраструктуры і звычаяў. Аднак маладая дзяржава была абцяжарана негатыўнай спадчынай часу няволі. «Расійская сістэма неператапіла польскую душу, — скажа Мар'ян Здзяхоўскі[36], — не змяніла яе існасці, аднак запусціла ў яе заразу распусты»[37].

Гэта найважнейшая адмета той эпохі. Грамадства, падзеленае паміж воляй да падтрымання супраціву і ўсведамленнем нацыянальных мэтаў ды загразаннем у павольную, часта непрыкметную дэгенерацыю і саманяволю.

*

Далей будуць фотаздымкі. Фотаздымкі з неіснуючага альбому расійскіх дэкарацый і рэквізітаў Варшавы XIX — пачатку XX стст. Відарысы панарамныя і падрабязныя, партрэты постацяў і дробязяў, выявы з-за кулісаў і парадных урачыстасцяў.

Чаму ў форме інвентара?

Бо спосаб функцыянавання ў грамадскім успрыманні гэтых чужых, навязаных элементаў быў менавіта такі — вонкавы.

[35] E. Abramowski. Zmowa powszechna przeciw rządowi. Pisma. T. 1. Warszawa, 1924. S. 130.

[36] Мар'ян Здзяхоўскі (нар. 30.04.1861 у Наваселках каля Ракава — памёр 5.10.1938 у Вільні) — польскі гісторык ідэй і літаратуры, філосаф, філолаг, літаратурны крытык і публіцыст; рэктар універсітэта ім. Стэфана Баторыя у Вільні. (*Заўв. перак.*)

[37] M. Zdziechowski. Wpływy rosyjskie na duszę polską. Krakow, 1920. S. V.

Так у канкрэтным архітэктанічным плане, як і псіхалагічным, расійская забудова была рыхлай, няшчыльнай канструкцыяй. І хоць расійскасць уядалася ў тканку горада, на доўгія гады вызначаючы яго форму, і хоць гэтая вонкавасць абумоўлівала кірункі глыбейшых працэсаў, яна заставалася заўсёды толькі сеткай, накінутай на польскасць — на польскі план горада і польскі план душы.

Можна было б скласці гэты інвентар рознымі спосабамі, адны сюжэты дадаць, ад іншых адмовіцца. Я выбрала тое, што падаецца найбольш адметным.

## Апухцін

*Партрэт Апухціна № 1*

Нізкі, прысадзісты, з пухлым чырвоным тварам, кароткімі стрыжанымі валасамі і сівымі вусамі, з настолькі дабрадушным і сумленным выразам твару, што ажно гатовы расчараваць найбольш адданага паслядоўніка фізіянамічнай тэорыі.

*Партрэт Апухціна № 2*

Была гэта, напышлівая сваім саноўным становішчам і ўсведамленнем уласнай гістарычнай місіі, дробная постаць у фраку з шырокай стужкай ордэна праз плячо, з зоркай на грудзях, з паморшчаным тварам, акружаным сівой барадой, з халодным праніклівым позіркам.

*Мастак русіфікацыі ці самы звычайны фельчар?*

Русіфікатар — з ног да галавы, таксама як Лір быў каралём з галавы да пят. Толькі русіфікатарам ён быў самым пасрэдным, вельмі прымітыўным, не толькі без здольнасцей, але і без спрыту. Ён робіць на мяне ўражанне не тонкага і дасведчанага дзеяча, але фельчара з малога мястэчка, які рэжа, кроіць, не пытаючыся, дзе і як, абы толькі як найбольш крыві было і як найдаражэй узяць за бінты. Ён люта ненавідзіць нас, ён быў бы рады ўсіх нас утапіць і згнаіць у матчыным улонні, але за што, якая прычына яго нянавісці, дзе яе крыніца?

*Гутаркі Апухціна*

Падуладных прымаў паасобку, кожнага частаваў гарбатай, у супольнай гутарцы ўсе разам абмяркоўвалі спосабы пераследу моладзі. Да сваіх ён ставіўся вельмі паблажліва, але быў суровы з тымі, хто асмельваўся гаварыць па-польску. А таксама з тымі, хто ажаніўся з полькамі. Шлюб полькі з маскалём-настаўнікам быў вельмі рэдкім выключэннем. Шлюб рускага з полькай мог адмоўна паўплываць на яго кар'еру, як і траплянне ў спіс т. зв. «спіс спальшчэлых», які вёў Апухцін. А гэта магло напаткаць настаўніка кожны раз, калі ён меў смеласць абараняць вучня.

*Слабасць Апухціна*

Тэкля. Яна моцна ўплывала на яго. Пры дапамозе звонкай манеты з ёй

можна было паспяхова ўлагодзіць шмат справаў. Амаль усё. За выключэннем атрымання пасады настаўніка палякам пасля 1884 г.

*Вуха Апухціна*

У 1883 г. студэнт Жуковіч, рускі, даў поўху Апухціну. Ва універсітэце разагналі мітынг салідарных з гэтым жэстам. Шмат студэнтаў выключылі з навучальнай установы. А Апухцін атрымаў ордэн. Крыху пазней у цырку, калі адзін клоун даваў поўху другому, трэці падбягаў і прышпіляў ордэн пацярпеламу.

У рэстаране госці, замаўляючы зразы, замест «бітых» прасілі падаць «апухцінскія».

*Мара Апухціна*

Каб польскія маткі спявалі перад сном сваім дзецям рускія калыханкі.

*Медаль Апухціна*

У 1897 г. за межамі Каралеўства быў выбіты бронзавы медаль з выявай бюста куратара Варшаўскай навучальнай акругі Аляксандра Львовіча. З другога боку змяшчаўся надпіс:

*Вечная анафема его имени, вечный позор его постыдной деятельности в Царстве Польском (1879—1897).*

Медаль быў высланы ва ўсе еўрапейскія музеі.



Медаль «у гонар» Апухціна з надпісам «Вечны праклён яго прозвішчу, вечная ганьба яго агіднай дзейнасці ў Польскім Каралеўстве (1879—1897).

*Пахаванне Апухціна*

Сярод вянкоў на труне з'явіўся адзін, на стужцы якога было напісана: «Ад удзячных студэнтаў». Студэнты запатрабавалі, каб вянок быў неадкладна выдалены. Натоўп, сабраны ў двары універсітэта, быў заатакаваны выклікаными атрадамі казакоў. Шмат каго арыштавалі і пасадзілі ў Цытадэль. У гэты дзень заняткі ва універсітэце адмянілі.

## Арол

«Оставить эту птицу!» — так нібыта напісаў Мікалай I, калі Паскевіч запытаў яго аб лёсе польскіх арлоў у Варшаўскім замку. Яны захаваліся на харугве па-над вежай і перад уваходнай брамай першага дзядзінца (у асабістым каралеўскім гербе — разам з Цяльцом і Пагоняй), а таксама ў пары залаў на першым паверсе.

Немагчыма было выдзерці арлоў, не знішчыўшы надзвычай прыгожых алебастраў, аздобленых пад мармур, таму белых арлоў у залатых каронах у балёвай зале закрывалі кандэлябрамі.

Пасля паўстання 1863—1864 гг. рэгламент пачаў вымагаць, каб уваход у Замак сцераглі двухгаловыя чорныя расійскія арлы.

*

Верх ялінкі ў доме Віктара Гамуліцкага замест партрэта цара быў аздоблены белым арлом, вырабленым з дрэва адным з сыноў паэта. Гэта была не адзіная праява асабістага патрыятызму.

## Артельщик

Расійскія насільшчыкі, барадачы ў белых фартухах, побач з польскімі насільшчыкамі (вусачы ў блакітных блузах з нумарамі на плячы) абслугоўвалі пасажыраў на Пецярбургскім вакзале, а пазней і на Тэрэспальскім.

Палякі, нават станцыйныя вартаўнікі і стрэлачнікі, гублялі працу з-за расійцаў. Адусюль выдалялася польская мова. Усе надпісы на будынках чыгуначных станцый, у пачакальнях, рэстаранах, вагонах павінны быць напісаныя на мове, незразумелай для большасці. І расклад руху друкаваўся толькі па-расійску. Рабілася гэта дзеля таго, каб іншаземец, «праязджаючы праз нашу краіну», не змог усумніцца, што гэта «истинно-русский край».

У 1891 г. быў распрацаваны і зацверджаны праект (праўда, з прычыны змены царуючай асобы рэалізаваны толькі часткова) аб звальненні ўвогуле палякаў з службы на чыгунцы за выняткам ніжэйшых пасад (да 20 %) і сярэдніх (да 5 %). Удалося звольніць на працягу двух год у Прывіслінскай, Тэрэспальскай і Дамброўскай чыгунках каля 700 палякаў і прызначыць на іх месцы расейцаў з унутраных губерняў. На чыгунцы існавалі загады, якія забаранялі службоўцам «разумець па-польску», г. зн. прымушалі не адказваць на пытанні, якія задавалі пасажыры на гэтай мове.

## Афіцэры

Талстой адрозніваў тры катэгорыі афіцэраў: наёмнікі, рабаўнікі і амаральныя дурні.

*Ніякай пашаны для мундзіра. У найгоршую дзюру залезе тутэйшы афіцэр (у асноўным страявыя і пяхоты) і будзе біцца ў першым-лепшым агародзе з чэляддзю. Няма такога дня, каб не было нейкай бойкі, а калі нават у варшаўскіх дзяржаўных тэатрах паводзяць сябе больш прыстойна, то толькі дзякуючы пільнасці паліцыі. Мундзір гэты цёгаюць па самых пададзроных месцах, а кожнае свята ў палку павінна скончыцца агіднай оргіяй сярод вулічных прастытутак і бруду сцёкавых ямін,*

— паведамляе сяброўцы Баранеса XYZ.

Да 1855 г. афіцэрскі чын у расійскай арміі быў даступны толькі дваранству, што было атрымана ці то ў спадчыну, ці то асабіста. Пазней афіцэрам мог быць кожны расійскі падданы, нават з вельмі сціплай адукацыяй, які праслужыў не менш за чатыры гады ў ніжэйшым чыне і здаў экзамен у абсягу курсаў юнкерскай школы (то бок рэлігія, расійская мова, арыфметыка, алгебра, геаметрыя, троху геаграфіі і гісторыі, чытанне і рысаванне мап). Вялізная розніца назіралася паміж афіцэрскім корпусам страявой пяхоты і гвардыі, кавалерыі, артылерыі. У конніцы служылі пераважна нашчадкі старадваранскіх родаў і сыны вельмі багатых купцоў, у артылерыі і інжынерыі — сыны мяшчан, дробнага родавага дваранства, чыноўнікаў, якія скончылі прафесійныя школы. Афіцэры гэтых родаў войск бывалі не толькі адукаванымі, але таксама вылучаліся «гуманітарнасцю». Афіцэры пяхоты былі з ніжэйшых саслоўяў чыноўнікаў, вайскоўцаў, мяшчан. Яны былі найменш «выраблены», таму «дзікія жарсці тут найбольш сябе выяўлялі...»

Афіцэр, які напіўся і ў гэтым стане дазволіў сабе нейкі абразлівы ўчынак, афіцэр, які ўчыніў нейкі гвалт, які быў зняважаны аплявухай, якога з дадзенай кампаніі, рэстарана, тэатра з ганьбай адлупілі і выкінулі, спакойна і надалей застаецца ў войску, носіць афіцэрскі мундзір, за гонар якога ён не змог паклапаціцца, таварышы гутараць з ім, як быццам нічога не здарылася. У найгоршым выпадку яго перавядуць у іншы полк.

У гэтым асяроддзі найбольш цанілася ўпэўненасць у сабе, схільнасць да рызыкоўных авантураў, усе праявы задзёру, бравуры, часта на мяжы злачынства. Па п'яні стралялі ў мішэнь (слынная «зязюля» — гульня з зброяй з завязанымі вачыма) або займаліся эквілібрыстыкай на падваконнях найвышэйшых вокнаў, ішлі ў самыя дзіўныя заклады, выклікалі на дуэль праз абы-якое глупства.

Жыццё ў губернскай сталіцы шмат хто называў манатонным. Раніцай муштра, прафесійныя абавязкі ў казармах і пры батарэі. Абед, адпачынак. Потым яны рушылі ў горад, у кандытарскую, на шпацыр. Раз на некалькі дзён у кагосьці з старшых ладзілася *«попойка»* (або вялікае жлуктанне гарэлкі ў разнастайных

формах), спевы, танцы, забавы — таксама непрыстойныя з прадстаўніцамі супрацьлеглага полу. Часам нейкая адметная па колькасці алкаголю эскапада ў рэстаране, забава з шампанскім і аркестрам, біццё сервізаў і бутэлек. Гэтую асаблівую манію расійскіх афіцэраў ведалі гаспадары варшаўскіх рэстаранаў, таму трымалі фаянсавы посуд і пустыя бутэлькі, прызначаныя на разбіццё. Міжсобку ацэньвалі кожнае наведванне колькасцю бітых талерак. Часам афіцыйны візіт, імяніны, дзень прыёму ў кагосьці з значных людзей горада. Ночы займала шырокая прастора — ад тэатра да бардэля.

Прус апісвае цырульніка, для якога прадметам захаплення быў адзін гусарскі афіцэр.

*У аднаго, пане, я сустрэў аж чатыры маладыя дамы, і ўсе — з усмешкай на твары... З таго часу, даю слова, заўсёды кланяюся яму на вуліцы, хоць ён больш не ходзіць да мяне і вінен мне пяць рублёў. Але, пане, калі за крэсла на канцэрце Рубінштэйна я мог даць шэсць рублёў, то я б хіба і не шкадаваў пяці рублёў для такога віртуоза.*

## Балерыны

*Існуе вялікая розніца паміж тэатральным асяроддзем, дзе могуць панаваць самыя свабодныя норавы, і кабетамі, якія прафесійна займаюцца распустай,*

— пісаў гісторык варшаўскай прастытуцыі. І дадаваў, каб апраўдаць тых, хто карыстаўся найбольш сумнеўнай славай:

*Збольшага балерыны не былі ані горшыя, ані лепшыя маральна ад усёй жаночай сферы тэатральнага свету. Былі толькі прыгажэйшыя і вабнейшыя, тэатральны строй падкрэсліваў спакуслівыя формы, робячы іх аб'ектамі мацнейшых мужчынскіх заляцанняў.*

Яны былі занадта прыкметныя ў глядзельнай залі і за кулісамі Вялікага тэатру і аперэты. Кошыкі кветак і букеты, кінутыя да ног з балконных ложаў, каштоўнасці. Багацці расійскіх афіцэраў коннай гвардыі ў Варшаве знікалі ад сутыкнення з балетам, а нямала балерын, прыняўшы на шлюбным дыване ў царкве тытул і прозвішча расійскага саноўнага мужа, урачыста прымаліся ў расійскіх кампаніях. Хронікі згадваюць генераліху Чаркасаву і графіню Фрыдрыхсову, якія непасрэдна са сцэны трапілі разам з сваімі мужыкамі ў замкавыя салоны.

Варшаўскія балерыны займалі вядучае месца «сярод куртызанак, і былі самым культурным элементам жаночага свету, які не лічыўся з сваімі цнотамі».

Драматычныя артысткі, падкрэслівалася ў жарце (bon-mot) той эпохі, вельмі рэдка давалі хабар гатоўкай.

Балерыны атрымлівалі месячны заробак, роўны цане аднаго білета ў ложу, — менш за швачак. Гэтага было недастаткова нават на дзесятак батыставых

насовак. Цяжкая сітуацыя ў балетным калектыве была галоўным чыннікам пераўтварэння балета «ў пастаянны рэзерват утрыманак». Адпаведнае выкарыстанне сваіх пышных формаў абумоўлівала пазіцыю ў іерархіі тэатральнага свету. Згрызоты сумлення — як маральныя, так і нацыянальныя, — хутка развейваліся перад абліччам голаду.

Жалюгодная мікалаеўская традыцыя загадвала дзяржаўным тэатрам у абедзвюх расійскіх сталіцах і ў Варшаве ўтрымліваць балет разам з балетнымі школамі дзеля прастытуцыі для прыдворнай і вайсковых сфер, а таксама для найвышэйшай арыстакратыі. Зрэшты, і ўва Францыі ад пачатку XIX ст. опера была своеасаблівым «стойлам жарэбчыкаў» для сяброў «Jockey Club».

Кожны новы дырэктар Дзяржаўных варшаўскіх тэатраў шукаў сябе сяброў у тэатры, найчасцей скіроўваючы свае пачуцці ў каралеўства тарлатанных спаднічак. Яны часта і ахвотна змянялі аб'екты захаплення, а здаралася, што і выкарыстоўвалі сваю дырэктарскую ўладу, высылаючы ў войска канкурэнтаў сваіх пасій. Толькі адзін Карандзееў ажаніўся з балерынай. Матыльда Кшасінска, польская танцорка, была фаварыткай цара Мікалая II.

## Бардэлі

Рэгламент, што санкцыянаваў працу публічных дамоў, існаваў з 1845 г. Бардэлі развіваліся з дабраславення ўлады і пад крылом паліцыі.

Колькасць прастытутак павялічвалася ў другой палове XIX ст. не ў меншай прапорцыі, чым колькасць насельніцтва. У шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады XIX ст. на 1000 жыхароў Варшавы прыпадала 50 жанчын лёгкіх паводзін. Перапіс 1898 г. зарэгістраваў прыкладна 16 тысяч прафесіяналак. Рост значны. Больш як 10 % незамужніх жанчын у той час уступала ў нелегальныя палавыя зносіны з мужчынамі. Колькасць дамоў сустрэчаў заўсёды перавышала колькасць публічных дамоў. 1884 г. рэкордны ў гэтых адносінах (16 публічных дамоў і 169 дамоў сустрэч). Усе гэтыя дадзеныя маглі адно заніжацца.

Алкаголь, як заўсёды, быў важным элементам як гандлю, так і забаваў.

Прастытуткам нельга было адмаўляцца выпіць з гасцямі. Найбольш гарэлкі лілося ў найтаннейшых жаўнерскіх дамах распусты. Старое Места, Мар'енштат, Павісле, Чарны Двор за Павонзкамі, Млынарская — там у святочныя дні, дні парадаў і лазенныя дні жаўнераў за 30 капеек можна было гуляць дасхочу. На адну жанчыну прыпадала прыкладна 30 жаўнераў. Тыповы казармавы дэкор, перагародкі з дошак (як у стайнях), алкаголь і закуска ў выглядзе агурка ці гарбаты. У сярэдзіне калідор для тых, хто чакаў сваёй чаргі. Плацілі пры ўваходзе, каля дзвярэй стаяла гаспадыня.

Летам жаўнеры часта карысталіся з паслугаў прыгарадных «ваўчыц» — самотных прастытутак, якія цягаліся на ўскраінах горада. «Маладыя сосенкі служаць цяпер схові́шчам распуснікам вялікага горада: жаўнерам і іх каханкам, — натуе Жаромскі. — Жахлівая іронія жыцця», — дадае, падымаючы з

зямлі разбітую бутэльку ад гарэлкі з этыкеткай, пісанай па-руску ў ваколіцах Грахоўскай Альшынкі...

Афіцэры карысталіся лепшымі апартаментамі. Нароўні з багатымі капіталістамі яны складалі кліентэлу раскошных публічных дамоў на Таваровай. Обер-паліцмайстар Мікалай Клейгельс, эстэт прастытуцыі, як яго называлі, вельмі ганарыўся васьмю пансіянатамі еўрапейскага ўзроўню. У дамах нумар 60 у Слімаковай і 58 у цёткі Роўзэн інтэр'эр нумароў быў зроблены з асаблівым шыкам. Мураваныя сходы, на сценах карціны а ля Вато, Фраганар ці амуры, люстры, канапы, эстрада з фартэпіянам, дзе гралі сляпыя, найменш падатлівыя на цялесныя спакусы. Кожная з пансіянатак была адзетая іначай — цыганкай, іспанкай, італьянкай, балерынай. Шклянка гарбаты каштавала там рубель. За цану трох можна было наведаць два іншыя дамы насупраць.

*Атмасфера дамоў распусты спрыяла бойкам, якія нярэдка канчаліся смерцю. Паліцыя старалася любым коштам гэта хаваць. Здараліся выпадкі, калі запальчывы кліент забіваў дзяўчыну. У публічным доме на Падвалі расійскі афіцэр быў забіты прастытуткай, якую без дай прычыны ўдарыў. Дзяўчына размажджэрыла яму чэрап начным гаршком.*

*Цэннік бардэляў — ад 30 капеек да 10 рублёў. Пяцьдзесят каштавала куртызанка з «краю Патоцкіх Гучаў»*[38].

Утрыманцы плацілі 3000 рублёў штогод.

## Бібула

Гэта дзеялася ў шляхецкім двары ў Літве, нейкія дзесяць гадоў пасля паўстання. Памяць пра панаванне Мураўёва-вешальніка была настолькі свежая і моцная, што людзі трымцелі пры відзе чыноўніцкага мундзіра. Думка пра магчымасць якога-колечы сутыкнення з прадстаўнікамі маскоўскай улады напаўняла жахам.

*Акурат у той час мая матка, — успамінае Юзаф Пілсудскі, — выцягвала калі-нікалі з нейкай схованкі, толькі ёй вядомай, некалькі кніжак, якія чытала, вучачы нас, дзяцей, пэўным урыўкам на памяць. Гэта былі творы нашых паэтаў. Таямніца, якой былі ахоплены тыя моманты, узрушэнне маткі, якое перадавалася малым слухачам, змены экарацыі, якія надыходзілі ў хвіліну, калі непажаданы сведка выпадкова трапляў на нашыя сямейныя канспірацыі, — усё гэта пакінула незабыўнае ўражанне ў маім розуме.*

[38] Тут адсылка да прозвішча Аўгуста Патоцкага (1847–1905) — піянера конных скачак у Варшаве. Аўгуст Патоцкі таксама праславіўся як варшаўскі гуляка і аматар дам лёгкіх паводзін (папулярны граф Гуча (Gucio)). (*Заўв. рэд.*)

Такое было першае сутыкненне будучага маршала з бібулай, пра якую праз нейкі час напіша:

*Бібулай на рэвалюцыйным жаргоне называюць кожны нелегальны друк, які не быў адзначаны сакраментальнай формулай:* дозволено цензурою. *Колькасць такой бібулы з кожным годам узрастае, усё больш пранікаючы ў людскія масы і ахопліваючы ўсе большыя колы. Гэта прызнаў нават урад. Князь Імерэтынскі ў сваім значным мемарандуме зазначае, што нелегальная кніжка пранікла нават пад сялянскія стрэхі і падахвочвае антыўрадавыя настроі з боку сялян. Аднак не трэба думаць, што бібула ў падрасійскай Польшчы заўсёды мела рэвалюцыйны змест. Расійскі ўрад настолькі абмяжоўвае грамадскае жыццё ў разнастайных абсягах, што бадай няма ніводнай партыі, якая б не выдавала сваіх публікацый нелегальна, без цэнзуры. Нават згоднікі, галоўныя праціўнікі нелегальнай работы, выдалі некалькі кніжак за мяжой, каб пасля, не горай ад рэвалюцыянераў, кантрабандай перавезці іх праз мяжу і распаўсюдзіць у грамадстве. Такім чынам, ёсць бібула клерыкальная, патрыятычная, сацыялістычная і нават згодніцкая. Сярод яе знаходзіцца мастацкая літаратура вялікай вартасці: творы Выспянскага ці Зыха; ёсць патрыятычна-клерыкальныя опусы, вялізныя тамы гістарычных даследаванняў і дробныя брашуркі розных палітычных партый, ёсць і звычайныя кніжкі для набажэнстваў, перыядычныя выданні, адозвы, абразкі, фатаграфіі, паштоўкі і іншыя рэчы. Усё гэта закідаецца праз мяжу рознымі шляхамі, разыходзіцца ўсюды, дзе людзі ўмеюць чытаць па-польску, і становіцца ўсё болей запатрабаваным усё ўзрастаючай масай людзей.*

Цяжка дакладна вызначыць колькасць бібулы, якая абарачалася ў краіне. ППС у справаздачы Цэнтральнаму камітэту партыі за 1899 г. падае лічбу 99 872 экземпляры самых розных публікацый, запушчаных таго году ў абарот. Гэтую лічбу трэба прынамсі патроіць, улічваючы непэпээсаўскую і непартыйную бібулу, і тады атрымаем прыкладна 250—300 тысяч экземпляраў нелегальных друкаў — гадавое спажыванне чытацкай польскай публікі на тэрыторыі падрасійскай Польшчы. Характэрнай з'яўляецца змена стаўлення да гэткага роду літаратуры па меры іх распаўсюджвання. Раней трэба было людзей «прасіць», каб узялі «такую кніжку ў рукі», а з часам «самі бібулу шукаюць, носяцца за ёй, купляюць». Дзякуючы сваёй даступнасці яна перастае быць святыняй, не палохае, не выклікае думкі аб перасьледаваннях, хутчэй падрывае аўтарытэт урада і веру ў яго магутнасць. Ужо сама назва (прамое значэнне слова на польскай мове — «прамакатка». — *Рэд.*) жартоўна сведчыць аб асваенні пагрозы — прынамсі, таямніцы нелегальнасці.

У коле, якое вяло змаганне з царызмам на памежных тэрыторыях, вельмі папулярнай была перароблена песня філарэтаў:

*Калі цягавітасць — вядомая цнота,*
*Хто цягавіцішы за Яна?*

Такое было першае сутыкненне будучага маршала з бібулай, пра якую праз нейкі час напіша:

*Бібулай на рэвалюцыйным жаргоне называюць кожны нелегальны друк, які не быў адзначаны сакраментальнай формулай:* дозволено цензурою. *Колькасць такой бібулы з кожным годам узрастае, усё больш пранікаючы ў людскія масы і ахопліваючы ўсе большыя колы. Гэта прызнаў нават урад. Князь Імерэтынскі ў сваім значным мемарандуме зазначае, што нелегальная кніжка пранікла нават пад сялянскія стрэхі і падахвочвае антыўрадавыя настроі з боку сялян. Аднак не трэба думаць, што бібула ў падрасійскай Польшчы заўсёды мела рэвалюцыйны змест. Расійскі ўрад настолькі абмяжоўвае грамадскае жыццё ў разнастайных абсягах, што бадай няма ніводнай партыі, якая б не выдавала сваіх публікацый нелегальна, без цэнзуры. Нават згоднікі, галоўныя праціўнікі нелегальнай работы, выдалі некалькі кніжак за мяжой, каб пасля, не горай ад рэвалюцыянераў, кантрабандай перавезці іх праз мяжу і распаўсюдзіць у грамадстве. Такім чынам, ёсць бібула клерыкальная, патрыятычная, сацыялістычная і нават згодніцкая. Сярод яе знаходзіцца мастацкая літаратура вялікай вартасці: творы Выспянскага ці Зыха; ёсць патрыятычна-клерыкальныя опусы, вялізныя тамы гістарычных даследаванняў і дробныя брашуркі розных палітычных партый, ёсць і звычайныя кніжкі для набажэнстваў, перыядычныя выданні, адозвы, абразкі, фатаграфіі, паштоўкі і іншыя рэчы. Усё гэта закідаецца праз мяжу рознымі шляхамі, разыходзіцца ўсюды, дзе людзі ўмеюць чытаць па-польску, і становіцца ўсё болей запатрабаваным усё ўзрастаючай масай людзей.*

Цяжка дакладна вызначыць колькасць бібулы, якая абарачалася ў краіне. ППС у справаздачы Цэнтральнаму камітэту партыі за 1899 г. падае лічбу 99 872 экземпляры самых розных публікацый, запушчаных таго году ў абарот. Гэтую лічбу трэба прынамсі патроіць, улічваючы непэпээсаўскую і непартыйную бібулу, і тады атрымаем прыкладна 250—300 тысяч экземпляраў нелегальных друкаў — гадавое спажыванне чытацкай польскай публікі на тэрыторыі падрасійскай Польшчы. Характэрнай з'яўляецца змена стаўлення да гэткага роду літаратуры па меры іх распаўсюджвання. Раней трэба было людзей «прасіць», каб узялі «такую кніжку ў рукі», а з часам «самі бібулу шукаюць, носяцца за ёй, купляюць». Дзякуючы сваёй даступнасці яна перастае быць святыняй, не палохае, не выклікае думкі аб праследаваннях, хутчэй падрывае аўтарытэт урада і веру ў яго магутнасць. Ужо сама назва (прамое значэнне слова на польскай мове — «прамакатка». — *Рэд.*) жартоўна сведчыць аб асваенні пагрозы — прынамсі, таямніцы нелегальнасці.

У коле, якое вяло змаганне з царызмам на памежных тэрыторыях, вельмі папулярнай была перарobленая песня філарэтаў:

*Калі цягавітасць — вядомая цнота,*
*Хто цягавітшы за Яна?*

*Таму, панове, яго здароўе:*
*Віват, дужы Ян!*

Натуральна, апраўдваецца Пілсудскі, што ператварэнне таварышаў і таварышак у чамаданы ці кошыкі не можа быць пастаяннай з'явай. Часам, аднак, гэта бывае неабходным.

*

*Забароненыя кнігі* — нататка з «Kurjera Warszawskiego» ад 28 верасня 1884 г.:

*У апошнім «Dzienniku Warszawskim» знаходзіцца алфавітны пералік прозвішчаў аўтараў, творы якіх, на думку найвышэйшага ўказу ад 5 (17) студзеня 1884 г., не павінны быць дапушчаны да публічнага карыстання ў публічных бібліятэках і чытальнях, а таксама ў бібліятэках, якія належаць клубам, таварыствам і г. д. Гэтыя прозвішчы ў парадку расійскага алфавіту наступныя: Агасіс, Альмінскі, Арну, Баджгот, Базэн, Баллін, Благавешчанскі, Бібікаў, Бэхер, Бюхнер, Вермарэль, «Вятская незабудка» (часопіс), Дабралюбаў, Дзянісьеў, Дэбэ, дэ Рабэрці (расійскі пісьменнік), Жасан, Жукоўскі (Я. Г.), Заля («Assomoir» («Пастка») і «Nana» («Нана»), Зарадымскі, Златаўрацкі, Іскандэр (Герцэн), Казакоўскі, Калін, Кетле, Клярус, Лайель, Ласаль, Лебок, Лекі, Летнеў, Луі Бланк, Люіс, Лютастанскі, Лявітаў, Ляскоў, Л-в, Малешот, Мардоўцаў («Палітычныя рухі расійскага народу»), Маркс, Межаеўскі, Міль, Міртаў, Міхайлаў, Міхалкоўскі, Мішле, М. («Гістарычныя лісты»), Нефёдаў (Ф.), Памялоўскі, Партугалаў («Знаменательные движения в еврействе»), Пісараў, Прайфер, Прудон, Прыжоў, Прыклонскі («Роздум аб сацыяльнай навуцы будучыні»), Рашфор, Рашэтнікаў, Рэклю, Сечанаў, Сляпцоў, Сміт (Адам), Спэнсэр, Суворын, Судрэ, Уотсан, Фляроўскі, Карл Фогт, Хакслі, Цымерман («Свет напярэдадні стварэння чалавека»), Цэбрыкавава, Чарнышэўскі («Прычыны заняпаду Рыма»), Шалгуноў, Швайцэр, Шчапаў і Шэер.*

*На падставе найвышэйшага ўказу ад 5 (17) ліпеня 1884 г. забараняецца выдаваць у чытальнях і дзяржаўных бібліятэках творы розных расійскіх і замежных аўтараў у колькасці 125 адзінак, а таксама наступную перыёдыку: «Современник», «Русское слово», «Знание», «Слово», «Русская мысль», «Отечественные записки», «Дело», «Устой». Загадчыкі бібіліятэкаў пісьмова зацвердзілі абавязак выняць гэтыя выданні і кнігі з публічнага ўжытку.*

## Бюракратыя

Залескі пісаў:

*Расійская бюракратыя і кліентэла, што круціць з ёй справы, сапсавана да мозгу касцей, настолькі прасякнута самадурствам і сваволяй, нагэтулькі прызвычаена да гвалту і брутальнасці ў сваіх дзеяннях, што ўсё ў яе руках*

*ідзе на глум і дае вынікі, адваротныя спадзяваным. Да такога стану рэчаў з розумамі і характарамі спрычынілася ўся мінуўшчына і дэспатычная нівеляцыя. Апошнім часам з'явілася яшчэ шалёная спакуса брутальнай уніфікацыі і знішчэння любой прыроджанай рознасці. Ці магчыма, каб пры такіх умовах, дзе ўсё: права, справядлівасць, абачлівасць, сумленнасць і годнасць, кладуцца на алтар гэтага фетыша, для гэтага палітычнага замаху і грубых страсцей, маглі ўзнікаць і рыхтавацца разумныя, трывалыя і стваральныя законы, каб урадн́ікі, звыклыя да гвалту і самадурства ў забраных ускраінах, сталіся ва ўласнай айчыне органамі ладу, права, сумленнасці, парадку і грамадскай гармоніі?*

У «Gońcu Porannym» ад 9 снежня 1904 г. Баляслаў Прус дадаў:

*Бюракратыя дзейнічала ў нашай краіне так, быццам яе мэтай было прышчапіць польскай душы нянавісць і пагарду да ўлады.*

*Успомнім Палац Сташыца, зрэфармаваны Апухціным: ці гэта не кпін з расійскага архітэктурнага стылю? Згадаем Гатычны дамок у Пулавах, на знявечанне якога «міністр асветы» нябожчык граф Талстой выдзяліў 2000 руб.: ці не быў гэта экзамен вандалізму?... Успомнім пераапрананне нашых паштальёнаў у вялікарускія каптаны: ці не магло гэта выклікаць агіду да капялюшыкаў і* ермакоў*?*

*Што зрабіла бюракратыя з шаноўнай рускай мовай? Кайданы і нагайку для вучняў школ, для адвакатаў і іх кліентаў, для сялян у валасцях, для ксяндзоў, зрэшты, для ўсіх грамадзян краіны пры кожным сутыкненні з урадавым апаратам.*

*А што яна зрабіла з праваслаўнай рэлігіі, гэтай святыні ста мільёнаў людзей? Зноў-такі прыладу катавання уніятаў, зачэпку для пераследаў, ссылак, шпіёнства і данасіцельства, незацверджаных афіцыйна шлюбаў, пазашлюбных дзяцей, а нарэшце невычэрпную крыніцу даходаў і хабараў!*

*Ці такія дзеянні не падрывалі годнасць мовы?*

*Ці не паніжалі павагі да рэлігіі, якую вызнае Расія?*

## Вайсковае становішча

### Аб'ява аб увядзенні вайсковага становішча

Найвышэйшым загадам яго царскай Вялікасці ў Каралеўстве Польскім абвяшчаецца вайсковае становішча.

Згодна з ім усе жыхары Каралеўства за ніжэй пералічаныя злачынствы і правіны падпадаюць пад вайсковую працэдуру і безадкладны суд, на падставе §§ 739 і 753 II тома Вайскова-крымінальнага кодэкса.

Паліцыя ў вёсках і гарадах падпадае пад уладу ваенных начальнікаў, а чыноўнікі гэтых уладаў за невыкананне або адмову ад сваіх абавязкаў падлягаюць адказнасці нароўні з вайскоўцамі.

Усе без выключэнняў абвінавачаныя: у здрадзе, падбухторванні або яўным ненадпарадкаванні вайсковым і паліцыйным уладам, у захоўванні зброі, прамаўленні падбухторвальных публічных выступаў, выданні і распаўсюджанні падбухторвальных лістовак або іншага тыпу публікацый, у падахвочванні іншых да падобных злачынстваў, нават калі тыя не прывялі да хваляванняў; таксама абвінавачаныя ў якім-кольвечы гвалце, у забойстве, грабяжы, разбоі, падпале — падлягаюць вайсковай працэдуры і суду паводле палявых законаў Вайскова-крымінальнага кодэкса.

*Заўвага*. Калі вайсковае камандаванне пастановіць, што ўчыненыя праступкі і злачынствы не маюць палітычнага характару, справы будуць перададзены звычайным судам для прыняцця рашэння.

### З увядзеннем вайсковага становішча забараняюцца:

а) усякага роду зборышчы і сходы на вуліцах і плошчах, нават з невялікай колькасцю чалавек. У выпадку непадпарадкавання на загад паліцыі для разгону будзе выкарыстана ўзброеная сіла, вінаватыя будуць арыштаваныя і прыцягнутыя да адказнасці;

б) усякага роду палітычныя маніфестацыі і дэманстрацыі, а таксама шэсці і працэсіі, на якія не быў атрыманы асобны пісьмовы дазвол адпаведнай вайсковай улады; касцельныя набажэнствы за памерлых палітычных злачынцаў, за забітых падчас хваляванняў, або таксама ў памяць пэўных гістарычных падзей; выкарыстанне правакацыйных або забароненых эмблем павялічвае адказнасць;

в) пяянне ў касцёлах і па-за імі правакацыйных песен, гімнаў, або іншых малітваў, не зацверджаных касцёлам; арганізацыі латарэй, збор грошай або іншага ў касцёлах або публічных месцах без асобнага пісьмовага дазволу адпаведнай вайсковай улады; пашырэнне і продаж абвестак, адозваў, брашур і газет, а таксама расклейванне плакатаў, недазволеных адпаведнымі ўладамі.

### Наступствы вайсковага становішча:

1. Войска і паліцыя маюць права выкарыстаць зброю ў выпадку, калі іхным распараджэнням будзе аказаны супраціў.

2. Военачальнікі маюць права ўжываць усе паліцыйныя сродкі, якія палічаць патрэбнымі для ўтрымання або аднаўлення парадку і спакою. Военачальнік абавязаны забяспечваць абсалютнае падпарадкаванне загадам улады і не дапушчаць шкодных правакацый і ўсялякіх адзнакаў непавагі да ўрада, улады або войска. Ён мае права забараніць любыя сходы — не толькі публічныя, але і прыватныя, калі толькі палічыць іх шкоднымі. Ён мае права ў

любы момант правесціператрус дому і паддаць асабістай праверцы яго жыхароў. Усіх беспрацоўных або падазроных без працы, якія вызначаюцца ці то буйным характарам, ці то ўдзельнічалі ў папярэдніх хваляваннях, можа арыштаваць і запатрабаваць рашэння намесніка [цара ў Каралеўстве Польскім] што да іх.

3. Шынкі, кавярні, бакалейныя крамы і іншыя гэтага тыпу ўстановы павінны зачыняцца ў час, вызначаны вайсковай уладай. У выпадку адпаведнага рашэння яны могуць быць зачынены зусім.

4. Іншаземцы, якія не маюць дакументаў аб рэгістрацыі, або не маюць сталага занятку, ці, больш за тое, за якімі заўважана дзейнасць, спрэчная з выдадзенымі прадпісаннямі, будуць неадкладна выдалены за межы дзяржавы.

З прычыны немагчымасці вызначэння ўсіх наступстваў, якія пацягне за сабой абвяшчэнне вайсковага стану, папярэджваем насельніцтва, што любыя забурэнні неадкладна выклічуць надзвычайныя і энергічныя захады.

Дадзена ў Варшаве 2 (24) кастрычніка 1861 г.

Галоўнакамандуючы першай арміяй і выканаўца абавязкаў намесніка Каралеўства Польскага, генерал-ад'ютант

гр. Ламберт К.

## Вайсковая служба

У 1901 г. адкупіцца ад «вайсковай павіннасці для Расіі» каштавала 250 рублёў, з чаго большую частку атрымліваў доктар, рэшту іншыя сябры камісіі, з камісарам уключна. Кульмінацыйную сцэну апісвае навочны сведка Міхал Сакальніцкі:

*Прызыўная камісія засядала, не ведаю, з якіх ужо вайскова-арганізацыйных прычын, у даволі далёкім Гастыніне. Яшчэ сёння памятаю тую брудную залу з тыповым выглядам расійска-польскай канторы; запоўніў яе сялянскі натоўп, дзе паміж зацікаўленымі сноўдалі і цікаўныя, можа агенты, можа шпіёны, можа злодзеі ў пошуку неасцярожна пакладзеных гаманцоў; пасярэдзіне вялікі стол і святочна ўбраныя члены камісіі, збоку як бы інструктар гэтай адмысловай камедыі, дабрадушны і гаваркі пан камісар, ну і сумныя тыпы аголеных зусім мужчын, худых, брыдкіх, кепскіх паставаў, якія ў бледным страху стаялі перад урачыстым арэапагам. Мяне здзіўлялі пастановы, якія выдаваліся абы-як, хутка, часцей за ўсё «определение в службу». Бралі і ўносілі ў спіс далёка не аднога дыстрофіка, дадаючы з смехам, што той у войску паправіцца. Калі дайшла чарга да мяне, я стаў, як усе астатнія, і сапраўды адчуваў сябе пазбытым не толькі ўсёй адзежы, але і якіх-кольвечы прывілеяў. Аднак ужо менш чым праз хвіліну доктар знайшоў хранічны бранхіт, камісар жахнуўся ад майго выгляду, камісія хорам паўтарыла, і з узрушвальным адзінадумствам я быў прызнаны зусім не годным да вайсковай службы. Адразу пасля гэтага я атрымаў сіні білет, які з таго часу ахоўваў мяне падчас міру і вайны як «ратника второго ополчения» — зусім не прыдатнага, побач са сляпымі, глухімі і кульгавымі, да любога войска.*

Насельніцтва Каралеўства падпадала пад абавязак вайсковай службы ў расійскім войску нароўні з жыхарамі імперыі. Яе прынцыпы былі вызначаныя ў 1871 г. спецыяльнай камісіяй для распрацоўкі новага закону аб асабістым вайсковым абавязку ў імперыі і Каралеўстве Польскім. Быў уведзены ўсеагульны абавязак вайсковай службы, незалежна ад саслоўя і канфесіі. Яму падлягалі ўсе мужчыны пасля 21 года. Шмат прызыўнікоў атрымлівалі звальненні з прычыны сямейнага стану, яны дасягалі ажно 51,5 % ад усіх прызнаных здольнымі да дзейнай вайсковай службы. Але і пасля гэтага колькасць рэкрутаў была большай, чым патрэбы арміі. Выбар рэкрутаў вырашала лёсаванне. У канцы шасцідзесятых у Варшаве бралі ў войска 700—800 чалавек на год. На практыцы кожны чацвёрты адкупаўся ад гэтага абавязку.

Адтэрміноўка вайсковай службы давалася вучням сярэдніх школ і студэнтам ВНУ да часу заканчэння навучання (пасля чаго выпускнікі ВНУ служылі ў якасці добраахвотнікаў I ступені шэсць месяцаў, выпускнікі сярэдніх школ дабраахвотнікамі II ступені ў дзейнай службе паўтара года). Яны мелі першынства ў атрыманні афіцэрскага звання. Адтэрміноўку на пяць гадоў мелі таксама мужчыны з сем'яў купцоў або прамыслоўцаў.

Дзейная служба ў войску доўжылася 6 гадоў, у ваенна-марскіх сілах 7 (гэта было значнай палёгкай у параўнанні з часам Паскевіча — 15 гадоў), пасля чаго адбывалася залічэнне ў рэзерв.

На пачатку XX ст. узрост прызыву на службу быў устаноўлены ў 20 гадоў, тэрмін службы ў пяхоце і артылерыі скараціўся да 3 гадоў, у іншых родах войск — да 4, у флоце — да 5 гадоў, пасля чаго адбывалася залічэнне ў рэзерв на 13—15 гадоў (толькі на флоце — 5 гадоў).

## Войска

Баляслаў Прус пісаў у 1904 г. аб рускім народзе: «Ён не дасягае поўнага жыццёвага развіцця, бо калі англічанін жыве ў сярэднім 53 гады, немец — 37, то сярэднестатыстычны расіец жыве толькі 29 гадоў...» Гэтую празмерную смяротнасць, паводле яго, выклікаюць голад, галеча і сіфіліс. Аб гэтым апошнім:

*Напрыклад, у Пензенскай і Разанскай губернях сіфілітыкі складаюць 55 % насельніцтва, у Саланецкай 71 %, а ў Саратаўскай 73 %. У распаўсюджанні венерычных захворванняў вялікую ролю адыгрываюць жаўнеры, і гэта адна з прычын, з якіх мяне не захапляе прысутнасць 300-тысячнага войска ў Польскім Каралеўстве.*

У Варшаве ў апошняй чвэрці XIX ст. размяшчаўся 30-тысячны гарнізон. Ён складаў трыццатую частку ўсёй расійскай арміі. Паводле статыстыкі з 1880 г., яна налічвала 36 414 генералаў і афіцэраў плюс 894 094 жаўнераў. На сто чалавек 10 % умелі чытаць, 4 % умелі чытаць і пісаць, 0,2 % тых, хто да войска наведваў школы і ВНУ.

Уся расійская дзяржава падзеленая на 14 вайсковых акругаў, а тыя на 24 мясцовыя брыгады. Камандзіры гэтых брыгад, кіруючы ўсімі мясцовымі войскамі, у тым ліку запасам і рэзервам, маюць правы і прывілеі камандзіраў дывізіі.

Варшаўская акруга ўключае наступныя войскі:

- V корпус арміі з пяхотнымі дывізіямі і брыгадамі пяхотнай артылерыі № 7 і 8;
- дывізію кавалерыі з артылерыяй № 5, стралковымі брыгадамі № 1 і 2, сапёрнай брыгадай № 4, дывізіяй (дзве сотні) кубанскіх казакоў, трэцюю пяхотную дывізію з гвардзейскага корпуса разам з артылерыяй і трэцюю брыгаду другой кавалерыйскай гвардзейскай дывізіі з адной батарэяй;
- VI корпус арміі з пяхотнымі дывізіямі і брыгадай пяхотнай артылерыі № 4 і 10, і кавалерыйскай дывізіяй з артылерыяй № 6.

Эскадрон гвардзейцаў-уланаў быў найбольш франтаваты з дыслакаваных у Варшаве.

Вайсковыя агляды расійскага гарнізона маскоўскімі генерал-губернатарамі адбываліся перад саборам на плошчы Красінскіх. Сярод жаўнераў сустракалася шмат азіятаў.

Жаўнера, залічанага рэкрутам (на 20 гадоў службы), аплаквалі ў доме як нябожчыка. У войску ён падлягаў усякім пакаранням, за кожную дробязь быў біты прынамсі палкай, з ім кепска абыходзіліся, яго кепска кармілі, у яго амаль не было грошай. Сістэма хабараў і злоўжыванняў была ў вайсковай адміністрацыі шырока распаўсюджаная. Штабы ламіліся ад усяго, у тым ліку прадметаў раскошы і далікатэсаў. Найсмачнейшыя кансервы, паштэты, мяса, пікулі, віно, шампанскае, лікёры. Жаўнер жа быў вырачаны на ўсялякія невыгоды, спаў у брудзе або снезе, атрымліваў кавалак сапсаванага мяса, смярдзючыя кансервы, недапечаны хлеб з праераслага збожжа, зацвілыя сухары, тухлую кашу, ёлкае сала.

Ужо ў час Вялікага князя, нягледзячы на строгі вайсковы рэжым, жаўнеры ноччу часта рабавалі мінакоў на вуліцах, у Бялянскім лесе нават сярод белага дня. Вечарамі нападалі на кабет. Жаўнеры запаўнялі корчмы, піўныя, усялякія падазроныя прытоны. Больш за ўсё яны цанілі азартныя гульні і гучныя авантуры.

Найбольшая колькасць пакаранняў у расійскім войску прызначалася за крадзеж, растраты і п'янства. На сто пакараных 67 падлягала пакаранню за злачынствы. Столькі ж за п'янства. Вельмі рэдка каралі за непаслушэнства і дэзерцірства.

*

На ўсе асабістыя патрэбы — мыццё бялізны, тытунь, прылады для догляду рыштунку і мундзіра — звычайны жаўнер атрымліваў 9 рублёў на год (кошт дзевяці абедаў з чатырох страваў без кавы ў гатэлі «Еўрапейскі», паўтара месячнага заробку сакратара ў бюро). Акрамя таго, ён атрымліваў харчаванне два

разы на дзень, а калі было халодна — адну чарку гарэлкі (у вядры месцілася сто чарак).

Генералы і афіцэры гвардыі атрымлівалі ад 2000 рублёў (генерал) да 340 (карнет) у мірны час. Падчас вайны зарплата павялічвалася прыкладна на 40 %.

Акрамя выплат афіцэрам належалі таксама т. зв. сталовыя, гэта значыць грошы на жытло, ацяпленне, святло. Афіцэры кавалерыі, артылерыі і ад'ютанты атрымлівалі фураж на двух коней.

## Войска на вуліцы

*Выгляд войска, што маршыруе па вуліцы, асабліва конніцы, і нават жандараў на конях, калі яны падчас урачыстасцяў стаялі на рагу вуліцы Мядовай, па якой генерал-губернатар заўсёды ехаў на набажэнства ў царкву, захапляў мяне, а выгляд пажарнай аховы, асабліва «ратушнай», якая імкліва неслася на пажар, так уражваў мяне, што аднойчы я сам пабег за пажарнымі ажно на Свентаерскую вуліцу,*

— апавядае Фердынанд Хёсік.

*Калі мяне ў маленстве пыталіся, кім я хачу стаць, калі вырасту, я даваў траякія адказы: найперш я перажываў фазу, калі марыў зрабіцца... жандарам, бо мне надзвычай падабаліся пазорныя жандарскія коні; потым я хацеў стаць пажарным, каб на помпе магчы ехаць на пажар... (...) Канечне, шматлікіх рэчаў я яшчэ зусім не разумеў: я быў поўны запалу да войска — ці то ў выглядзе алавяных ці драўляных жаўнерыкаў, якімі я гуляўся на дыване ў салоне, ці то ў выглядзе жывых расійскіх жаўнераў, якіх я бачыў падчас маршу па вуліцы, я не ўяўляў сабе, якая роля гэтых войскаў у Варшаве. Для гэтага я яшчэ быў занадта малы.*

*

«У выпадку вулічнай патрэбы» выклікалі вайска. Яго можна было пабачыць на вуліцах пры любой аказіі. Нават падчас такіх урачыстасцяў, як адкрыццё помніка Міцкевічу, усё войска ў горадзе было мабілізаванае. Акрамя таго, штодзённую паліцыйную працу выконвалі казакі ў форме патрулёў, а пры асаблівых аказіях у выглядзе выпушчаных дзеля застрашэння ордаў, што нагадвалі тыя «праймаючыя дрыжыкамі істоты Бёкліна».

Генрык Мэрцбах гэтак убачыў вайсковы парад на прывітанне маладога брата Аляксандра II, вялікага князя Канстанціна ў 1862 г.:

*Доўгімі алеямі едзе кавалькада,*
*Страшна прыгожы пеклаў маскарад,*
*Маскоўская капела, дражнячы польскія вушы,*
*Зацягвае гучна гімн царскі і песні мангольскія,*

*Музыка, пыл, стук і лязгат шабляў,*
*Ператварае алеі ў нейкую вежу Вавілон...*
*(...)*
*Паліцэйскіх зграя расстаўленая стаіць,*
Руки по швам! *Баіцца слухаць, глядзець,*
*Прывязаная мундзірам да царскага возу,*
*Народжаная для мук, бізуноў і кайданаў...*

У звычайныя дні па Кракаўскім прадмесці або Новым Свеце, артэрыях з кампанейска-прагулянкавым характарам, прахаджалася шмат расійскіх афіцэраў і генералаў. Апошнія ішлі паволі, неважна «генеральским шагом». Кожны меў сівыя вусы, часта і белую бараду, а пад шыяй адхілены чырвоны штрыфель вайсковага шынеля. Генерал Камароў, адзін з вайсковых камандзіраў Варшавы і граза яе афіцэраў і жаўнераў, не меў барады, а штрыфель яго плашча меў канарэечны колер, што азначала прыналежнасць да літоўскага гвардзейскага палку грэнадзёраў варшаўскага гарнізона. За тры крокі па ім ішоў заўсёды казак з нагайкай за поясам.

Камароў затрымліваў вайскоўцаў, што ішлі насустрач, асабліва любіў адрываць іх ад дамскіх кампаній, правяраў дакументы і пры найменшай зачэпцы саджаў пад арышт. Пад удар падпадалі звычайна афіцэры, што прыехалі з правінцыі. Пра цікавую з'яву, звязаную з асобай гэтага заўзятага камандзіра, піша Ян Шчапкоўскі, называючы яе праявай «аб'ектыўнага сэрца Варшавы». Паколькі мэту шпацыраў Камарова ведалі ўсе, калі нехта яго заўважаў — разносчык газет, студэнт ці проста хлопец з вуліцы, — абганяў яго і перасцерагаў спатканых афіцэраў: «Камароў ідзе!» Яны ўцякалі ў брамы і хаваліся па крамах.

## Вусы і бароды

У мікалаеўскі час, як згадвае Аляксандр Краўсгар,

*вусы і бароды належалі да праяваў бунтарства, якія паліцмайстар Абрамовіч вынішчаў без літасці, выбіваючы іх уладальнікам зубы залатой табакеркай.*

Пасля смерці Паскевіча (1856) можна было мець вусы і бараду. Раней за такую правіну забіралі наўпрост з вуліцы ў Ратушу, дзе стрыжаных нязгодна з інструкцыямі галілі неадкладна.

Барадаў і вусоў не мелі толькі ксяндзы і акторы. Не дазвалялася іх мець таксама служкам, якія абслугоўвалі стол.

Вусы мелі амаль усе. Мацаваныя гарызантальна з дапамогай гарачага праса або вугорскай памады, або *a la* кайзер Вільгельм з паднятымі ўверх канцамі, што ў свой чарод патрабавала патрымаць прынамсі некалькі хвілінаў пад носам і вакол галавы т. зв. біндаж.

Папулярныя былі, на расійскі ўзор, бароды: поўныя, закручаныя ў форме сьпічака або лапаты, або іспанкі — вузкія, пры аголеных шчоках. Многія насілі яшчэ, на ўзор трох папулярных імператараў — пышныя, разыходныя ў абодва бакі бакенбарды, аддзеленыя выгаленай палоскай на падбародзі. Таму такія высокія і мулкія былі каўняры пры мундзірах і падыходзячыя пад самую бараду гальштукі з стаячым каўнерыкам (vatemörder) пры цывільнай адзежы.

## Гарбата

Кітайцы першыя выроштвалі гэтую расліну, прывезеную з Індыі, і пілі гэты гаючы напой. Ад паўночнакітайскага слова «ч'а» пайшла расійская назва *чай*, а ад яе — польскі *czajnik*.

У Польшчы яшчэ ў першай палове XVIII ст. гарбата лічылася лекам, але ўжо праз некалькі дзесяткаў гадоў яе пачалі піць у варшаўскіх арыстакратычных колах, пасля на магнацкіх дварах і ўрэшце ў вёсках і ў парафіях. У драме Юльюша Славацкага «Фантазы» графіня Рэспектова даручыла падаць графу найслабейшую гарбату — яна «шануе панскія нервы»...

На тэрыторыі Польшчы звычай піць гарбату распаўсюдзілі расійскія войскі. У XIX ст. гэта быў ужо танны напой. Разам з ім з Усходу прыйшла невядомая да таго часу прылада для запарвання гарбаты — самавар, вялікая пасудзіна для вады з меднай ці масянжовай бляхі. На поўдні ад Масквы, у Туле, знаходзіўся галоўны цэнтр іх вырабу.

У Варшаве ў канцы стагоддзя пілі выключна рускую гарбату ад знаных ва ўсім царстве фірм: Пярлова, Кузняцова, Шуміліна.

Аптовым гандлем гарбаты займаліся маскоўскія купцы. Найперш Істомін, які сабраў на гэтым салідны капітал і паставіў дзве камяніцы на Ерузалімскіх Алеях, а пасля іншыя.

*На Кракаўскім прадмесці, у гарбатнай краме,*
*Удыхаючы яе розныя пахучыя араматы,*
*Сярод кітайскіх на пачках і скрынках пантамім*
*Сядзіць, як мандарын, Усевалад Істомін.*

*Брунет з ружовым тварам, хоць дзеля барады паважны*
*І з даўжэйшымі валасамі, яшчэ малады,*
*Шыракаплечы, каржакаваты, схільны як быццам да паўнаты,*
*Бліщчыць вачэй усмешкай і радасцю жыцця.*

*Мае поспех вялікі. Ужо пятнаццаць гадоў*
*Каралеўства заказвае ў царства гарбату*
*Штогод дваццаць восем тысяч фунтаў.*
*Сёння ён адзін прадае ў чатыры разы больш.*

*Выбраныя і набытыя публікай чаі*
*Трое памагатых узважваюць, загортваюць, выдаюць:*
*Пятухін, Сукаў і ў чырвонай рубашцы Ваня,*
*Кітаец з касніком у галаве тут адчыняе дзверы і прыбірае.*

*Ці нехта з усё больш шматлікіх гурманаў не ведае пра*
*Магазін, калі ў акне фарфоравы Будда*
*Зранку да вечара ківае галавой штодзень,*
*Запрашаючы да пакупкі кожнага?*

Найбольш папулярнай, як і ў Расіі, была гарбата пад назвай «караванная». Доўгая сухапутная дарога ўмацоўвала яе арамат. Цэйлонскія і іншыя гарбаты, якія перавозіліся морам, лічыліся нясмачнымі.

*Пан Усевалад з першага адразу позірку*
*Густ і заможнасць сваіх гасцей найдакладней ацэньвае.*
*З-за вялікай разбежкі цэнаў гарбат*
*Адным раіць прасаваную, другім — Царскую ружу.*

*А для праўдзівых знаўцаў са сферы багатай*
*Ёсць мандарынская гарбата і чайны цвет,*
*З самай празрыстай заваркай, са смакам глазуры,*
*Самы духмяны, які п'юць без цукру.*

*Гэтая гарбата, у фарфоравым запараная чайніку,*
*Як спачатку здаецца млосць выклікае, але неўзабаве без ліку*
*Філіжанкі піць прагнуў бы і піць без канца —*
*Глазурны духмяны напой, святлейшы ад сонца.*

Праўдзівыя аматары гарбаты пілі яе не з філіжанкі, але са шклянкі. (Ці быў гэта па сутнасці расійскі ўплыў, ці, можа, абарона — кампраміс супраць усходняга піцця з сподка?) Ужыванне філіжанкі для піцця гарбаты лічылася такім жа злачынствам, як падаванне паабедзеннай чорнай кавы ў шклянцы. Малако альбо вяршкі ў гарбату далівалі выключна дзецям, дарослыя ж кідалі ў шклянку скрылік лімона, а ў Расіі — сухое сочыва.

*У Маскве п'юць гарбату амаль усе*
*Без цукру, але з* вареньем, *тут у нас у Варшаве —*
*Салоджаную, таму ёсць у краме і цукар у драбочках,*
*і цукар-пясок, цукровая пудра, і ёсць цэлыя галоўкі.*

*Добры купец дбае пра добрых кліентаў,*
*Гарбата бывае добрай толькі з самавара.*

*Таму тут таксама самавары з Тулы,*
*Латуневыя і пукатыя, як царкоўныя купалы.*

(Вітальд Лапчынскі, з рукапісу)

*

16 ліпеня 1889 г. Стэфан Жаромскі пасля вяртання з Кракава ў Аляснiцу занатаваў:

*Выпіў паскуднай гарбаты і здолеў заўважыць, што маскалі маюць дзве добрыя рэчы: Тургенева і гарбату. Прачытаў «Diabła» і пачаў цягацца па горадзе, убіраць у сябе гэтую польскую атмасферу з камянёў, з дамоў, старажытнасць, якая вее з вежаў, і на гадзіну адкінуў усе іншыя думкі, апроч асалоды ўдыхання гэтага духа горада, гэтага «цэнтра польскасці». Часам, як ідыёт, запыняўся пры відзе белых арлоў і пагоняў ратушы і доўга да іх прыглядаўся. Гэта вы так выглядаеце, гэта вы такія? Так — я, чырвоны патрыёт, 24-гадовы інтэлігентны чалавек (!), летуценнік — першы раз бачыў нацыянальны герб. О, маскалі, сябры-маскалі, браты-маскалі, хай вас халера бярэ кожны год!..*

*

*Крама гарбаты і расійскіх тавараў Тэадора Станіслаўскага ў Варшаве, на рагу вуліцы Нова-Сенатарскай у будынку тэатра. Філія Маскоўскага гандлёвага дома Я. Баранаў, раней А. Арлова, пастаўшчыка Двару Яго Царскай вялікасці прапануе:*
*Чорную гарбату — фунт ад 1 да 2 рублёў срэбрам;*
*зёлкавую гарбату — 2,5—5 рублёў срэбрам;*

# SKŁAD HERBATY

POD FIRMĄ MOSKIEWSKIEGO KUPCA

**WASILEGO KLIMUSZYNA.**

**Hurtowa i detaliczna sprzedaż herbaty w Warszawie przy ulicy Nowy Świat w domu Bankiera Toeplitza, pod Nr. 1310 (nowy 60).**

---

Sprzedaż **cząstkowa** odbywa się podług cenników, **hurtowa** zaś Handlującym z odstąpieniem rabatu.

Herbata **Kantońska** sprzedaje się po cenie od 1 rs. i wyższej, **Kiachtińska** od 1 rub. 40 kop. do 7 rubli za funt.

Herbata odważa się pod osobistym nadzorem Właściciela firmy w Głównym Kantorze w Moskwie na funty i półfunty, zaopatruje się plombą z oznaczeniem na każdej paczce firmy, wagi i ceny, i dlatego za dobroć i gatunek herbaty téj firmy gdzie bądź kupionéj, Właściciel poręcza a nadto przyjmuje na siebie wszelką odpowiedzialność.

P. S. Życzący sobie wejść w bezpośrednie handlowe stósunki z Właścicielem firmy, mają się adresować do Głównego Kantoru Składów Herbaty Wasilego s. Gabryela **Klimuszyna** w Moskwie.

*жоўтую гарбату — 4—12 рублёў срэбрам;*
*зялёную гарбату — 4—20 рублёў срэбрам.*

Акрамя таго, вялікі выбар масянжовых і тампакавых самавараў... Чайнікі, малочнікі, цукерніцы... Макароны, сушоныя маліны, сібірская жалезная бляха (!). Стэарынавыя свечкі Неўскай фабрыкі, калёшы, скрынкі для гарбаты... Крама існуе з 1829 г.

*«Царскі букет» за 2 рублі срэбрам і «Фучэфу» за 1 рубель срэбрам 50 кап. за фунт, два віды гарбаты найсвяжэйшага збору, агульнапрызнаныя і ўхваленыя дзеля невялікай цаны і добрай якасці, прадае склад гарбаты М. Мушкаля, вул. Сенатарская, 16.*

## Гарэлка

Палітычным лічыўся жарт з бурым медзвядзём, які, прахаджаючыся па бальнай зале падчас маскарада, на кожны зварот адказваў па-расійску: «Чего хочешь, водки?» А ў лапах трымаў бутэльку. Агенты паліцыі безвынікова стараліся гэтага мішку арыштаваць. Ён уцёк, пакуль яны паспелі ўзгадніць адпаведны загад.

*

Ракой ліецца шампанскае ў «Пану Тадэвушу». Нашэсце вінаў у першай палове XIX ст. адхіліла нават старапольскія вішнёўкі, медавухі, настойкі на кізіле. Гданьская гарэлка, якую праслаўлялі Сэндзя і Бянёўскі, была папулярная ўсюды. [Вінцэнты] Поль захапляўся старкай. У Кракаве пілі «камендантку», што памятала яшчэ Касцюшку, у Каралеўстве кменную настойку і пунш, палынаўку ў Галіччыне, на Пазнаньшчыне сівуху. А яшчэ піва. А яшчэ портэры...

*

П'янства, то бок забыццё: ківаў галавой Кюстын на Расію. Міністр фінансаў прадстаўляў Сенату распараджэнне пра «характэрныя рысы адэкалонаў і парфумы на спірце, не прызначанай для спажывання ў якасці напояў».

Пратакол дзяржаўнага сакратарыята Польскага Каралеўства ў артыкуле 1 пастанаўляў наступнае:

*выраб і продаж спіртных напояў у нядзелі і святы, як рэлігійныя, так і свецкія, ад раніцы да 1-й гадзіны дня ў гарадах і вёсках, забараняецца пад пагрозай кары, прадугледжанай артыкулам 98 Найвысачэйша зацверджанага закона.*

Закон ад 6/18.VII.1894 г. аб дзяржаўнай гарэлачнай манаполіі дзейнічаў спачатку толькі ў расійскіх губернях. Рэформа продажу алкаголю, паводле афіцыйнай версіі, мела на мэце «здароўе і матэрыяльны дабрабыт народа», але насамрэч бюджэт імкнуўся перахапіць усе вялізныя прыбыткі, выдаляючы

з гандлю гэтымі напоямі ўсіх прыватных пасярэднікаў. Увядзенню з 1898 г. дзяржаўнай гарэлачнай манаполіі ў Каралеўстве Польскім папярэднічалі выдадзеныя восенню 1897 г. распараджэнні обер-паліцмайстра варшаўскага і Міністэрства фінансаў аб прадпісаннях, абавязковых у манапольных крамах і тракцірах, якія фактычна пачалі выдаленне яўрэяў з гандлю алкагольнымі напоямі.

Як у Расіі, так і ў Каралеўстве Польскім адначасова з дзяржаўнай манаполіяй увялі т. зв. таварыствы цвярозасці.

## Генерал-губернатары

Пасля смерці Фёдара Берга (1874) пасаду намесніка ўжо больш не аднаўлялі, а яго наступнікаў называлі варшаўскімі генерал-губернатарамі.

Наступныя жыхары Варшаўскага замка — адміністратары Палаца Радзівілаў, пазней Намеснікаўскага, Галоўнакамандучыя Прывіслінскага краю, найвышэйшыя «вартаўнічыя дзяржаўнага парадку»:

Павел Кацэбэ (1874—1880) — на ўзор Берга прапагандыст суровага вайсковага рэжыму, хоць і меней ад яго самастойны.

Пётр Альбярдынскі (1880—1883) — шукаў збліжэння з арыстакратыяй, вызнаваў лагаднейшы курс, пазіцыянаваў сябе як ліберала. «Прыстойнаму чалавеку» — напісалі яму на пахавальным вянку варшаўскія студэнты.

Восіп Гурко (1883—1894) — рашучы русіфікатар, паслухмяны выканаўца волі новага цара Аляксандра III, які ўзмацніў рэакцыю.

Павел Шувалаў (1895).

Аляксандр Імератынскі (1896—1900).

Кароткі перыяд змякчэння курсу пасля смерці Аляксандра III. Далей:

Іван Падгароднікаў (1900—1901).

Міхаіл Чацвярткоў (1901—1905).

Канстанцін Максімовіч (6 месяцаў).

Георгій Скалон (1905—1914). Займаў пасаду да самай смерці, хоць на яго ладзіліся замахі. У гісторыі Каралеўства адзначыўся як прыхільнік наймацнейшых рэпрэсій (смяротныя пакаранні без суду).

* * *

Варшава Скалона адрознівалася ад Варшавы часу Берга. Колькасць жыхароў павялічылася ў чатыры разы, заможнасць — яшчэ больш. Узмацніўся польскі элемент, хоць па вуліцах, як і дагэтуль, круцяцца «чуйнавухія шпіёны».

Як і раней, паляць у печках і гатуюць на вугалі, хоць цэнтральнае ацяпленне ўстаноўлена ўжо на Ратушы, у Вялікім Тэатры, у гатэлі «Еўрапейскі» і саборы на Саксонскай плошчы. У гатэлях з'явіліся ліфты і тэлефоны. Аднапавярховыя дамы перасталі складаць большасць у горадзе, які таксама значна вырас. Былі збудаваныя Міроўскія рынкі і Уяздоўскі Парк, вялікая турма на Ракавецкай за заставамі. Быў адчынены першы ў Варшаве універмаг еўрапейскага ўзроўню на

Маршалкоўскай, 150 (фірма Герсэ). Як і раней, было багата пакупнікоў у крамах металёвых вырабаў у Пацяёве, антыкварыяту на Свентакжыскай, жаночай адзежы на Кручай і пернікаў ва Урублеўскага на Капітульнай.

Пабудова каналізацыі пазбавіла горад ад смярдзючых канаваў, аднак людзі мыліся неахвотна. Статыстыка апошняга году XIX ст. гаворыць пра дзве штогадовыя гігіенічныя працэдуры на аднаго жыхара (хоць было 25 публічных лазняў і ў кожнай сёмай кватэры лазенка). Павялічылася лічба кандытарскіх (з 41 да 130), кавярняў (з 59 да 167). У кандытарскай «Loursa» была ўстаноўлена «машына для захавання чыстага паветра». Святочны праменад праходзіць цяпер цераз Новы Свет і Уяздоўскія Алеі.

*

Варшаўскі генерал-губернатар і губернатары, якія ачольвалі адміністрацыі ў асобных губернях Польскага Каралеўства, обер-паліцмайстар горада Варшавы атрымалі права караць (губернатары і обер-паліцмайстар да 10 рублёў штрафу і 5 дзён арышту, генерал-губернатар да 500 рублёў і трох месяцаў арышту) за парушэнне прадпісанняў: а) аб паліцэйскім наглядзе; б) што тычацца дазволу валодання зброяй і набыцця боепрыпасаў; в) неадпраўлення набажэнстваў у святочныя ці цырыманіяльныя дні, а таксама адпраўленне іх у неадпаведнай форме прадстаўнікамі ўсіх веравызнанняў, акрамя праваслаўнага; г) аб з'ездах каталіцкага духавенства; д) дзейнасці духавенства, якое «працівіцца рэлігійнай цярпімасці альбо прапагандуе каталіцтва»; е) пабудовы капліц, крыжоў альбо помнікаў у памяць падзей, якія маюць палітычнае значэнне; ж) «неадпаведных паводзін» у касцёле ці тэатры падчас афіцыйных урачыстасцяў; з) нашэння жалобы «без юрыдычнай прычыны і дазволу ўладаў»; і) за парушэнне прадпісанняў аб вайсковым становішчы, паколькі раней за гэта не пагражала кара.

## Грамадская прыбіральня

Першая грамадская прыбіральня ў Варшаве (Тэатральная плошча, уваход — 5 капеек) была ўпрыгожана наступным вершыкам:

*Сяры, паляча, даволі, каб усёй Польшчы даць знаць,*
*Што з усенькіх свабодаў засталася адна.*

## Гузікі

*Чыноўнікаў — о! — чыноўнікаў*
*Сустрэў у жыцці я дужа;*
*Не помню ані колькасці іх гузікаў,*
*Ані чаму яны ўсе служаць?*

Цыпрыян Норвід

Od roku 1816$^{\text{go}}$ istniejąca

**FABRYKA**

**GUZIKÓW OZDÓB MUNDUROWYCH**

WYROBÓW PIECZĘTARSKICH I METALOWYCH

**Z. MÜNCHHEIMER**

EN GROS    Ulica Długa, Nr. 27 Hotel Polski    EN DÉTAIL

W WARSZAWIE.

---

**Medale** srebrne na pamiątkę chrztu, **Pieczęcie**, **Puszki** z tuszem, **Blachy** na drzwi, **Praski** do suchych stempli, **Kapsle** do butelek białe i w różnych kolorach, **Plomby**, **Stemple**, **Patrony**, **Marki** metalowe, **Topory** i **Cechy** wszelkiego rodzaju. **Noże** do otwierania Sardynek, **Szpady**, **Guziki**, **Hafty** i **Kapelusze** dla Urzędników, **Ostrogi**, **Swistawki**, **Herby**, **Litery** i **Korony** do liberyi i na szory. **Guziki** fantazyjne i **Spinki** do koszul **Reperacye** i **odnawianie** wyrobów z bronzu.

## Гурко

Піша Баранеса XYZ:

*Нізкага росту з доўгімі сівымі бакенбардамі, генерал Гурко не выглядае на крывавага ката. Наадварот, у яго твары ёсць нават штосьці сімпатычнае, нешта, што звычайна сімвалізуе і сілу волі, і суровую, жаўнерскую сумленнасць. Гледзячы на яго, падаецца, што гэта якісьці мармуровы характар, непарушны як скала і нязломны, бы Като. Ён выглядае як увасобленая паслядоўнасць, а тым часам акурат непаслядоўнасць і ёсць яго галоўнай хібай.*

*

Як рэзкі, суровы жаўнер, рыгарыст, ён выглядае хутчэй на службіста, пакорную прыладу цара, а не чалавека нейкага клана ці партыі. Тым часам ён *par excellence un home de parti*, чыстай крыві *деятель*, які не задавальняецца роляй выканаўцы загадаў, але сам іх дабіваецца, сам выступае з ініцыятывай.

*

*...прадстаўляецца чалавекам вузкіх даляглядаў, прыхільнікам фальшывай панмаскоўскай дактрыны, можа, нават дэмакратычным лібералам таго самага пакрою, што вельмі крыва-, дробна- і недальнабачны пецярбургскі альбо бульварны парыжскі лібералізм. Жыўлены падазронамі і нянавісцю жонкі і свайго атачэння да каталіцызму і ксяндзоў, са славянскімі марамі ў галаве, без элементарнага, асноўнага, абавязковага ведання прынцыпаў і ўмоваў палітычнага, грамадскага, адміністрацыйнага парадку, дзеля гэтага найгоршы адміністратар і ў нічым, апроч русіфікацыі, некампетэнтны*

*чалавек, які ані каліва не ведаў краіны і дагэтуль не ведае і, выглядае, нават не імкнецца, чалавек некалькіх формул, некалькіх жаўнерскіх службовых лозунгаў, заміляваны адно сваім рамяством, а ўсім іншым пагарджае.*

*Гурко — гэта выразны прадстаўнік новай школы, расійскага шавінізму, чалавек не столькі, можа, Аляксандра III, колькі Каткова.*

*

*У гэтых прымружаных, трохі затуманеных вачах, у гэтым глыбокім і загадкавым позірку, у гэтым на выгляд спакойным, але неспакойным твары адбіваецца характар чалавека, які выглядае на сфінкса, аднак хутка можа перакінуцца ў рубаку і будзе паліць, рубаць і сячы, і будзе праліваць патокі крыві, мяркуючы, што ў гэтым ёсць яго і ягонай бацькаўшчыны збавенне. Гэта небяспечны чалавек, святар «ваяўнічай царквы», небяспечны не столькі суб'ектыўна, колькі як прылада, якая ў іншых руках можа быць і страшнай і пагрозлівай.*

## Даўгі

*Табе трэба найперш ведаць, мая дарагая, што ўсе рускія сядзяць у Варшаве збольшага па вушы ў даўгах, — паведамляе сяброўцы Баранеса XYZ. — Прычына гэтага вельмі простая: распуснае жыццё. Параўнай, напрыклад, як жыве чыноўнік альбо вайсковец сярэдняй рукі ў Францыі, Аўстрыі ці Нямеччыне, з тым, як жыве чыноўнік такога ж прыкладна ўзроўню ў Варшаве, і зразумееш адразу, адкуль гэты працяглы цяжкі фінансавы стан, адкуль гэтая пастаянная пагоня за грашыма. За мяжой чыноўнік, маючы некалькі тысяч заробку, не ведае, што такое вялізная кватэра, гулянкі, экіпажы, коні; жыве ва ўтульным сямейным коле, не дае ніякіх прыёмаў; калі неяк з'явіцца ў манапольцы, то хіба толькі для таго, каб выпіць сціплы куфаль піва. У нас ніводзін афіцэр не можа абысціся без шампанскага, а кожны вышэйшы чыноўнік — без прасторнай кватэры, разгульных сняданняў, гаванскіх цыгар і вячорак у кампаніі вясёлых дачок Карынфа. Гэтыя «дочкі Карынфа» — таксама немалая прычына такога фінансавага стану гэтых людзей. Большасць з іх утрымоўвае не адзін, але два дамы адразу, а гэта ўсё ў Варшаве, дзе жыццё дарагое і яго ўзровень увогуле завышаны, паглынае немалыя сумы. Заробак, хоць у параўнанні з іншымі краінамі, а асабліва з аплатай працы польскіх чыноўнікаў, даць іх не можа, не пакрываюць іх т. зв. «легальныя» даходы, дарэчы кажучы, архіпраблематычнай натуры; не стае нават дадатковых выплат, якія кожны чыноўнік расіянін атрымоўвае асобна, звыш стаўкі, толькі за тое, што наважыўся «прысвяціць сябе радзіме» і прыбыць на Віслу... Раней ці пазней струнка павінна лопнуць; з'яўляюцца даўгі, а за імі неабходнасць павялічвання даходаў, паколькі* широкая *натура змяншаць выдаткаў не дазваляе.*

## Дзве мовы

У Бліклі: афіцэр, усеўшыся ў буфеце, паліць цыгару. Хтосьці з мясцовай службы падыходзіць і звяртае ягоную ўвагу на шыльду з аб'явай: просьба не паліць. «Я гэтай сабачай мовы не ведаю», — гучаў адказ. Уладальнік кандытарскай быў змушаны вывесіць шыльду на расійскай мове, а ўвесь інцыдэнт каштуе яму 100 рублёў штрафу.

*

З бягучых навін 1879 г.:

*Паведамляюць, што польскія назвы раслін, якія былі напісаны на шыльдачках каля расійскіх і лацінскіх назваў у Батанічным садзе, павінны быць выдаленыя згодна з загадам куратара Варшаўскай навучальнай акругі.*

*Паступаюць шматлікія просьбы звярнуць увагу на нязручнасці, абумоўленыя адсутнасцю надпісаў над паштовымі скрынкамі побач з дзяржаўнай мовай і на польскай мове. Шмат людзей, асабліва старых жанчын, кідаюць дзеля гэтага лісты ў неадпаведныя скрынкі, што выклікае шматлікія збоі ў дастаўцы адпраўленняў і цяжкасці для самой пошты. Надпісы над скрынкамі ўсё ж носяць характар не дзяржаўных адозваў, а ўказанняў для грамадскасці, дзеля гэтага мы мяркуем, што яны лепш бы адпавядалі свайму прызначэнню, калі б даваліся на некалькіх мовах.*

*

У кветкавай краме ў Бардэ афіцэр папрасіў расліну, падаючы толькі яе расійскую назву. Прадавец папрасіў аб польскай, французскай ці хаця б лацінскай наменклатуры. Афіцэр пагразіў, што загадае зачыніць краму, пакуль не будзе прыняты суб'ект, які гаворыць па-расійску.

*

Баляслаў Ліманоўскі[39]:

*Яшчэ да таго, як адбылося дзяржаўнае перайменаванне польскіх гарадоў, чыноўнікі ўжо свабодна змянялі назвы. Высылаю некалі ліст у Енджэюў (Jędrzejów). Якісьці малады чыноўнік з нахабным тварам і дурнаватым досціпам перакрэсліў гэтую назву і напісаў па-руску «Андреев». Маскаленне знаходзіла паслужлівы водгук у кожным чыноўніку-маскалю.*

*Модлін і Дэмблін ужо раней перахрысцілі на Новагеоргіеўск і Івангорад, цяпер Хэлм на Холм, Brześć на Брест-Литовск... У Пятркове вуліцу, якая вядзе ў бок Кракава, назвалі Данской.*

[39] Баляслаў Ліманоўскі (18.10.1835—15.02.1935) — польскі гісторык і сацыёлаг, палітык сацыялістычнага кірунку. *(Заўв. перакл.)*



Расійскія вяльможы на жалобным набажэнстве ў касцёле св. Крыжа (12 лютага 1889).
У першым радзе злева направа: Аляксандр Апухцін, Восіп Гурко, Марыя Андрэеўна Гурко.

*

Паляка, які добра гаварыў па-руску, добра разумеў другі паляк, паколькі ў размове па-польску перакладаў паасобныя сказы, звароты і вобразы на кніжную, вывучаную расійскую мову. Адвакат Цэдэрбаўм апісвае гэты працэс падвойнага перакладу, напрыклад, судовых моваў. І выказвае сумнеў наконт таго, ці прадукцыя нашых «служак Феміды» знайшла ўхвалу не толькі сярод пецярбургскіх празаікаў, але хаця б атрымала задавальняльную адзнаку ў настаўнікаў гімназій, якія столькі пакаленняў катавалі сваімі граматычна-стылістычнымі патрабаваннямі.

Што ж тады гаварыць пра тых, хто не сутыкнуўся ў школе з гэтай мовай. А шмат палякаў пасля змены дзяржаўнай мовы стараліся трымацца на пасадах. Іх намаганні даць рады моўным абавязкам часта набывалі карыкатурную форму. Адзін натарыус, прагнучы перакласці «działo się to w Warszawie dnia...» («дзеялася гэта ў Варшаве дня...»), знайшоў у слоўніку пад словам «działo» — *пушка*, і пачаў дакумент выразам: «*пушкалося в Варшаве дня...*». У чыгуначным дакладзе загадчык участка пісаў аб адрамантаваным чыгуначным мосце на рацэ Варце: «*мост на реке Караул (караул* — Варта*) готов, поезда могут ходить!*»




Яшчэ адзін чыгуначнік, обер-кандуктар, ужо без дапамогі слоўніка пісаў у сваім рапарце аб лопнутым унітазе ў спецыяльным вагоне (туалет знаходзіўся толькі ў спецыяльных вагонах, у якіх трэба было ехаць ад станцыі да станцыі): *«В сральном вагоне лопнуло заседание»*.

## Дзень Ярдана

Найвялікшы царкоўна-вайсковы парад па вуліцах Варшавы. 19 студзеня, падчас самых лютых маразоў, якія пануюць у гэтую пару, на Вісле ў ваколіцах Моста Кербедзя адбывалася цырымонія асвячэння вады. З боку Лазенак, праз Новы Свет і Кракаўскае прадмесце едуць і маршыруюць гвардзейцы з аркестрамі на чале: полк гусараў у бабровых шапках з белымі лісінымі хвастамі, у зялёных мундзірах, белых і чырвоных нагавіцах, полк уланаў у чыста польскіх уніформах узору да 1831 г. (Толькі шырокі рагаты польскі ківер быў паменшаны да памеру металёвай каскі з шыйкай і невялікім квадратам, каля якога лунаў чырвоны лісіны хвост.) За кавалерыяй — грэнадзёры, агромністыя сяляне (пераважна латышы): літоўскі полк з жоўтымі лампасамі, валынскі з блакітнымі, кексгольмскі з белымі. За пяхотай конная артылерыя. Цяжкія гарматы і шэсць магутных коней цягнуць кожную. З гэтых гарматаў будуць страляць на лёдзе, а ў палонцы пасля ўрачыстасцяў выкупаецца які-небудзь *«здоровый молодец»* — такая народная звычка.

## Друк

У 1864—1915 гг. у Варшаве выходзіла каля 50 расійскіх друкаваных выданняў! (Для параўнання: у 1864 г. у Каралеўстве друкавалася 20 польскіх выданняў, у 1885 г. іх было 80, а ў 1904 г. ужо 140.)

**Расійскай газетай для расійцаў, як назваў яе на пачатку 1880 г. яе галоўны рэдактар князь Галіцын, і галоўным органам улады Каралеўства быў «Варшав-**

ский Дневник» (1864—1915) накладам да 6000 асобнікаў, цаной 5 капеек. Ён друкаваў урадавыя распараджэнні. Каментаваў палітычныя падзеі, падобна як і «Варшавская полицейская газета» (1845—1915). Абодва выданні выходзілі некалькі гадоў на дзвюх мовах, але ад польскай версіі хутка адмовіліся.

З прафесійных выданняў найбольш папулярным быў тыднёвік «Варшавские Биржевые Ведомости» (1909—1912). Свае друкаваныя органы мелі абедзве варшаўскія вышэйшыя навучальныя ўстановы — універсітэт і палітэхніка.

Найбольш значныя расійскія перыёдыкі на ваенную тэматыку: «Варшавский Военный Журнал» (1899—1904) — выходзіў раз на месяц і «Варшавский Военный Вестник» (1906—1914) — тыднёвік.

*

З студзеня 1873 г. на рагу Брацкай і Журавяй дзейнічала Агенцыя па продажы расійскіх кніжак ва ўсім Каралеўстве. Гэта быў склад усіх выданняў Таварыства грамадскіх карысцяў, а таксама картаграфічных публікацый выдавецтва Юльіна. Два разы на месяц туды прыходзілі «навінкі прэсы з Пецярбурга і Масквы».

## Жандары

Новы закон аб жандармерыі Каралеўства Польскага ад 1866 г. засцерагаў, што афіцэры і чыноўнікі, а таксама унтэр-афіцэры і жаўнеры, прызваныя на службу ў Варшаўскай акрузе, не могуць быць ні польскага паходжання, ні каталікамі.

III Аддзел Уласнай яго Імператарскай вялікасці («Собственной Его Императорского Величества») Канцылярыі, т. зв. «охранка», быў кіраўнічым цэнтрам службы грамадскай бяспекі, якой была жандармерыя. Шэф III Аддзела быў адначасова галоўнакамандуючым корпуса жандараў. Дзейнасць III Аддзела і жандармерыі ахоплівала справы злачынстваў супраць бяспекі дзяржавы, асабліва таемных арганізацый, нагляд над замежнікамі, легальнымі грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі, нарэшце кантроль за палітычнымі настроямі насельніцтва. Аддзел быў падзелены на пяць дэпартаментаў. У ім працавала параўнальна невялікая колькасць людзей (на момант ліквідацыі — 72). Падлеглы непасрэдна імператару III Аддзел быў — як гэта акрэсліў Аляксандр Герцэн — «па-за правам і па-над правам». Пасля яго ліквідацыі ў жніўні 1880 г. з ініцыятывы тагачаснага міністра ўнутраных спраў Міхаіла Лорыс-Мельнікава, функцыі III Аддзела пераняў настворажаны дэпартамент паліцыі ў Міністэрстве ўнутраных справаў, а міністр унутраных справаў стаў шэфам Асобнага жандарскага корпуса.

*

З «Падручніка для чыноўнікаў жандарскага корпуса пры следчых дзеяннях». *Склаў палкоўнік Папоў. Пецярбург 1888:*



*У нас за простую задуму (голый замысел) караюць толькі пры палітычных справах.*

*За падрыхтоўку злачынства караюць толькі пры падробцы грошай, забойстве, падпале і палітычных праступках.*

Кажучы пра тэрмін даўнасці, аўтар дадае, што пэўныя злачынствы яго не маюць, у тым ліку палітычныя.

*Таемнымі асацыяцыямі называюцца ўсе зборкі, што перасьледуюць шкодныя мэты, сходы, аб'яднанні, таварыствы, гурткі, арцелі і г. д., якія паўсталі або дзейнічаюць у выніку змовы паміж некалькімі асобамі...*

Тлумачэнне арт. 21 закона ад 14 жніўня. На падставе гэтага артыкула агульная паліцыя мае права праводзіцьператрусы і арыштоўваць падазраваных у палітычных злачынствах. Што тычыцца чыноўнікаў жандарскага корпуса, то закон пацвярджае ўсе іх правы, устаноўленыя законам ад 1 верасня 1878. То бок, чыноўнікі жандарскага корпуса маюць права праводзіць ператрусы і арыштоўваць асобаў, якіх ёсць падставы падазраваць у палітычнай нядобранадзейнасці, а ў той самы час няма дастатковых довадаў, патрэбных для пачатку справы ў выглядзе фармальнага следства. Сюды трэба залічыць злачынствы, пакаранне за якія яшчэ не вызначана ў кодэксе, або пра якія закон наогул маўчыць, напрыклад: вулічныя беспарадкі і сходкі палітычнага характару.

### Жандарская песня

*Мы пойдзем на лоўлю, на лоўлю,*
*Сябра мой!*
*Паціхеньку ў ночы пойдзем*
*Іператрус правядзём,*
*Сябра мой!*

*Ты ў браму пазвані, пазвані,*
*Сябра мой!*
*Пагавары з вартай, святло згасі —*
*Я кухняй, ты з фронту ўвайдзі,*
*Сябра мой!*

*У кватэру стукні, стукні,*
*Сябра мой!*
*Праз дзверы запытае пан ці дама:*
*Хто? — Адкажы:* Телеграмма...
*Сябра мой!*
*Дзверы адчыняцца: тады, тады,*
*Сябра мой!*
*Гайда на іх з жандарамі,*
*Гарадавымі і панятымі,*
*Сябра мой!*
*Па кішэнях найперш, найперш,*
*Сябра мой!*
*Потым па ўсіх вуглах*
*Усе дзіркі, спраты, схованкі,*
*Сябра мой!*
*Потым ўжо да кніжак, кніжак,*
*Сябра мой!*
*Ё брашуркі?* Есть брошюрки?
Где? — *У гаспадара, гаспадыні, дочкі...*
*Сябра мой!*
*Так, ты бярэш гаспадара, гаспадара,*
*Сябра мой!*
*А я гаспадыню, дачку, слугу,*
*І ў адны, другія калёсы,*
*Сябра мой!*
*Вяртаемся з лоўлі, з лоўлі,*
*Сябра мой!*
Есть брошюрки, *рэчы іншыя,*
*Усякія — вінныя і нявінныя.*
*Сябра мой!*
*Так мы ездзім штоноч, штоноч,*
*Сябра мой!*
*Але за ўсе выкрутасы,*
*Будзе ордэн вышэйшай класы,*
*Сябра мой!*
*Гэта ж я табе кажу, кажу,*
*Сябра мой!*
*Хоць шмат хто той мае дар,*
*Ёсць хто лепшы, чым жандар?*
*Сябра мой!*

(*Zza kulis Warszawy, Kraków 1901*)

## Замак

Памаляванаму ў цагляна-аранжавы колер замку пагражае зялёны дах, а можа і чырвоныя аканіцы, каб ён «лепш нагадваў сваім насельнікам любімыя Уфу, Тамбоў і Волагду».

«Афіцыйна» яго называюць «былым каралеўскім Замкам». Колішняя рэзідэнцыя Вазаў і Станіслава, пазней сядзіба канстытуцыйных манархаў Каралеўства Польскага, цяпер ахрышчана царскім палацам. Але з часу дэтранізацыі Мікалая, што адбылася ў гэтым будынку, ніводзін з расійскіх цароў яшчэ ані разу тут не заначаваў. Яны звычайна запыняюцца ў Бельведоры або ў Лазенках, а ў замку бываюць толькі на балах, раней у намеснікаў, а цяпер у генерал-губернатараў.

Пра жылыя пакоі тых апошніх казалі, што «надта прыкрае робяць уражанне». Нават не як апартамент нераможцы, але «вялікапанская сядзіба, дзе пасяліўся

раптоўна разбагацелы мужык», які, «нахапаўшы багацця, удае з сябе вялікага чалавека». І

*адчуваеш, што гэты новы гаспадар не ўмее ані ацаніць гэтых твораў мастацтва, якія некалі так заўзята збіраў яго папярэдні насельнік, ані ўшанаваць не тое што гістарычных помнікаў, але і проста эстэтыкі і самога паняцця прыгажосці, якое, вядома ж, міжнароднае. Адчуваеш, што тут да яго нічога не прамаўляла і не прамаўляе, бачыш перадусім брутальнасць сілы і грошай, злучаныя з поўнай адсутнасцю ўсяго, што ёсць рысай нейкага больш вытанчанага, лепшага выхавання.*

У супрацьлеглым крыле Замку, пры канцы парадных апартаментаў, што памятаюць польскае мінулае, знаходзяцца тэатральная і канцэртная залы, якія князь Паскевіч перарабіў у царкву. Там ужо ўсё новае, візантыйскае, у золаце і з мноствам абразоў. «Пераступаючы парог гэтай царквы, ты быццам адразу пераносішся на нейкія тысячу міляў на ўсход». Убранне ўсё вельмі дарагое, але таксама «надзвычай безгустоўнае».

Ад Плошчы Жыгімонта Каралеўскі замак — гэта проста казармы. Цяжка вызначыць, дзе былі колішнія дэпутацкія і сенатарскія палаты, нават тыя з эпохі Каралеўства Польскага. Вялікая зала перапробленая ў чыноўніцкія пакойчыкі. На другім паверсе размясціўся гарнізон замку (гвардзейскі батальён і сотня кубанскіх казакоў).

«Засталіся толькі муры, унутры няма ніводнай колішняй цэглы».

## Казармы

Нізкія аднапавярховыя будынкі з чырвонай цэглы ў казарменна-ўсходнім стылі, багата аздобленыя ўстаўкамі з сырой цэглы, фарбаваныя дзе толькі можна ў блакітны і жоўты колер, «рабілі выгляд чагосьці чужога і варварскага на тэрыторыі горада».

Згодна з «Варшаўскім праваднікам» Фрыза і Хадаровіча за 1873 г.:

Казармы і вайсковыя баракі:
Аляксандраўскія — Аляксандраўская цытадэль;
Гусарскія — Чарнякоўская, 25;
Ерусалімскія — Капыкі 1753 (е);
Кірасірскія — Чарнякоўская, 37—39;
Казацкія — на тэрасе Замку;
Міроўскія — плошча Жалезнай Брамы, 11;
Сапежынскія — Закрачымская, 6;
Серакоўскія — Капвікторская, 1;
Уяздоўскія — Маршалкоўская, 4;
Уланскія — Каралеўскія Лазенкі, 31;
Вальнскія — Праезд, 15, Палац Мастоўскіх;



Расійскі лагер на Замкавай плошчы (1863), французская гравюра.

Зборны пункт і баракі ў Празе — Санкт-Пецярбургская (сёння Сталінградская), 501 (124 мураваныя і драўляныя будынкі).

Царская армія мела тэндэнцыю «прысабечвання» суседніх аб'ектаў, толькі ўскосна звязаных з войскам. Адсюль у ваколіцах Лазенак характэрныя засольні капусты (урэзаныя ў кантрафорсы Уяздоўскага Замку), вайсковыя пральні і пякарні, школа ветэрынараў, манежы (у адным з іх на Мысліведкай сёння знаходзіцца будынак радыё).

Важнейшыя адрасы (Каляндар Унгера на 1875 г.):

Вайсковыя ўлады:

Галоўнакамандуючы войскамі Варшаўскай ваеннай акругі,

генерал-губернатар Павел Кацэбу — Кракаўскае прадмесце, былы Каралеўскі замак;

Канцылярыя памочніка Галоўнакамандуючага войскамі Варшаўскай ваеннай акругі — Бялянская, 10;

Камандаванне Варшаўскай ваеннай акругі — Саксонская Плошча, 4;

Ваенна-палявы Суд — Электаральная, 9;

Вайсковая юнкерская школа — Сенатарская, 13;

Акружны штаб — Саксонская плошча, 4;

Штаб мясцовых войскаў — Брацкая, 12;

Штаб трэцяй пяхотнай гвардзейскай дывізіі — Новы Свет, 67.

## Кацап

19 мая Норвід пісаў з Парыжа:

*Спадарычна Канстанцыя Гурская была вельмі ласкавая, намаўляючы мяне верыць, што чалавек гэта нішто і нуль.*

*Спадарыня Эсакоф вельмі дзівіцца, што можна дзве гадзіны моўчкі сядзець у адным куце.*

*Анэта робіць гарбату, Ротшыльд гуляе ў біржу, спадарыня Францішка Патоцкая выходзіць замуж, спадарыня Калергіс ездзіць па варшаўскім бруку з кацапам на козлах, спадарыня X. укалола шпількай палец, спадар А. нюхае табаку.*

*Чалавек ёсць нішто!*

*Найніжэйшы слуга*

Ц. Норвід

## Клуб паляўнічых

«Варшаўская палата паноў ад Бакарата да Вінта», — як гаварыў Францішак Кастжэўскі. Варшаўскае Монтэ-Карла было забяспечанае дасканалым сутарэннем і вытанчанай кухняй.

*Калі хочаш ведаць, хто з рускіх у Варшаве адносна прыстойны, прынамсі так-сяк можа бываць у добрым таварыстве, то пытай, ці належыць да Клубу паляўнічых, — раіла Баранеса XYZ. — Гэта не будзе вялікай рэкамендацыяй, але хутчэй падказкай, што ён паходзіць з лепшай сям'і, а калі прайграе ў карты — заплаціць.*

Клуб паляўнічых, заснаваны ў 1867 г., спрыяў таварыскім кантактам польскай арыстакратыі (тут сустракаліся Патоцкія, Любамірскія, Замойскія, Браніцкія, Касакоўскія) з элітай адміністрацыі і войска, дыслакаванага ў Варшаве. Клуб без цяжкасцяў прымаў у свае члены расійскіх вяльмож і тытулаваных афіцэраў гвардыі ў сядзібе на вуліцы Крулеўскай, а з канца 1890 г. пры Ерыванскай (Крэдытова). Доўгі час яго старшынём граф Томаш Замойскі.

Членства ў Клубе паляўнічых давала пэўныя прывілеі — валодаць зброяй і пашпартам, які дазваляў свабодна рухацца па краіне, а таксама права паляваць ва ўсіх дзяржаўных лясах Каралеўства Польскага.

## Конныя скачкі

Таварыства існавала ад 1841 г., у 1868 г. перайшло пад кантроль Галоўнай управы дзяржаўнай конегадоўлі ў Пецярбургу. У 1873 г. яно складалася з 36 сяброў, якія сплачвалі гадавыя ўнёскі ў памеры 50 рублёў.



Сцэна з конных скачак (1891—1892).

*Уся польская грамада спярэшчаная, бы квеценню, афіцэрскімі мундзірамі. Кабеты-полькі фліртуюць з афіцэрамі, мужчыны-палякі перапрадаюць ім з ветлівасці найлепшых коней і дбаюць пра тое, каб колькасць узнагарод дзялілася пароўну паміж расійцамі і палякамі,*

— пісаў Пшыгодны.

На іпадроме на Макатоўскім полі, даволі далёка ад горада, з 1887 г. паблізу Польнай збіралася польская арыстакратыя, багатыя земляўласнікі, гадавальнікі скакавых коней, князі Любамірскія, Патоцкія, Грабоўскія, Замойскія, з'явіліся таксама расійскія вайскоўцы, у асноўным афіцэры гвардыі, князь Чаўчавадзэ, барон Урангель, граф Стэйнбок-Фэрмор, Кавелін, Лазараў. Святочная забава, паездка ў элегантным экіпажы і азартныя гульні спалучаліся з магчымасцю наладжвання таварыскіх дачыненняў з расійцамі на нейтральным грунце.

*Конныя гонкі стварылі пралом, — заўважае сучаснік, — праз які змешаная з расійцамі арыстакратыя ўступіла ў прыязныя дачыненні з простым насельніцтвам. Ніколі дагэтуль гэтае насельніцтва не сутыкалася з арыстакратыяй, асабліва з той «конскай». Гэта чужая народу сфера, якая ахвотна бавіць час у Пецярбургу або за мяжой, выпрошвае камергерскія мундзіры, прадае расійцам маёнткі, наведвае святочныя набажэнствы ў праваслаўным саборы, а ў маральным аспекце — цынічна распусная. Варша-*

*ва цураецца як арыстакратыі, гэтак і расійцаў, з якімі не падтрымлівае прыязных дачыненняў.*

Білет на скачкі каштаваў 10 рублёў. Таталізатар, пачаткова арганізаваны для вышэйшых слаёў, з часам робіцца вельмі папулярны сярод натоўпу. У 1901 г. на працягу 14 дзён абароты дасягнулі 1 750 000 рублёў.

## Крупчатка

Мука была на асаблівым рахунку ў прыезджых рускіх.

Яны прывозілі сабе харчы з глыбіні Расіі. Склады расійскіх тавараў пастаўлялі ім розныя далікатэсы з дзічынай (белыя зайцы!), рознакаляровай ікрой і саладкаватым хлебам Філіпава. Афіцэрская крама на Новым Свеце, 69, у былым палацы Замойскіх, каля расійскай кнігарні Карбаснікава, ламілася ад самых розных гатункаў паўднёвай, крымскай і каўказскай садавіны. Запалкі таксама прывозілі з Расіі, ужо не кажучы пра тытунёвыя вырабы выключна з рэнамаваных фабрык імперыі.

Польскія каланіяльныя крамы не вабілі расійскіх кліентаў, у адрозненне ад такіх ювелірных фірм, як Вапінскі, Турчынскі, Манкевіч, асабліва ўпадабаных расійскімі дамамі. І абутковых — польскі абутак лічыўся найбольш шыкоўным. З гледзішча моды Варшава трактавалася як Парыж.

## Лётаючы універсітэт

11 чэрвеня 1896 г. быў арыштаваны Пётр Хмялёўскі паводле падазрэння ва ўдзеле ў працы Лётаючага універсітэта. (Ён выкладаў там гісторыю польскай літаратуры.) У лісце адной з слухачак быў вычытаны наступны сказ: «Калі б маскалі ведалі, што нам чытае на сваіх лекцыях Хмялёўскі, і ён і мы трапілі б у Сібір». Праз некалькі дзён Хмялёўскі быў вызвалены.

Успамінае Станіслава Хмялёўска:

*Мяне прынялі ў т. зв. лётаючы універсітэт пані Зузанны Мараўскай. Гэта былі таемныя курсы, дзе выкладалі найлепшыя прафесары, такія, як Хмялёўскі, Корзан, Уладзіслаў Смаленскі, Крамштык. Гэтая таемная навучальная ўстанова называлася лётаючай таму, што заняткі праходзілі папераменна ў кватэры пані Мараўскай або ў школе карункаў і гафтаў пані Рафальскай на трэцім паверсе. Сядалі за вялікі стол — прафесар і мы паўколам. Ён выкладаў, а мы занатоўвалі ў маленькіх сшытачках, пазней гэта складалася ў сістэматычны курс. Не было штодзённых адзнак, толькі кантрольныя раз на месяц. Нататкі хавалі ў кішэню ў столках спаднічкі, выходзілі звычайна адным з трох выхадаў на падворак і галоўным да брамы Маршалкоўскай № 137. Быў выхад з падворка на Сенную — так што ў выпадку ператрусу прафесары паспявалі ўцячы, а слухачкі пачыналі займацца*

*вязаннем, а неабходныя для гэтага прылады імгненна з'яўляліся на сталах. Здарылася, што на лекцыі прафесара Смаленскага пра час да і пасля падзелаў, пра ўсёўладдзе расійскага пасла Рэпніна, пра тое, як дэпутаты сойму ніякавелі пры яго выглядзе, прагучала раптам слова «ператрус»! Смаленскі ўскочыў, знік за заслонай і выбег кухоннымі сходамі. Трапіў на Сенную вуліцу, дзе сеў у экіпаж і хутка з'ехаў. Нічога не стала вядомым, бо пані Launch Мараўска плаціла царскім шпікам на дзвюх вуліцах!*

У 1906 г. Лётаючы універсітэт, які дзейнічаў ад 1886 г., а паўстаў з жаночых ячэек самаадукацыі, пераўтварыўся ў Таварыства навучальных курсаў. У дзевяностыя гады XIX ст. слухачамі была моладзь мужчынскага полу, што вучылася ў зрусіфікаваных варшаўскіх вучэльнях.

## Літвакі

Рыса аселасці (*черта оседления*) праходзіла на захад ад Дняпра. Туды з 1893 г. царскія ўлады загадвалі перасяляцца яўрэям з цэнтральнай Расіі. На працягу пары дзесяткаў гадоў іх прыбыло сюды каля 100 тысяч чалавек. Іх называлі літвакамі. Больш заможныя сяліліся ў Варшаве, інвестуючы паважныя сумы ў нерухомасць, вытворчасць і гандаль. Яны ажывілі галантарэйна-мадэльерскую прамысловасць. Прызначаныя для экспарту ў Расію парасоны, торбы, пальчаткі, вееры, дамская бялізна выраблялся на іх прадпрыемствах, дзе да таго ж знайшлі працу тысячы маладых яўрэйскіх дзяўчат.

Дарма што літвацкая моладзь ставілася да царызму варожа і была асабліва падатлівай на рэвалюцыйныя ўплывы, улада падтрымоўвала літвакоў. Гаворачы па-расійску, яны спрычыняліся да ўнутранай русіфікацыі горада. Наплыў літвакоў шкодзіў мясцовым яўрэям і павялічваў антысеміцкія настроі.

## Марыя Андрэеўна

Польскія чыгуначнікі, якія працуюць на ўчастку чыгункі Люблін — Ковель, данеслі свайму начальству, што ў вялізных багажах былой генерал-губернаторкі знаходзяцца каштоўныя гістарычныя каміны, скрадзеныя з варшаўскага замка, з шматлікім каштоўным антыкварыятам з замкавых пакояў. Паінфармаваны аб гэтым міністр царскага двара, генерал Федрыкс, не хацеў выклікаць вялікага скандалу, загадаў каміны і мэблю адаслаць назад у Варшаву. Так скончылася варшаўская кар'ера Марыі Андрэеўны Гурко, Навасільцава ў спадніцы.

*Згадай, — прасвятляе сяброўку Баранеса XYZ, — колькі разоў табе даводзілася спаткаць «палітычную жанчыну», і кожная была, не скажу брыдкая (паколькі гэта не абавязковая, але пашыраная ўмова), але з пэўнымі заганамі. Адна дзеля жудаснай непрывабнасці, другая дзеля падтрымання падмочанай рэпутацыі, вельмі рэдка каторая дзеля спорту, усе рухомыя павышэннем значэння ці прагай помсты кідаюцца ў вір агітацыі і інтрыг, хочучы такім*

*чынам навязаць свету пазіцыю і ўплывы, якіх гэты свет акурат дзеля гэтых заганаў добраахвотна ім даць не хацеў. Калі якой жанчыне ніколі не хапала дару аб'яднання людзей, калі што ні выхаваннем, ні спрытам, ні манерамі не магла забяспечыць сабе лепшай пазіцыі ў грамадстве і была асуджана на вечную ролю салоннай «папялушкі», тая, паколькі акалічнасці гэтаму спрыяюць, беспамылкова ўловіць кожную аказію, каб даць адчуць сваю вышэйшасць і, як выскачка грашыма, так яна сваёй уладай будзе тыкаць на ўсе бакі і свяціць кожнаму ў вочы. Так жа сталася і з Марыяй Андрэеўнай. Прыехала яна ў Варшаву як місіянерка, з фанатызмам, але без інтэлігентнасці і выхавання ад фрэйліны Блудавай, з пазіцыяй і ўпэўненасцю, што з яе пачнецца сапраўдная русіфікацыя гэтага краю, што яна зможа ўсіх тут навучыць розуму і высока падыме штандар праваслаўя.*

Тым часам яна пачала ўдаваць з сябе прыхільніцу «народных звычак і нейкага кулінарнага патрыятызму». Сталі слыннымі яе запрашэнні на замкавы баль, надрукаваныя па-руску, з днём, адзначаным паводле старога стылю (дагэтуль дзейнічала французская і падвойная дата). Парадак танцаў на балях і меню вячэры друкаваліся кірыліцай. Таму *Chaud-froid* з перапёлак называлася *попелочное шофруа, crume d'asperges — асперзный крем* і г. д.

Хутка настроіла яна ўсіх супраць сябе адсутнасцю такту, элементарных таварыскіх правіл паводзін, прыязнасці.

*

Яна мела брыдкую звычку красці. Тлумачылася гэта велікадушна хваробай, якая на вучонай мове і ўзнёсла называецца клептаманіяй. Спадарыня Тлуста, уладальніца крамы стужак на вуліцы Жабяй, схапіўшы кліентку на крадзяжы, не мела нчасця яе распазнаць. Якое ж было яе здзіўленне і жах, калі выкліканы ахоўнік бяспекі замест таго, каб затрымаць злодзейку, выструніўся перад ёй і на ейны загад арыштаваў спадарыню Тлусту. Яе абвінавацілі ў неабгрунтаваных падазрэннях і абразе генерал-губернатара і асудзілі на тры месяцы турмы. Суддзю, які зацягваў з прыняццем гэтага рашэння, перавялі пры нагодзе ў Сібір, а адвакат Цэдэрбаўм, які асмеліўся бараніць абвінавачаную, быў пазбаўлены ліцэнзіі на пяць гадоў.

*

Галоўныя рысы Марыі Андрэеўны паводле праніклівага назіральніка:

*Штучны праваслаўны фанатызм, місіянерская агітацыя, жаданне паказваць сябе «маткай Царквы» і Катковай у спадніцы, стан пастаяннага раздражнення і дробных нападак, няздольнасць да любых праяваў прыязнасці, русіфікацыя, прасунутая аж да кухні і танцавальных ансамбляў, палітык на ўласную руку, безнадзейная, але надзвычай дакучлівая мясцовая сістэмка, а перадусім віруючая на першым плане нейкая заўзятасць і нянавісць да ўсяго, што польскае.*

*

У Варшаве расказвалі, што на загад спадарыні Гурко перастралялі ўсіх польскіх вераб'ёў у Лазенках, а на іх месца прывезлі *метлушек* з Самарскай губерні.

## Мундзір гімназіста

З сукна светла-гранатавага (цёмна-блакітнага) колеру, доўгі — да стану, зашпілены на дзевяць срэбных гузікаў (з дзвюхгаловым арлом пасярэдзіне), з каўнерам, аблямаваным срэбным галонам, чорная блузка з поясам і шэры шынэль. Шапка мела форму кепі французскіх жаўнераў часу Напалеона III, колеру мундзіра, з белымі кантамі і значкам з белай бляхі з выявай дзвюх скрыжаваных пальмачак, што абрамляюць дзве літары W і G з арабскай лічбай 2 пасярэдзіне.

Колер светла-гранатавы (цёмна-блакітны) з срэбрам быў у той час афіцыйным колерам Міністэрства асветы, і настаўнікі гімназій абавязаны былі заўсёды насіць на ўроках фракі гэтага колеру з срэбнымі гузікамі.

На казырках фуражак абавязкова мела быць напісана друкаванымі залатымі літарамі прозвішча вучня і клас, у якім той вучыўся. Гэта было патрэбна дзеля кантролю пры частых арыштах шкаляроў на вуліцах за неаддаванне чэсці афіцэрам або за незашпілены на ўсе гузікі мундзір.

На Новым Свеце была крама Халявінскага з вучнёўскай адзежай. Недалёка ад рага Варэцкай у Вінярскага можна было купіць сшыткі і алоўкі. Па шапку трэба было выбрацца да Тучына на Падвале.

## Мундзір студэнта

Поўны камплект студэнцкага абмундзіравання быў немалы. Мемуарыст Казімеж Урачынскі скрупулёзны: значыцца — шапка з сінім лампасам, чорны шынэль з залатымі гузікамі з арламі, шэрая або чорная куртка. Святочны мундзір з каўнерам з залатым гафтам і такімі ж манжэтамі, а таксама чыноўніцкая шпага, віцэ-мундзір, а ўлетку афіцэрскага пакрою белы двубортны кіцель.

## Мяжа

У англійскіх правадніках Джона Мюрэя і нямецкіх Карла Бэдэкера XIX ст. вандроўнікі могуць знайсці шмат перасцярог што да Расіі. Аўтары раяць звяртаць увагу на таемную паліцыю («Службоўцы ў Расіі без выключэнняў шпіёны»), а перадусім пазбягаць любых гутарак на палітычныя тэмы і асабліва якіх-небудзь выказванняў наконт... Польшчы. «Кожнае ліберальнае прапольскае выказванне будзе данесена інспектару паліцыі ў Пецярбургу і безумоўна спрычыніць цяжкасці пават у выкананні найпрасцейшых фармальнасцяў». А ў 1839 г., калі выйшла першае выданне правадніка па Паўночнай Еўропе, царскія пашпартныя фармальнасці не адрозніваліся ад дзейных у іншых дзяржавах

кантынента. Адно з часам, з лібералізацыяй прадпісанняў у іншых краінах, кантраст стаў больш заўважным.

*

1888-ты. Траса Берлін — Варшава. На 404 кіламетры цягнік затрымоўваецца на станцыі Аляксандрава (Аляксандраў Куяўскі). Ад пасажыраў адразу патрабуюць пашпарты і забараняюць выходзіць з цягніка. Потым пачынаецца мытны кантроль. Уздоўж перонаў на роўнай адлегласці стаіць 8—10 жандармаў, якія вядуць паліцэйскі кантроль, замяняючы паліцэйскіх і гарадавых. Правяраюцца ўсе купэ, а пасажыраў забіраюць жандары і вядуць у вялікую залу (мытня) для рэвізіі багажу. За тымі, хто ўвайшоў, зачыняюць дзверы і прыстаўляюць двух жандараў.

Праз паўгадзіны цягнік рушыць у кірунку Варшавы.

*Азіяцкая традыцыя аддзяляцца кітайскай сцяной ад усялякай чужаземшчыны, а за гэтым ідзе ўскладненне прыходу ўсяму, што нясе праклятая Еўропа і цывілізацыя, — нялёгка вырвацца з яе палону, тым больш, што прагрэс у грамадстве, трыманым у жалезных абцугах царызму, ідзе павольна, чарапашым крокам,*

— каментуе Юзаф Пілсудскі.

Абавязак аховы межаў імперыі знаходзіцца ў Расіі ў руках «зялёнай дыкатэрыі агентаў і царскіх служак». Зялёныя, паводле колеру кантаў на шапках, плячах і рукавах сваіх мундзіраў, падзяляюцца на вайсковых і цывільных (т. зв. памежная ахова і мытнікі). Ім таксама дапамагаюць «блакітныя анёлы — ахоўнікі царызму» — жандары і паліцыянты. Абсяг іх дзейнасці — памежная паласа дзяржавы, падзеленая на тры лініі. Першая — адразу каля мяжы, другая — т. зв. лінія кардонаў (1—2 км ад мяжы) і нарэшце трэцяя — вынаходніцтва, нідзе не вядомае ў свеце — ахоплівае больш за сотні кіламетраў паласу зямлі ўнутры краіны. (У Каралеўстве толькі Сядлецкая губерня «вольная ад апекі зялёных, а палова Літвы ўваходзіць у сферу іх дзеяння».)

Першая лінія — гэта «першая перашкода для ўсяго, што насуперак расійскаму праву ўваходзіць на тэрыторыю бізунаўладнага («knutowładnego») гаспадара». Расстаўленыя на адлегласці ад 200 да 600 крокаў адзін ад другога жаўнеры з карабінамі пільнуюць, каб ніводная жывая істота, «натуральна, апроч птушак», не прайшла праз мяжу ні ў адзін, ні ў другі бок. Паблізу большых ці меншых мытняў памежная ахова «гусцее», і ўсё, людзі і іх пакункі, падлягаюць адпаведнай праверцы. Конныя патрулі другой лініі, прачэсваючы ўсе дарогі ў радыусе некалькі кіламетраў, ажыццяўляюць дадатковы кантроль. «Мяжа, спярэшчаная мытнымі каморамі, ашчэраная штыкамі і разрозненымі коннымі патрулямі, выглядае вельмі пышна, — піша Пілсудскі, — і мусіць напаўняць страхам кожнага, хто наважыўся насуперак царскім забаронам перасякаць яе сам ці з забароненым таварам».

Замежны пашпарт вельмі дарагі і дазваляе толькі адзін выезд за мяжу туды і назад. Жыхары памежжа маюць права на пропускі. Тыя выдаюцца на некалькі дзён ці тыдняў бясплатна, даюць права перасякаць мяжу неабмежаваную колькасць разоў і служаць за пасведчанне асобы на тры мілі ў другую дзяржаву. Дзеля адсутнасці строгага кантроля з боку Аўстрыі і Прусіі іх можна ўважаць замежнымі пашпартамі.

*Трэцяя памежная лінія, — піша далей Пілсудскі, — з'яўляецца адным з арыгінальных, найбольш своеасаблівых расійскіх інстытутаў, і ўводзіць кожнага еўрапейца ў прыніжальнае для Расіі здзіўленне; здзіўленне як ад знаходлівасці і брутальнасці расійскага ўрада, так і ад падатлівасці людзей, якія дазваляюць праводзіць над сабой самыя дзіўныя ў свеце эксперыменты.*

*— У нас бы гэтага людзі не сцярпелі! Не, у нас гэта было б непрымальна! — выгукнуў адзін немец, якога беспардонна правяралі на чыгуначнай станцыі за некалькі дзесяткаў кіламетраў да мяжы толькі таму, што «зялёным» яго твар падаўся падазроным.*

*Я адчуваў, што чырванею ад сораму. Немец меў рацыю — толькі няволя, толькі штодзённае прызвычайванне трываць усе капрызы ўлады можа жывіць такія выбрыкі і выдумкі царскіх чыноўнікаў, як трэцяя памежная лінія.*

Гэта была своеасаблівая легалізацыя адмысловага нагляду практычна на тэрыторыі ўсяго Каралеўства. На кожнай з чыгуначных станцый пасажыр мусіў быць гатовы да магчымага кантролю. Прывіслінская лінія, якая злучае Валынь і Украіну з Варшавай, хоць нідзе на сваім працягу не падступала мяжы, аднак цалкам аддадзена пад апеку зялёных. Альбо траса Варшава — Вільня, якая набліжаецца да мяжы пад Беластокам прыкладна на адлегласць 90 км. Ну і самі вакзалы — у Чанстахове, Коўне, Варшаве — «цікаванне з кутоў і касыя позіркі» робяць «дзіўнае дзікае ўражанне»...

Для тэрміновага выезду за мяжу патрабаваўся, згодна з загадам Камітэту па справах Царства Польскага ад 1868 г., не толькі (як і ва ўсім Царстве) пашпарт, які выдаваў сам губернатар, але таксама дазвол начальніка жандармерыі аб тым, што ён не бачыць перашкод для яго выдання. Выезд без пашпарта ці даўжэйшае, чым дазволена, перабыванне за мяжой маглі быць прычынай страты грамадзянскіх правоў, а пасля вяртання — ссылкі ў Сібір. Доўгае перабыванне за мяжой патрабавала «найвышэйшага дазволу» (рашэння цара) і спецыяльнага эміграцыйнага пашпарта за 100 рублёў.

Звычайны пашпарт згодна з цэннікам павінен каштаваць 15 рублёў 60 капеек, заўсёды трэба было ўлічваць і хабары.

Станіслаў Вакульскі — экс-бунтаўнік, былы палітычны вязень, карыстаўся пашпартам з штампам *бывший мятежник*.

## Мяшаныя сем'і

«Калі мы хочам даведацца, ці існуюць паміж людзьмі бар'еры і дзе праходзяць межы, то трэба ўважліва прыгледзецца да шлюбаў», — радзіў Таквіль.

У час Аляксандра I руку рускім аддавалі польскія арыстакраткі, у час Мікалая I ужо толькі збяднелыя шляхцянкі. У паскевічаўскі час блізкія сямейныя сувязі з рускімі сустракалі рашучы супраціў грамадства. Пасля паўстання 1863 г. шлюб з рускім быў гучнай здрадай патрыятычнай традыцыі.

*Пасля апошняга пералому за выняткам нешматлікіх «апошніх ахвяр», якія жывяць ілюзію, што, аддаўшы руку прадстаўніку расійскай улады, змогуць згладзіць удары, нанесеныя нацыі, шлюб бралі толькі жанчыны палітычна безадказныя,*

— пісалася.

Такой жа рашучай будзе Тарэса Татаркевічова: «Шлюб з рускім лічыўся двайной здрадай — рэлігійнай і палітычнай». А ўспамінаючы сваіх стрыечных сясцёр, якія выйшлі за рускіх афіцэраў, дадае:

*Дзе і як Уладыслава Макоўска і Янка Ардэнга пазнаёміліся з сваімі мужамі, ніхто з сям'і не ведаў і не хацеў ведаць. Уся сям'я парвала з імі ўсялякія кантакты.*

З 1836 г. існаваў закон аб мяшаных шлюбах, згодна з якім праваслаўная вера, вызнаваная адным з бацькоў, пераходзіць на дзяцей.

*Згодна з агульнымі правіламі, шлюб павінен даваць святар той царквы, да якой належаць нарачоныя, аднак у любым выпадку можна ўзяць шлюб і ў праваслаўнай царкве. Такі шлюб будзе не толькі дзейным, але дасць права разглядаць у царкоўным духоўным судзе справы развод заключанага такім чынам шлюбнага саюзу. Калі адзін з сужэнцаў праваслаўны, то вянчанне абавязкова павінен праводзіць праваслаўны святар, апрача гэтага, існуе прымус выхоўваць усіх дзяцей у праваслаўнай рэлігіі і звяртацца ў трыбунал таго самага вызнання для разводу.*

Паміж 1902 і 1911 гг. у Варшаве было заключана 1936 шлюбаў праваслаўных мужчын з каталічкамі і толькі 109 шлюбаў каталікоў з праваслаўнымі жанчынамі.

*

Расцэнкі (1873):
за акт нараджэння дзіцяці — 30 капеек;
за акт прызнання дзіцяці незаконнанароджаным — 90 капеек;

за акт шлюбу — 45 капеек;
за акт разводу — 12 рублёў.

## Обер-паліцмайстар

Галоўны начальнік Ратушы, часцей за ўсё вайсковец, былы жандар рангам не ніжэй за палкоўніка.

Пасада варшаўскага обер-паліцмайстра была ўведзена ў 1839 г. Адначасова з выдзяленнем паліцыі з магістрату горад быў падзелены на паліцэйскія акругі. Кампетэнцыі пасады обер-паліцмайстра вызначала пастанова Камітэта па справах Каралеўства Польскага, зацверджаная 22 ліпеня 1870 г., аднак абсяг яго ўлады пастаянна павялічваўся. Яму падлягалі паліцыйныя і следчыя справы, рэгістрацыйныя і пашпартныя, цэнзура, кантроль над аб'яднаннямі і забаўляльнымі імпрэзамі, пажарная ахова і шмат іншых ведамстваў. У 1900 г. заснаваная два гады да гэтага Спецыяльная канцылярыя пры памочніку Варшаўскага генерал-губернатара па паліцэйскіх даручэннях, якая выконвала разведвальна-следчыя функцыі, была ператворана ў Аддзел аховы парадку і грамадскай бяспекі ў горадзе Варшаве і падначаленая обер-паліцмайстру.

Спіс варшаўскіх обер-паліцмайстраў (фармальных намеснікаў гораданачальніка):

Грыгорый Уласаў 1866—1879;
Мікалай Бутурлін да 1884;
Сяргей Талстой да 1888;
Мікалай Клейгельс да 1896;
Карл Грэйсэр да 1898;
Аляксандр Ліхачоў да 1904;
Карл Нолькен — цяжка паранены ў бомбавым тэракце 26.03.1905;
Пётр Мэер да 1915.

*

Раптам па вуліцы пранясецца тройка коней, што цягнуць маленькі вазок. За ёй тры казакі галопам з высока ўзнятымі дзідамі. Гэта асабістая ахова паліцмайстара ў сталіцы забранага краю.

## Ордэны

У даўнейшай Польшчы ордэнаў не давалі. Толькі Аўгуст II увёў ордэн Белага Арла, а Станіслаў Аўгуст — св. Станіслава і крыж вайсковых заслуг *Virtuti Militari*.

У Расіі існавала ў той час восем ордэнаў: Св. Андрэя, св. Кацярыны, св. Аляксандра Неўскага, Белага Арла, св. Георгія (вайсковы), св. Уладзіміра, св. Ганны, св. Станіслава.

Ордэнамі маглі быць узнагароджаны:
чыноўнікі ўсіх дзяржаўных службаў;
члены замежных пануючых сем'яў;
дваранства;
іншаземцы за асаблівыя заслугі;
ганаровыя грамадзяне і купцы ў тым выпадку, калі ўжо валодаюць залатым медалём.

Да ордэна не маглі быць прадстаўлены ані мяшчане, ані сяляне. Вялікія князі пры хрышчэнні атрымлівалі ўсе ордэны, за выключэннем св. Георгія і св. Уладзіміра. Вялікія княгіні атрымлівалі пры хрышчэнні ордэн св. Кацярыны. Князі і княгіні царскай крыві, якія мелі тытул высокасці, атрымлівалі тыя самыя ордэны пры дасягненні паўналецця.

Прысуджэнне ордэна залежала ад манарха, які быў галоўным начальнікам, то бок вялікім магістрам усіх расійскіх ордэнаў. Фактычнае кіраўніцтва ордэнамі належала капітуле ордэнаў, якую стварыў імператар Павел і якая была рэфармаваная ў 1882 г.

## Паляк

Вось што пра яго пішуць расійскія газеты:

*Цень Дон Кіхота, апрануты — з дазволу начальства — у папугайскі кунтуш, жоўтыя боты і «кандратку» з кутасом. Пры боку парадная шабля (карабеля), а ў руцэ гітара, пры гуках якой ён заводзіць сэрэнады на тэму «Польшчы ў ранейшых межах», або танчыць мазурку ў рытме «Ешчэ Польшча не згінэла». Найлепш, каб у яго задняй кішэні быў кінжал і пакет з дынамітам, а за пазухай «Кароткі падручнік па ўчыненні змоваў». (Гэта задаволіла б, паводле Пруса, нават пана Каткова і яго духоўных нашчадкаў.)*

## Пансіёны для дзяўчат

Так было часцей за ўсё:

*Нехта звоніць у парадныя дзверы. Наша класная выбягае на калідор. Убачыўшы Іванова са світай, яна ўпускае з рук нейкі прадмет (напрыклад, парасон) — гэта сігнал схаваць усё польскае і выкласці на парты расійскія кнігі. Праз хвіліну ўваходзіць інспектар Іваноў разам з кіраўнічкай пансіёна Генрыкай Чарноцкай, сур'ёзнай, суровай — у чорнай, ядвабнай, доўгой, да зямлі, сукенцы і карункамі ў валасах. Уваходзіць таксама наша класная і садзіцца на сваім месцы. Інспектар займае кафедру. Настаўнік геаграфіі Віткоўскі стаіць перад мапай і выбірае больш пільных вучаніц, што добра валодаюць расійскай. Ён сам вельмі нервуецца, збіваецца: замест нямецкіх калоній у Афрыцы кажа — у Азіі, чырвоны, потны, з сваім заўважным жывоцікам, на які нацягнуты гранатавы фрак з пазалочанымі гузікамі. Мы ўсе з палёгкай*

*уздыхаем, калі ўрачыстае шэсце пераходзіць у наступны клас, і неўзбаве ўжо чуюцца развітанні, і парадныя дзверы зачыняюцца.*

Пансіён Ядвігі Сікорскай:

*Пудзіла ўсіх польскіх школаў: інспектар «у царскім мундзіры». Пра яго прыход на тэрыторыю пансіёна загадзя сігналізавалі маланкавыя эстафеты. Дзяжурная «класная дама» ababягала ўсе класы. Шэптам прамаўляла слова «інспектар». Імгненне пярэпалаху, раптоўная бледнасць дзяўчатак. А потым каманда настаўніцы: «Дзяжурная, збяры кнігі і нататкі ў мех!» Дзве дзяўчынкі абыходзілі клас з мяхамі, у якія мы складалі польскія нататкі, сшыткі, кнігі. Усё гэта заносілася ў ванны пакой. На сталах з'яўляліся расійскія падручнікі. Калі інспектар у суправаджэнні дырэктрысы ўваходзіў у клас, усё было ў парадку.*

*Былі прыдуманы розныя знакі, якія апавяшчалі пра інспекцыі. Часцей за ўсё — з увагі на бяспеку — без словаў. Ян Гарэвіч згадвае класную кіраўніцу ў пансіёне сваёй маткі, якая бегала па класах з паднятымі ўгору рукамі. Таксама старанна падбіраліся таемнікі (пад партамі і ў ванных пакоях звычайна правяралі).*

## Помнікі

«Przewodnik warszawski» 1869 г. рэгіструе наступныя помнікі:

Жыгімонту III Каралю Польскаму, на Замкавай плошчы;

палякам, загінулым у 1830 г., за вернасць праваму ўраду, на Саксонскай плошчы;

Кацярыне, Імператрыцы Усяе Русі, у Бельведэрскім парку;

імператару Аляксандру I, тамсама;

імператару Аляксандру I, Імператару Усяе Русі, Усмірыцелю Польшчы і Дабрачынцу, у Аляксандраўскай цытадэлі;

на памяць аб сутычцы расійцаў з польскімі паўстанцамі ў 1830 г., на Грохаўскім полі за Прагай;

і статуі:

Найсвяцейшай Панны Марыі, на Кракаўскім прадмесці;

св. Яна, на вуліцы Сенатарскай;

караля Польскага Сабескага, на мосце ў Лазенкаўскім парку;

астранома Мікалая Каперніка, на Кракаўскім прадмесці.

*

Успамінае Ядвіга Вайдэль-Дмахоўская:

*Невялікую прастакутную прастору псаваў доўгія гады ненавісны вачам кожнага паляка абеліск, пастаўлены на загад цара спачатку на Саксонскай*

*плошчы. На Зялёную плошчу яго перанеслі тады, калі было прынятае рашэнне збудаваць на Саксонскай плошчы не менш зненавіджаны Сабор. Пабудова гэтага абеліска ў самым сэрцы Варшавы была яшчэ большай жорсткасцю, чым усталяванне помніка Аляксандру I у Цытадэлі. З заслужаных для польскай справы генералаў, забітых у гарачцы першых гадзін паўстання 1830—1831 гг., зрабілі верных слуг царызму. Урачыстасць адкрыцця помніка прызначылі як на здзек на дзесятую гадавіну паўстання, 29 лістапада 1841 г. Духавенства, школьную моладзь прымусілі ўдзельнічаць ва ўрачыстасці, падчас якой было загадана спяваць «Боже, царя храни».*

На гранітнай падставе стаялі чатыры металічныя ільвы. Вакол ля падножжа абеліска блішчэлі геральдычныя двухгаловыя арлы звышнатуральнай велічыні. Надпіс быў такі: «Палякам, загінулым за вернасць свайму манарху».

*Ці памятаеце ля прыступак абеліска*
*Гэтых львоў целамі ў бронзе застылых,*
*Гатовых драпежным рухам скочыць,*
*Тых львоў, падобных да пякельных коней,*
*На якіх уварваўся гвалт на нашую зямлю?*
*Ці памятаеце гэтых чорных арлоў,*
*Што кіпцюрамі цэляць у вашы гнеўныя твары,*
*Калі на бронзавым чытаеце пастаменце:*
*«Верным дынастыі палякам»?*

— пытаўся Анджэй Немаеўскі.

Гэты «помнік ганьбы, манумент няволі» разабралі ў канцы зімы 1917 г. Ён аказаўся макетам з бляхі, памаляванай на зялёны колер, падробкай пад пакрытую пацінай бронзу. Верагодна, меркавалася адліць помнік з бронзы, але выдзеленыя на гэтую мэту грошы зніклі ў бяздонных кішэнях царскіх чыноўнікаў.

Піша Марачэўскі:

*Вянцом усёй кампаніі ўсмірэння Польскага Каралеўства было адкрыццё помніка Паскевічу, адбытае 3 ліпеня 1870 г. з вялікім парадам, у прысутнасці цара Аляксандра II. Помнік Паскевічу — пастаўлены ў скверы перад палацам намесніка на Кракаўскім прадмесці, то бок у месцы, на якім у 1830 г. планавалася паставіць помнік князю Юзафу Панятоўскаму, — меў быць і доўгія гады быў сімвалам бязлітаснага расійскага панавання на польскіх землях.*

## Праваслаўныя могілкі

**Месца на Волі, ужо сімвалічна звязанае з смерцю генерала Савінскага, выбраў сам Паскевіч. «Ні перад чым не спыняўся, каб толькі прынізіць нацыянальныя пачуцці пад'ярэмленага насельніцтва сталіцы». Першымі праваслаўнымі**



Помнік на Саксонскай плошчы «Палякам, палеглым у 1830 г. за вернасць праваму ўраду» (каля 1880 г.).

магіламі будучых кладоў былі брацкія магілы палеглых у штурме рэдута ў 1831 г. Касцёл святога Лаўрэна было вырашана перабудаваць на царкву Маці Божай Уладзімірскай, апякункі дня, у які была захоплена Варшава. У памяць бітвы 26 жніўня (7 верасня) 1831 г. у сцены касцёла былі ўмураваны 12 расійскіх гарматных дулаў з ядрамі, а ўнутры быў павешаны вялізных памераў падсвечнік, зроблены з гарматак і ядраў, на сценах былі змешчаны шэсць прадоўжных медных таблічаў з інскрыпцыямі, якія ўвечнілі ход бітвы і прозвішчы расійскіх афіцэраў, якія вызначыліся ў ёй.

Царква была асвечана з вялікай помпай і вайсковым парадам у дзесятую гадавіну штурму Волі. Таксама ў 1841 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё могілак. Да канца наступнага паўстання там было пахавана 16 352 чалавекі.

Уся плошча могілак была падзеленая на чатыры часткі. Найбліжэйшая да царквы была прызначана для пахавання памерлых генералаў і іх сем'яў, а таксама штабу і старшых афіцэраў, узнагароджаных ордэнам святога Георгія. Там таксама хавалі духавенства. У другім аддзеле — штаб, старшых афіцэраў і купцоў. У трэцім — адстаўнікоў, мяшчан і людзей меней заможных. У чацвёртым знаходзіліся агульныя магілкі. Іерархія строга захоўвалася.

На Волі былі пахаваныя, між іншым, Аляксандр Апухцін, Аляксандр Пузырэўскі, А. З. Мураўёў. Апошняга пахавалі там у 1842 г. на месцы меркавана-



Смерць генерала Савінскага (1831 г.).

га пахавання генерала Савінскага. Яго магіла паблізу касцёла была датуль мэтай шматлікіх патрыятычных паломніцтваў, і досыць адмысловым чынам хацелі пакласці гэтаму канец. Аднак безвынікова — з цягам часу жыхары Варшавы і гэтае месца пачалі трактаваць як месца пахавання Савінскага.

Калі гэтая магіла была раскрытая ў 1930 г., то знайшлі там астанкі толькі расійскага генерала.

На пачатку XX ст. варшаўскі архіепіскап Еранім Эгзэмплярскі выкупіў пляц, прылеглы да ўсходняй часткі некропаля, і пабудаваў там царкву святога Яна Клімака (Іаанна Лествічніка). Храм пабудавалі згодна з планам архітэктара Пакроўскага. Ён існуе да сённяшняга дня як адна з дзвюх варшаўскіх цэркваў. Могілкі таксама ацалелі, хоць большасць старых магіл, як кажа вартаўнік, «спляжана».

*

Расцэнкі на рытуальныя паслугі для грамадзян I класа (апрача жаўнераў, да яго належалі ўсе рускія жыхары Варшавы):

пахаванне са спевам — 1 рубель 80 кап.;

за ўладкаванне катафалка — 90 кап.;

за кожную свечку пры пахаванні — 10 кап.;

званенне на 1 раз, калі больш за 2 званы — 30 кап.;
за працэсію 1 класа з удзелам 6 конных — 51 рубель 60 кап.

*

Цана пляцу 5,25 аршына (8 локцяў) у залежнасці ад палажэння: найдаражэй — 150 рублёў, найтанней — 35.

## Праваслаўныя святы

Галоўныя сталыя праваслаўныя святы ў XIX ст.:

| Паводле календара | юльянскага | грыгарыянскага |
|---|---|---|
| Абразанне | 1.I | 13.I |
| Богаяўленне (Хрост) | 6.I | 18.I |
| Стрэчанне Гасподняе | 2.II | 14.II |
| Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы | 25.III | 6.IV |
| Свята Мікалая Цудатворцы | 9.V | 21.VI |
| Святых Апосталаў Пятра і Паўла | 29.VI | 11.VII |
| Перамяненне Гасподняе | 6.VIII | 18.VIII |
| Успенне Прасвятой Багародзіцы | 15.VIII | 27.VIII |
| Адсячэнне галавы Св. Яна Прадцечы | 29.VIII | 10.IX |
| Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы | 8.IX | 20.IX |
| Узвіжанне Крыжа Гасподняга | 14.IX | 26.IX |
| Пакроў Прасвятой Багародзіцы | 1.X | 13.X |
| Святой Маці Божай Казанскай | 22.X | 3.XI |
| Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы | 21.XI | 3.XII |
| Святога Цудатворцы Мікалая | 6.XII | 18.XII |
| Божае Нараджэнне | 25.XII | 6.I |

## Пячаткі

*Імем Найсвятлейшага Аляксандра II, Імператара і Самадзержца Усяе Русі, Караля Польскага, і г. д.*

*Адміністрацыйная рада Каралеўства.*

*Лічачы неабходным, каб афіцыйныя пячаткі, якія дагэтуль ужываліся дзяржаўнымі ўладамі і чыноўнікамі Аддзела ўнутраных спраў, акрамя*

*надпісаў польскай мовай мелі таксама надпісы расійскай, і з гэтай прычыны выявіўшы, што ўстаноўленая дагэтулешняя шырыня гэтых пячатак, роўная адной рускай цалі, недастатковая; Адміністрацыйная рада Каралеўства, на прадстаўленне Кіраўнічай камісіі Унутраных справаў і грунтуючыся на моцы Найвышэйшага дазволу, пастанаўляе:*

*Арт. 1. Павятовыя начальнікі, Магістраты гарадоў і чыноўнікі, якія знаходзяцца ў іх падпарадкаванні, на месца нададзеных ім пастановамі Адміністрацыйнай рады ад 20 ліпеня (1 жніўня) 1837 г. № 7868, 26 студзеня (7 лютага) 1860 г. № 16, 099 і 5 (17) жніўня 1865 г. № 15, 479, пячатак 3 класа, з надпісам на адной толькі польскай мове, надалей маюць карыстацца пячаткамі 2 класа, шырынёй у дыяметры 1,3 рускай цалі, з надпісамі на дзвюх мовах — расійскай і польскай.*

*Арт. 2. Выкананне дадзенай пастановы, якая ў «Dzienniku praw Królestwa Polskiego» мае быць змешчаная, даручаецца Кіраўнічай камісіі Унутраных справаў.*

*Дадзена ў Варшаве д. 17 лютага (1 сакавіка) 1867 г.*

## Ранг, альбо чын

У 1839 г. маркіз дэ Кюстын пісаў:

Чын — *гэта нацыя, падзеленая на палкі, гэта ваенны стан, на які пераведзена ўсё грамадства, і нават тыя яго класы, якія вызваленыя ад вайсковай службы. Гэта, адным словам, падзел усяго цывільнага насельніцтва на класы, якія адпавядаюць вайсковым званням. З той пары, як устаноўлена гэтая іерархія, чалавек, які ніколі не бачыў муштры, можа атрымаць званне палкоўніка.*

І далей:

*Пётр Вялікі... не прыдумаў нічога лепшага, як падзяліць статак, гэта значыць народ, на розныя класы, прычым прыналежнасць да асобных класаў не мае ніякай сувязі з прозвішчам асобнага чалавека, яго паходжання ці славы яго роду. І так, каб сын найбольшага вяльможы ў імперыі мог належаць да ніжэйшага класу, у той час як сын кагосьці з яго падданых можа быць узведзены ў адзін з найвышэйшых класаў, калі на гэта будзе воля імператара. Пры такім падзеле народу ўсякі атрымлівае месца з міласці гаспадара. Вось так Расія пераўтварылася ў полк з шасцідзесяці мільёнаў чалавек; во гэта і ёсць* чын — *найвялікшы твор Пятра Вялікага.*

*(...) Чын складаецца з чатырнаццаці класаў, прычым кожны мае асаблівыя прывілеі. Чатырнаццаты клас — самы нізкі.*

***Ніжэй за яго толькі прыгонныя сяляне, а адзіная ягоная перавага палягае ў тым, што ён складаецца з людзей, якіх мянуюць вольнымі. Іхная свабода ў тым, што іх нельга пабіць, бо той, хто ўдарыць чалавека гэтага класа, можа***

*быць пакараны паводле закона. Затое кожны, хто належыць да гэтага класа, абавязаны напісаць на дзвярах свайго дому нумар свайго класа, каб ніхто з вышэйшых класаў не памыліўся і не адчуў спакусы: той, хто пабачыўшы такую перасцярогу, ударыць вольнага чалавека, робіцца злачынцам і можа быць пакараны.*

*Чатырнаццаты клас складаецца з найніжэйшых дзяржаўных чыноўнікаў, кур'ераў, паштальёнаў і іншых падуладных, у чые абавязкі ўваходзіць перадача або выкананне загадаў вышэйшага кіраўніцтва; ён адпавядае званню унтэр-афіцэра ў царскім войску. Члены гэтага класа, слугі Царовы, не з'яўляюцца нічыёй уласнасцю і маюць пачуццё ўласнай годнасці; чалавечая годнасць, як ты ведаеш, гэта пачуццё, невядомае ў Расіі.*

*Класы* чыну *адпавядаюць вайсковым званням: вайсковая іерархія адлюстроўвае той лад, які заведзены ва ўсёй дзяржаве.*

Уся сістэма дзяржаўнай, цывільнай і вайсковай службы ўпісвалася ў адну схему, якая прадугледжвала 14 рангаў, па якіх маглі прасоўвацца чыноўнікі і афіцэры; прасоўванне іншым шляхам было немагчымае. Гэтая схема, названая «табелем аб рангах», з'явілася ў 1772 г., і дарма што яе пазней шмат разоў змянялі, праіснавала ажно да падзення царызму. Найвышэйшым цывільным рангам быў канцлер, наступны — рэальны таемны саветнік, таемны саветнік, рэальны стацкі саветнік і г. д., аж да ніжэйшага чатырнаццатага рангу калежскага рэгістратара. Вайсковыя рангі былі вызначаныя асобна для афіцэраў сухапутных войскаў і для флота, ад генерала-фельдмаршала да прапаршчыка і ад генерала-адмірала да мічмана. Дасягненне пэўнага цывільнага або вайсковага рангу давала права на атрыманне шляхецтва. Акрамя гэтага, існавалі яшчэ і чыны, то бок прыдворныя рангі: вялікі камергер, вялікі гофмайстар (маршалак двара), вялікі канюшы, вялікі камісар, вялікі падчашы, потым ніжэйшыя — маршалак двара, канюшы, лоўчы і іншыя. Прыдворныя рангі мелі нямецкую наменклатуру, а менавіта вялікі камергер — обер-камергер, канюшы — шталь-майстар, лоўчы — егермайстар. Выкарыстанне табеля аб рангах на практыцы стварыла пэўныя асаблівасці, на якія звычайна не звяртаюць увагі: напрыклад, што канцлер быў у Расіі не пасадай, але тытулам, які, зрэшты, вельмі рэдка даравауся. У сапраўднасці табель прадугледжваў, што паасобныя чыны азначаюць якраз-такі пасаду, але на практыцы вельмі хутка адбылося аддзяленне некаторых тытулаў ад пасадаў, тытулы ў пэўным сэнсе сталіся самастойнымі.

*

*Пастановы і прадпісанні строга рэгулююць узаемаадносіны чыноў. Напрыклад, радавым, унтэр-афіцэрам, добраахвотнікам (нават калі б былі дактарамі філасофіі ці права) нельга ні пры якіх абставінах наведваць тэатр, канцэрт ці публічны баль, рэстаран I або II катэгорыі, бо там могуць знаходзіцца афіцэры вышэйшага рангу (маюць чын, якога першым не стае). Калі б аднак нехта з гэтых ізгояў выбраўся «з ведама і з дазволу начальства»,*

*скажам, у тэатр, ён можа заняць месца толькі на галёрцы, ніколі ў крэслах або ў ложы, бо там ён мог бы сутыкнуцца з вышэйшым па рангу!*

*Калі афіцэр уваходзіць у рэстаран або кандытарскую, ніжэйшы па чыне мусіць у той жа момант выйсці, за выключэннем выпадкаў, калі старшы па званні дазволіць яму застацца. Афіцэрскія званні таксама ўзаемазвязаныя такімі абмежаваннямі. Карнет не можа, не смее сесці ў адным радзе або на адной лаўцы з капітанам, не кажучы ўжо пра генерала. Гэтая дробязнасць у захаванні рангаў назіраецца нават на могілках.*

## Расійкі

*Люблю рускіх жанчын,* — пісаў Тадэвуш Вянява-Длугашоўскі ў 1912 г. — *Праўда, я ніколі не меў з імі блізкіх адносінаў — але мне падабаецца іх шчырая пачуццёвасць. У нас сустракаюцца таксама надзвычай выпешчаныя жонкі чыноўнікаў і вайскоўцаў. Афіцэры асабліва заглядаюцца на мілыя «фігуркі». Мундзір робіць сваё, ну і афіцэр... сваё...*

## Расійскія раёны

Так гэта бачылі сучаснікі:

*Уяздоўскія Алеі і Лазенкі страцілі паволі выразна польскі даўнейшы характар. Там сустракаліся выключна сем'і расійцаў, нянькі ў какошніках і яскравых сукнях, якія вядуць адзетых у чаркескі касцюм расійскіх дзяцей. Чулася там пераважна расійская мова, а калі здаралася імпрэза або праваслаўнае свята, усе алеі, што вялі да цэркваў, поўніліся прыезджым расійска-літвацкім насельніцтвам.*

Акурат там, у гэтым арыстакратычным раёне Варшавы, здаралася сустрэць імператара на кані, у прыгожым мундзіры з ордэнамі, у шлеме з белым пер'ем у атачэнні генеральскай світы. Малады Хёсік (Hoesick) напіша аб асляпленні, якое ён тады перажыў, не меншым, чым у малога Гайнэ, калі той у Дзюсельдорфе пабачыў Напалеона...

Расійцы часцей за ўсё жылі ў двух шыкоўных паўднёвых раёнах: IX — ваколіцы Уяздоўскіх Алеяў і XI — Маршалкоўская — Ерусалімскія Алеі да Фільтраў або на Празе.

У 1868 г. на Маршалкоўскай жылі 22 расійцы — вышэйшыя чыноўнікі і вайскоўцы. Сярод гаспадароў дамоў былі тры расійцы. У васьмідзесятыя і дзевяностыя яны масава сяліліся на канцы Маршалкоўскай, у новых кватэрах з выгодамі, далей ад гандлёвага цэнтру.

Амаль што ўсе адміністрацыйныя функцыянеры займалі вялікія, раскошныя кватэры на другім паверсе, у дамах, дзе вышэй жылі сціплыя тубыльцы. На дзвярах іх кватэр часта былі відаць вялікія масянжовыя таблічкі з прозвішчам

жыхара. Звычайныя чыноўнікі не імкнуліся мець вялікія, шыкоўныя кватэры, разлічваючы на хуткае прасоўванне па службовай лесвіцы і пераезд у іншае месца працы. Яны, як піша Краўсгар, «сяліліся звычайна ў флігелях і вялі гатэльны стыль жыцця, прадбачваючы, што месца не нагрэюць і хутка яго пакінуць».

## Рублі і капейкі

У цытаванай у адной з газет прымаўцы: «Разбіваецца, як тры грошы ў мяшку», цэнзар выправіў «тры грошы» на «паўтары капейкі».

Расійскія грошы абарачаліся разам з польскімі да 1841 г., потым сталіся адзінымі плацежнымі сродкамі.

Срэбны рубель = 100 срэбных капеек (кошт асобнай кабінкі ў паравой лазні на Новым З'ездзе).

Апрача гэтага, у абарачэнні знаходзіліся:

імперыял (у золаце) = 10 рублёў;

паўімперыял (у золаце) = 5 рублёў;

палтыннік, палтына = 50 капеек (цана самага таннага пакоя ў гатэлі «Вікторыя»);

паўпалтыннік = 25 капеек;

двухгрывеннік = 20 капеек;

грывеннік = 10 капеек (цана маркі на ліст за мяжу, або галення);

пятак = 5 капеек;

алтыннік = 3 капейкі (цана адсылкі звычайнага ліста ў Варшаве);

капейка = 0,1 рубля;

*Деньги* = ½ капейкі;

палушка = ¼ капейкі.

Але, як выглядае, наймацней у чалавечай памяці трымаюцца набытыя ў спадчыну спосабы падліку грошай і кліканне Бога на дапамогу. Таму па-польску надалей лічылі ў злотых і грошах. І выглядала гэта так:

1 злоты = 15 капеек;

5 злотых = 75 капеек;

10 злотых = 1 рубель 50 капеек (дзіцячыя пантофлі);

20 злотых = 3 рублі (месячныя паслугі цырульніка для мужчын ў доме).

Вясковы люд і простыя людзі ў гарадах, перадусім кухаркі, лічылі толькі ў злотых. Гаспадыні разлічваліся з кухаркамі ў злотых і пералічвалі на рублі. Разлікі на большыя сумы рабіліся ўжо ў рублях.

У канцы XIX ст. былі ўведзеныя таксама манеты на 15 (новы імперыял) і 7½ (новы паўімперыял) рублёў, а таксама на 15 капеек і на 2 капейкі. Акрамя срэбных рублёў абарачаліся таксама рублёвыя асігнацыі і, пазней, крэдытныя рублі. Асігнацыі, гэта значыць асігнацыйныя рублі, друкаваліся на сіняй паперы (5 рублёў), чырвонай (10 рублёў) і белай (большай вартасці). Да таго ж, праз пепісьменнасць значнай часткі насельніцтва Варшавы (перапіс 1882 г. выявіў 42,8 % пепісьменных сярод мужчын і 55,4 % сярод жанчын), гэтыя банкноты

мелі вельмі характэрную для кожнага наміналa форму (квадрат, прастакутнік, прастакутнік з двума зрэзанымі вугламі і г. д.).

Найбольш распаўсюджанай польскай манетай была дзесяцігрошоўка (т. зв. «дыха»), шэрая манета з двухгаловым арлом (выведзеная з абароту ў 1885 г. пасля ліквідацыі Польскага банка). Дыху давалі вартаўніку за адчыненне брамы, за дыху ездзілі амнібусам з Плошчы Красінскіх на Плошчу Трох Крыжоў. Чатыры дыхі трэба было звычайна даць за паездку вазніцу.

Афіцыйныя расцэнкі (за гадзіну язды):

Аднаконныя экіпажы ад 7 раніцы да 12 ночы — 20 капеек;
ад поўначы да 7 раніцы — 35 капеек;

Двухконныя экіпажы — адпаведна 25 і 40 капеек;

Трамваі — ад 3 да 7 капеек;

2 рублі за гадзіну язды на машынах, якія з'явіліся на пачатку XX ст.

*

Адлегласці вымяраліся ў вёрстах, сажнях, аршынах і цалях. Жэцкі вылічае вёрстамі адлегласці ў вугорскай кампаніі. Вакульскі ў квадратных вёрстах падае плошчу Парыжа.

Мерамі вагі былі фунты, лоты, залатнікі, ідалы. Вадкасці, акрамя штофаў, былі ў вёдрах, гарнцах, *четвертях* і *четвертинах*.

1 фунт хлеба каштаваў каля 4 капеек;
1 пуд мукі — 1,79 рубля;
корац бульбы — каля 4 рублёў;
1 фунт мяса — каля 15 капеек;
гарнец (4 л) малака — 32 капеек;
1 фунт гарбаты — каля 4,5 рублёў;
1 фунт цукру — каля 7 капеек;
10 яек — каля 20 капеек;
1 *четверть* (больш за 100 кг) вугаля — каля 17 рублёў.

## Рускі клуб

**Новы Свет, 65.**

***Мае бальную залу, кегельбан, цір, залы для більярда. Ладзіць вечарыны, балі, рускія аматарскія прадстаўленні, канцэрты, чытанні. У аўторкі прысутным іграе вайсковы аркестр.***

***Калі хто жадае ўступіць у клуб, то павінен быць прадстаўлены двума сталымі членамі і прайсці працэдуру балатавання. Члены ўносяць 25 рублёў за першы год і 15 за кожны наступны. Члены часам плацяць 6 рублёў за два месяцы, госці, прыведзеныя ў клуб, плацяць 25 капеек за асобу.***

***Клуб адчынены з 10-й раніцы да 2-й гадзіны ночы. Тыя, хто застаюцца даўжэй, плацяць штраф за кожную пераседжаную гадзіну. Толькі ў дні баляў можна заставацца ў залах яшчэ гадзіну пасля ад'езду дам. У 5 раніцы залы зачыняюцца.***

*Рускі клуб узнік тут пасля пэўных падзеяў зусім не з таварыскімі, а з палітычнымі мэтамі. Ён меўся быць цэнтрам рускага жыцця ў Варшаве, агменем русіфікацыі, галоўнай стаўкай захопніцкай арды. Заснаваны ў час графа Берга, які вельмі неахвотна згадзіўся з яго адкрыццём і глядзеў на яго заўсёды недаверліва, размешчаны ў былым палацы Анджэя Замойскага на Новым Свеце, Рускі клуб адыграў значную ролю падчас Кіраўнічага камітэта, у час Чаркаскага, Мілюціна і Самарына. Там адбываліся канфідэнцыйныя нарады нашых арганізатараў, там у сяброўскай гутарцы абгаворваліся вялікія крываджэрныя планы, акурат адтуль урэшце выходзілі лозунгі і падалі самыя гучныя бомбы. У гэтым клубе прымалі ў 1867 г. чэхаў, якія кіраваліся ў Маскву, у ім адбыўся баль для імператара Аляксандра II, які вяртаўся з Парыжа пасля замаху Беразоўскага, у ім ладзіліся шумныя абеды і прамаўляліся ўсе тыя гучныя прамовы, развітанні і тосты ў гонар арганізатараў, што ад'язджалі з Каралеўства Польскага. З цягам часу ён пачаў страчваць сваю місійную скіраванасць і ператварыўся ў просты дом гульняў і месца сходак.*

*Рэстаратар даваў напавер, віны былі добрыя, гарэлка дасканалая, нясплата карцёжных даўгоў каралася не так востра, як у іншых клубах, таму туды спяшаліся і чыноўнікі, і чыноўнічкі, хутчэй каб пагуляць, а не пабалакаць аб палітыцы.*

## Самавар

Пад датай 23 траўня 1888 г. Стэфан Жаромскі напісаў:

*Будуючы помнікі і манументы, маскалі заўсёды трымаюцца адной ідэі — строга нацыянальнай: надаюць ім форму самавара. Няма нічога больш пасрэднага за ідэю помніка пад Грохавам. Арлы здалёк выглядаюць як ручкі самавара; высокая шыя і наверсе прылепленая, быццам таблетка са снегу, купал, што нагадвае чайнік, — вось і ўсё.*

## Свабода

*Я бачыў свабоду ў Варшаве*
*(Кажу вам, гэта не казка).*
*Бегла яна па Маршалкоўскай,*
*Размахваючы нагайкай.*

*Крычалі: «Во канстытуцыя,*
*Святлейшая за свечку вялікую».*
*Хацеў прыгледзецца лепей —*
*Дагэтуль баліць мне спіна.*

(Антоні Арлоўскі (Krogulec), Уладыслаў Бухнер (Ner-Buch))

*

На цокалі, складзеным з касцей і чарапоў, на наваленых у высокую кучу шкілетах стаіць выпрастаны царскі чыноўнік у мундзіры з нагайкай. Подпіс: «Апафеоз свабоды». (Малюнак у кракаўскім часопісе «Diabeł» з снежня 1905 г.)

## Старынкевіч

Пахавальная працэсія рушыла з сабору на вуліцы Доўгай і ішла плошчай Красінскіх, Мядовай, Сенатарскай, Замкавай плошчай, а потым Электаральнай, Халоднай, Вольскай на праваслаўныя могілкі. Пахаванне адбылося на плошчы перад царквой пры натоўпах народу.

Ва ўзросце 82 гадоў у жніўні 1892 г. памёр Сакрат Старынкевіч, расіец, гораданачальнік Варшавы, «Наш прэзідэнт», як пра яго казалі на працягу шаснаццаці гадоў жыхары сталіцы. Дзякуючы сваёй сумленнасці і справядлівасці, лаяльным паводзінам і рэальным заслугам перад горадам ён здабыў давер і сімпатыю. «Чысты, незаплямлены, сцярог гарадскі грош як Цэрбер і не дазваляў растрэнькаць». Урэшце паспрыяў правядзенню каналізацыі (1883—1886), што было асабліва цяжка, з увагі на неабходнасць зацвярджэння планаў у Пецярбургу. Там не бачылі прычын для пабудовы гэткіх шыкоўных камунікацый у такім трэцярадным горадзе, як Варшава, паколькі іх не было ў расійскай сталіцы. Старынкевіч дамогся свайго. Таксама ён увёў у Варшаве конку, падпісаў дамову з Газавым таварыствам. Яго ініцыятывай было частковае ўпарадкаванне берагоў Віслы і далучэнне некаторых прадмесцяў да горада.



Сакрат Старынкевіч.

Пасля ягонай смерці карэспандэнт пецярбургскай газеты «Новае Время» назваў яго чалавекам «з прытупленым расійскім нацыянальным пачуццем», які ўгледжваў шавінізм у шматлікіх абгрунтаваных патрабаваннях расійскай нацыянальнасці і мала дбаў «пра захаванне расійскіх помнікаў у Варшаве».

Нягледзячы на такую кепскую рэпутацыю сярод сваіх, Антоні Залескі назваў яго толькі «абваршаўленым», ніколі «апалячаным» — гэта было б «фальшам вялікім і псіхалагічнай неадпаведнасцю». «Асімілятар» — вось як яго найтрапней называлі.

## Суды

Уявім сабе такую сцэну: следчы суддзя, вельмі часта радавіты паляк, які цяжка, з вялікім акцэнтам гаворыць па-расійску, дапытвае на гэтай мове абвінавачанага, польскага селяніна, які не разумее ніводнага слова з таго, што кажа суддзя. Таму на сцэне з'яўляецца перакладчык. На яго пытанні падсудны адказвае па-польску. Перакладчык перакладае словы падсуднага на расійскую, хоць гэта зусім непатрэбна. І гэтак адбываецца з кожным пытаннем і адказам, бо ані суддзю, ані падсуднаму нельга гаварыць па-польску. Далей пракурор абвінавачвае, а адвакат бароніць падсуднага мовай, якой той зусім не разумее.

З ліпеня 1876 г. у судах пануюць прадстаўнікі «расійскай юстыцыі». Будынкі пышныя, усходняе ўбранне, поп з тэкстам прысягі.

Пры ўвядзенні судовай рэформы быў прыняты прынцып, што сярод суддзяў палова мае быць палякамі, а палова расійцамі. Гэта была відавочная фікцыя, палякі сістэматычна выдаляліся з пасадаў у Міністэрстве юстыцыі.

*Праз 35 гадоў, — піша Аляксандр Краўсгар, — у складзе Акруговага суда застаўся толькі адзін паляк. У Судовай палаце, у сваю чаргу, не засталося ніводнага. Нацыяналістычны ўгар дайшоў да такога шаленства, што паляку нельга было ўжо нават належаць да складу судовых стажораў-юрыстаў.*

Паляк, які скончыў юрфак у расійскім універсітэце, нават з залатым медалём, не мог даслужыцца да пасады вышэй за малодшага сакратара суда. Той, хто хацеў прасоўвацца вышэй, быў вымушаны выязджаць далёка ў Расію, за Урал і далей.

Чым ніжэйшы ўзровень службы, тым большая колькасць задзейнічаных на ёй палякаў. Яны займалі пасады ў канцылярыі, намочнікаў сакратароў, касіраў. У 1897 г. у абодвух судах першай інстанцыі (акружным і гандлёвым) на пасадах членаў суду, пракурораў, судовых сакратароў і іх намочнікаў было 44 расійцы і 16 палякаў (прычым яны цалкам адсутнічалі ў групе пракурораў). У другой варшаўскай судовай інстанцыі у міравым з'ездзе (Zjeździe Pokoju) не было ніводнага суддзі-паляка на 25 расійцаў.

Краўсгар даў ім недвухсэнсоўную характарыстыку:

*Асобы разбэшчаныя, чыноўнічага тыпу, якія праводзяць ноч у такіх прытонах, як* Château des Fleurs, *п'яныя валяюцца на тратуарах і ўцягваюцца ў вулічныя авантуры.*

Ён прызнае, што часам здараліся выключэнні...

*Адносна ўраўнаважаныя, больш еўрапейскія, але ставяцца да сваёй прафесіі як да пасады, што дае даход і прыступку ў кар'еры. Такую асобу не злучала з забітым насельніцтвам разуменне яго патрэбаў, звычаяў, гістарычных традыцый. Гэткі прадстаўнік юстыцыі паглядаў на падсудных звысок, праз плячо, лічачы сябе апосталам сваёй вялікай радзімы ў адносінах да бунтаўнікоў ілотаў.*

І нават калі больш асвечаныя суддзі-расійцы разумелі, наколькі рызыкоўнае, а нават і бессэнсоўнае «прышчапленне расійскіх саджанцаў на грунт мясцовых адносінаў», яны не стасавалі гэтага да міравых судоў. Там, дзе суддзя ўступаў у непасрэдны кантакт з мясцовым насельніцтвам, дзе мог непасрэдна ўплываць на яго, вучыць «павазе да прадстаўнікоў расійскай юстыцыі, падрываць забабоны адносна маскалёў, прызвычайваць да іх тыпа мыслення і дзеяння», ім даводзілася карыстацца ўласнымі кадрамі.

Мясцовае насельніцтва ўспрымала міравыя суды як аддзел цывільнай паліцыі, а называла іх — «моравыя».

«Панёс позву міравому (суддзю)», — адказвала вартаўнічка на пытанне, дзе муж. Або: пайшоў ва ўчастак. У паўсядзённай гаворцы з'яўляецца ўсё больш расійскіх словаў, а таксама юрыдычных тэрмінаў. Польскія: *pozew*, *wezwanie*, *wyrok*, *skarga*, паволі замяняюцца чужынскімі: *иск*, *повестка*, *решение*, *жалоба*.

У правінцыі здараюцца частыя выпадкі, калі ў турму садзяць на некалькі тыдняў за перагароджванне дарогі, за неўпусканне ў кватэру, зачыненую на час адсутнасці гаспадара, за адабранне стрэльбы ў афіцэра, які без дазволу страляў у лесе, за штуршок або наўмыснае несаступанне дарогі, за ежу ці пітво ў рэстаране, піўной. Гэта разбэшчвае паліцыю і заахвочвае суды выносіць прадузятыя і неадэкватныя рашэнні, у тым ліку і ў больш сур'ёзных справах.

Расійцаў, што «адзначыліся» ў Варшаве, узнагароджвалі пераводам на вышэйшыя пасады ў Расіі, дзе яны сутыкаліся з вялікімі непрыемнасцямі, калі ўжывалі метады, што былі дазволеныя ў Прывісленні. Архіярэй Лявонцій, пераведзены ў Маскву на пасаду мітрапаліта, так быў зненавіджаны, што яго труну на вуліцы падчас пахавання абкідалі брудам.

*

*Найвысачэйша зацверджаная пастанова Камітэта міністраў аб змене на летні час формы мундзіраў судовых чыноўнікаў.*

*Камітэт міністраў, разгледзеўшы прапанову Міністра юстыцыі аб змене на летні час формы мундзіраў судовых чыноўнікаў, палічыў патрэбным: 1) судовым*

*чыноўнікам дазволіць насіць улетку, калі цёпла, пры выкананні службовых абавязкаў, улучна з судовымі паседжаннямі, двубортныя сурдуты з тканіны суровага колеру паводле ўзору сурдута для цывільных чыноўнікаў (Арт. 20 дадатак да арт. 525 т. III Законы служб. урадавыя, выд. у 1876) з адкладным каўнерам і металічнымі гузікамі з сенацкай пячаткай і такога ж колеру палатняныя нагавіцы і камізэльку. 2) Усе, хто бярэ ўдзел у паседжанні, павінны насіць адзежу з тканіны аднолькавага колеру. 3) Пару года, калі дазволена насіць летнюю адзежу, акрэсліваюць судовыя ўлады, створаныя на падставе Судовых законаў ад 20 лістапада 1864 г., у спецыяльных інструкцыях; але для судовых уладаў ранейшай арганізацыі акрэсліваецца паводле прадстаўлення міністра юстыцыі.*

*Найсвятлейшы гаспадар 18 чэрвеня 1882 г. пастанову Камітэта зацвердзіць пажадаў.*

## Сцягі

Найвышэйшы загад, абнародаваны Міністрам унутраных справаў аб сцягах, якія аздабляюць будынкі падчас урачыстасцяў.

*По Всеподданейшему Министра Внутренних Дел докладу Государь Император в 28 день апреля 1883 г. высочайше повелел соизволить: чтобы в тех торжественных случаях, когда признается возможным дозволить украшение зданий флагами, был употребляем исключительно русский флаг, состоящий из трех полос: верхней — белого, средней — синего и нижнего красного цветов.*

Выкарыстанне замежных сцягоў дазвалялася толькі на будынках, занятых замежнымі консульствамі і пасольствамі, а таксама лічылася патрэбным аздабленне дамоў нацыянальнымі сцягамі, калі ў імперыю прыбывалі члены пануючых дынастый і ўвогуле ганаровыя прадстаўнікі адпаведных дзяржаў.

## Табельныя дні

*Табельные дни*, ад *табеля* — спісу ўрачыстых дзён, звязаных з пануючай дынастыяй.

Падобна таму, як кніжкі для набажэнства павінны былі ўключаць малітву да цара, так і календары друкавалі ўсе (каля пяцідзесяці) праваслаўныя святы. З заўвагай: якія «спраўляюцца шляхам набажэнства ў царкве і звальнення вучняў ад заняткаў» (гэтулькі святаў, колькі іх мела расійская школа ў Польшчы, не было нідзе болей у свеце), і, у свой чарод, якія «спраўляюцца толькі пры дапамозе набажэнства» (прапорцыя 1:4).

У *табельныя дні* начальства вядзе ўлік прысутных пад пагрозай адказнасці за нез'яўленне ў царкве.

У Варшаўскім інфармацыйна-адрасным праваднiку Віктара Дзержаноўскага на 1869 г. спіс *табельных дзён* быў прадстаўлены наступным чынам:

*Студзень. 13 (1) дзень, рускі Новы Год і гадавіна нараджэння яго Царскай Высокасці Вялікай Княгіні Алены Паўлаўны і Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Аляксея Аляксандравіча.*

*Сакавік. 3 (19) лютага, гадавіна ўступлення на Трон Яго Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшага Аляксандра II Мікалаевіча.*

*10 дзень (26 лютага). Дзень Нараджэння Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Аляксандра Аляксандравіча, Наступцы Трону.*

*Красавік. 29 (17) дзень, Дзень Нараджэння яго Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшага Аляксандра II Мікалаевіча і Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Мікалая Міхайлавіча.*

*Жнівень. 3 (22) дзень, імяніны Яе Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшай Марыі Аляксандраўны і Яе Царскай Высокасці Вялікай Княгіні Марыі Фёдараўны, Жонкі Спадкаемцы Трону, Іх Царскіх Высокасцяў Вялікай Княгіні Марыі Аляксандраўны і Вялікай Княгіні Марыі Мікалаеўны.*

*8 (27 ліпеня) дзень, Дзень Нараджэння Яе Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшай Марыі Аляксандраўны, а таксама Дзень Нараджэння і Імяніны Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Мікалая Мікалаевіча Малодшага.*

*Верасень. 7 (26 жніўня) дзень, гадавіна Каранацыі Яго Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшага Аляксандра Мікалаевіча і Яе Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшай Марыі Аляксандраўны.*

*11 (30 жніўня) дзень, імяніны Яго Царска-Імператарскай Вялікасці Найсвятлейшага Аляксандра II Мікалаевіча і Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Аляксандра Аляксандравіча, Спадкаемцы Трону, і Яго Царскай Высокасці Вялікага Князя Аляксандра Міхайлавіча, а таксама Дзень Нараджэння Яе Царскай Высокасці Вялікай Княгіні Вольгі Мікалаеўны, Жонкі Яго Каралеўскай Вялікасці Караля Віртэмберскага і Свята Ордэна св. Аляксандра Неўскага.*

*Лістапад. 26 (14) дзень, Дзень Нараджэння Яе Царскай Высокасці Вялікай Княгіні Марыі Фёдараўны, Жонкі Спадкаемцы Трону.*

*

У гэтыя дні апрача школаў не працавалі таксама дзяржаўныя органы, а войска ў парадным форме выходзіла на вуліцу. Дамы ўпрыгожвалі трохкаляровымі сцягамі, а вечарам былі абавязковыя ілюмінацыі, «якія павінны былі выказваць вернападданніцкія пачуцці». Стварэнне т. зв. урачыстай светлавой дэкарацыі ўваходзіла ў задачы вартаўніка. Ён быў абавязаны ў «спецыяльных канаўках расставіць аднаведную шырыні фасада дома колькасць каганцоў, якія мусілі гарэць, капціць і смярдзець вызначаную колькасць гадзін». Падобныя «гаршкі з лоем і кнотам» вешалі на напятым уздоўж сценаў дроце альбо на ўбітых у сцяну круках (засталіся яшчэ на муры палацу Астрожскіх) на вышыні першага паверха. Такім чынам ствараліся ініцыялы паруючых асобаў. Адной з любімых забаваў дзятвы было гашэнне гэтых ліхтароў. У кожным акне з боку вуліцы павінны былі гарэць хаця б дзве свечкі.

З часам каганцы ў канаўках саступілі месца ліхтарам з каляровага шкла,

дзе гарэла лоевая ці найменшых памераў нафтавая лямпачка. Гэтыя лямпачкі вешаліся на паўтара метра ад зямлі на дроце, нацягнутым у гэты дзень паміж нафтавымі ці газавымі вулічнымі ліхтарамі, альбо паміж дрэвамі.

Ілюмінацыя адміністрацыйных будынкаў забяспечвалася камбінацыяй газавых ліхтароў, якія ўтваралі царскую карону, а таксама манаграмы найвышэйшых апекуноў канкрэтнага свята. «Часта нядобранадзейны вецер так бесцырымонна торгаў гэтыя ліхтарыкі, што глядач бачыў перад сабой толькі якісьці мітуслівы танец агеньчыкаў».

*

У галоўныя табельныя дні паліцэйскія прадпісанні забаранялі пахаванне нябожчыкаў.

## Участак

Асновай паліцэйскай улады былі гарадскія ўчасткі, падначаленыя прыставам. Ніжэйшую ступень у службовай іерархіі займалі *околоточные*, званыя яшчэ «сальцісонамі», пасля звычайныя паліцэйскія (*городовые*). Былі яшчэ жандары і найбольш небяспечныя — «філёры», паліцэйскія агенты ў цывільным. Фактычна найніжэйшымі супрацоўнікамі паліцыі ў горадзе былі хатнія вартаўнікі і гарадскія начныя ахоўнікі, аплачваныя ўладальнікамі будынкаў (першыя) і магістратам (другія), аднак насамрэч падпарадкаваныя непасрэдна пастарунку.

Вартаўніка ўвечнілі на сваіх палотнах Фалат і Падкавінскі. Ён насіў блакітную блузу, белы фартух, доўгія боты і вялікую шапку з лакаваным брылём, якую ўпрыгожвала вялікая бляха з рускім надпісам, які акрэсліваў сацыяльны стан яе ўласніка, участак, вуліцу і нумар дома. Яго абавязкам было збіраць грунтоўныя веды пра жыццё людзей, якія пражывалі на ўчастку. Пра тое, каго прымаюць у гасцях, ён даведваўся непасрэдна, так што ніхто не мог зайсці ці выйсці з дома незаўважаным. Ніхто не меў ключа ад уваходнай брамы. Кожны раз званілі вартаўніку.

Да 1892 г. Варшава была падзелена на 10 паліцэйскіх участкаў, пры гэтым тры з іх мелі двайную нумарацыю: I і XI — «Замкавы», II і III — «Саборны», V і VI — «Паванзкоўскі», што фармальна павялічвала лічбу ўчасткаў да дванаццаці. У 1892 г. другі член гэтай падвойнай нумарацыі быў нададзены тром наваўтвораным участкам, у выніку парадкавая лічба дванаццаці ўчасткаў ужо адпавядала фактычнаму стану. Гэта былі: I «Замкавы» (вул. Падвале, 15), II «Саборны» (вул. Свентаерска, 18), III «Мастоўскі» (вул. Навалінкі, 42), IV «Бялянскі» (вул. Мураноўска, 12), V «Паванзкоўскі» (вул. Дзельная, 33), VI «Тавароны» (вул. Хмельная, 134), VII «Вольскі» (вул. Хлодна, 11), VIII «Ерусалімскі» (вул. Тварда, 5), IX «Лазянкоўскі» (вул. Круча, 21), X «Навасвецкі» (вул. Кракаўскае Прадмесце, 1), XI «Макатоўскі» (вул. Маршалкоўска, 71) і XII «Пражскі» (вул. Тарговa, 33). Гэты падзел пратрываў (з пэўнымі зменамі адрасоў іх канцылярыі) аж да 1907 г.

*

У шасцідзесятыя гады ўсе аб'екты нерухомасці ў Варшаве ў межах вуліц атрымалі новыя нумары, названыя назвай паліцэйскімі. Непапулярны нумар 13 часта замянялі нумарам 11а.

## Хабары

Той гамбургскі яўрэй, які некалькі дзесяткаў гадоў таму прапаноўваў, каб яму палякі падкінулі, а ён у Пецярбургу вырашыць як мага больш пазітыўна нашае пытанне, не быў хіба што такім вар'ятам, якім яго ахрысцілі.

Хабарніцтва расійскіх чыноўнікаў — іх «чыста радзімы знак». Сакрэт Палішынэля, настолькі штодзённы і распаўсюджаны звычай, што гавараць аб ім стала натуральна, як аб *malum necessarium*, якому ўжо не дасі ніякай рады.

Баранеса XYZ навучала сяброўку:

*Няма такой справы, якой бы ў гэтай краіне нельга было б вырашыць пры дапамозе грошай. Самае неймаверпае становіцца рэальнасцю, самая фантастычная мара ўвасабляецца ў жыцці... У нас з гэтага глядзішча карупцыя абсалютная, дэмаралізацыя грамадства вялікая, і сёння кожны, ад простага селяніна да самага інтэлігентнага грамадзяніна, часткова бярэ віну на сябе, шукаючы прынамсі шляху ратунку і абароны.*

Хабары былі розныя, розныя былі і спосабы іх прыняцця. Наўпрост — «з рукі ў руку», з пытаннем — як той пецярбургскі вяльможа: «Ці вы з Ламанскім прыйшлі?» (подпіс «загадчыка касы» на сторублёўках). Прымалі хабары праз пасярэдніцтва адмысловай асобы, альбо проста цынічна кажучы: «Калі дасцё, тады і зробім...».

Форма перадачы хабару і памер сумы залежалі ад пасады. Камісару паліцыі належала ўкласці банкноту ад 5 да 10 рублёў у канверт разам з заявай ці лістом альбо пакінуць незнарок чысты канверт на стале (10 рублёў — раўнавартасць двухмесячнага заробку тэлеграфіста, трох пар чаравікаў альбо двух тузінаў ручнікоў, двух сутак у добрым гатэлі, чатырохтомнай Трылогіі [Сянкевіча] у цвёрдым пераплёце, 2000 вёдзер моцнага (дубальтовага) піва). З начальнікам павету землеўладальнік удаваў таварыскія дачыненні і пры патрэбе прайграваў яму ў карты не менш за 25 рублёў. За прызначэнне дырэктарам гімназіі начальнік Канцылярыі Навучальнай акругі браў 1500 рублёў (г. зн. чвэрць гадавога заробку мэра горада!).

Былі такія, хто не браў грошай, задавольваючыся тысячай больш каштоўных знакаў увагі: прэзентамі, памысным паляваннем, шыкоўнай вячэрай з вустрыцамі і шампанскім (гэтае спалучэнне было тыпова расійскім). Асобную групу хабарнікаў складалі т. зв. *Śniadańkowicze*, або сталаўнікі. Іх трэба было частаваць, быць з імі запанібрата, паліваць, прымаць. Усё гэта адносілася на конт «дружбы». Аднак найгоршымі, найбольш небяспечнымі былі пазычальнікі. Гэтая форма хабару падаецца найбольш агіднай.

Гэтым словам не акрэслівалі праяваў ветлівасці ці ўдзячнасці — ганарараў за аказаныя паслугі ці даброты. Вясковец ахвотна адорваў падводай бульбы ці капусты загадчыка і экспедытара найбліжэйшай чыгуначнай станцыі і начальніка пошты, гэтаксама як удзячны пацыент — мастацкай фігуркай ці абразком свайго лекара. Падобны характар мелі формы ўдзячнасці ў залатой ці срэбнай манеце, пакінутыя памочнікам начальнікаў канцылярый пры падпісанні актаў.

Апроч аднаразовых, выпадковых «перадач», шмат якім пасадам і органам было прынята плаціць пастаяннымі штогадовымі, паўгадавымі, месячнымі хабарамі, быццам абавязковым падаткам на карысць чыноўнікаў — паліцэйскім, падаткавікам, зборшчыкам акцызаў, губернскай управе, павятовай...

Не ўсе чыноўнікі мантачылі хабары на штодзённыя выдаткі, былі такія, якія іх капіталізавалі. Як у той час гаварылася: *хорошие деньги нажил.*

*Такі пазней пакідае горад і краіну, едзе на Літву альбо ў забраныя правінцыі, дзе, карыстаючыся з ільготаў для рускіх, якія набываюць у палякаў маёнткі, ды ўрадавую дапамогу, ператвараецца ў абывацеля.*

«*Гэта вельмі няпэўныя людзі, можаце мне верыць,* — кажа спадарычна Энгельгарт з Кёнігсберга, гераіня «Чарадзейнай гары» Мана. — *Бачыла калісьці аднаго з іх, меў такія чарнявыя бакенбардзікі і такі чырвоны быў з твару... Усе бяруць хабары і п'юць гарэлку... Толькі для прыліку загадаюць падаць сабе што-небудзь пад'есці, пару грыбкоў у марынадзе альбо кавалак асятра, і п'юць пры гэтым проста неміласэрна. І гэта называюць закускай...*»

## Царква

У панараме Варшавы з боку Віслы відаць некалькі залатых плямаў — найбольш выразна вежы кафедральнага сабора на вуліцы Доўгай, а таксама дамінуючыя над горадам купалы новай царквы, узведзенай у 1894 г. на Саксонскай плошчы, «ззяючай сваёй пазалотай промнямі на дзесяткі вёрст».

*Праваслаўны, ці, як звычайна кажуць,* русский собор, — чытаем у «Варшавском Дневнике», — *сведчыць усім і кожнаму, што тут пануе Расія, што яна лічыць гэты горад, гэтую мясцовасць сваёй неаспрэчнай спадчынай, што тут нават не можа быць размовы аб ніякіх надзеях, што Расія адступіцца або вырачыцца правоў, якія ёй належаць...*

Над будынкам пазалочаныя купалы, «аднак, на дзіва, золата не хоча на іх трымацца — увесь час чарнее». Зларадныя людзі цвердзяць, што золата асядае ў кішэнях *смотрителей здания*. Кажуць, што слаўны набожны прарок, манах Іоан Кранштацкі, прадказваў, «што калі ў гэтым саборы пачнуцца набажэнствы, — Расія падзе». Неўзабаве пачалася Першая сусветная вайна.

«Варшавский Дневник»:

*Царква не толькі задавальняе духоўныя патрэбы рускага; яна выхоўвае яго ў народным духу, умацоўвае ў ім маральныя асновы (!) і падтрымоўвае гэтую веру, якая падштурхоўвае да смяротнага бою за цара і Радзіму.*

*Праваслаўны храм сведчыць, якімі трывалымі ёсць уладанні дзяржавы расійскай, адным сваім выглядам сведчыць, што тут жывуць рускія, моцна трымаючыся клічу: «За веру, цара і Айчыну!»*

Паблізу сабора была ўзведзена яшчэ больш усходняя званіца, пра якую нават хадзіў анекдот, які апавядалі толькі ў мужчынскай кампаніі. Тутэйшы чыноўнік праводзіў па месцы чалавека, прыезджага з усходу. *«Смотри, какой храм Божий»*, — сказаў, паказваючы на будову. *«Да что с того, что Божий, когда на х... похожий!»* — нібыта адказаў госць.

*Гляньце, кажуць, паказваючы на гэтыя манументы, якія выпраменьваюць сваю магутнасць,* — піша Тадэвуш Рацлавіцкі, — *колькі цэркваў, столькі і пячатак, якія пацвярджаюць нашу ўласнасць; мы тут ужо не прыхадні, не часовыя захопнікі, але гаспадары.*

*

Сабор святой Тройцы пры вуліцы Доўгай, перабудаваны з касцёла піяраў у 1837 г., пяць высокіх пазалочаных купалаў, унутры званіца, набажэнствы штодзень.

Царква Найсвяцейшай Панны Марыі (*Пакроўская*) каля архіепіскапскага палаца ад вуліцы Доўгай, 1849, набажэнствы штодзень.

Царква Перамянення Господняга (*Преображенская*) каля архіепіскапскага палаца ад вуліцы Мядовай 24, 1837, набажэнствы штодзень.

Парафіяльная царква Святой Тройцы каля вуліцы Падвале, 5, 1818.

Парафіяльная царква Святой Марыі Магдалены ў Празе. Пабудавана ў 1869 г. на грошы ўрада ў візантыйска-венецыянскім стылі, пяць купалаў, дзесяць званоў, адлітых у Вестфаліі, Аляксандраўская, 7.

Надворная царква Аляксандра Неўскага пры царскім палацы ў Лазенках, 1846.

Замкавая царква Узвіжання Святога Крыжа ў адным з крылаў каралеўскага замка на вуліцы Гродскай, 1816.

Царква Маці Божай Уладзімірскай на могілках у Волі, перабудаваная з каталіцкага касцёла, 1841.

Дзевяць вайсковых цэркваў на тэрыторыі варшаўскіх казармаў, асабліва пышная царква трэцяй батарэі артылерыйскай брыгады ў Лазенках, пабудаваная ў 1870 г. на ўласныя грошы батарэі.

Праваслаўныя капліцы ў першай гімназіі ў Новым Свеце (Палац Сташыца), у вайсковым уяздоўскім шпіталі, у Аляксандраўска-Марыінскім інстытуце выхавання дзяўчат на Вейскай вуліцы.

Новыя цэрквы паводле спісу 1910 г.:

Царква святога Міхаіла Архістратэга на Ал. Уяздоўскай;

Царква Унебаўзяцця Панны Марыі, Мядовая, 14;
Царква святой Таццяны мучаніцы;
Царква святога Аляксандра Неўскага — Цытадэль;
Царква святога Георгія Пераможцы — вуліца графа Кацэбэ, 1 (сёння Фрэдры);
Царква святога Мікалая — Вейская, 8;
Царква святой Вольгі — Лазенкі;
Царква Маці Божай Казанскай — Рымарская, 3;
Царква Перамянення Гасподняга — Канвікторская, 3;

*

*Расійскі ўрад узводзіў гэтыя будовы далёка не для рэлігійных патрэбаў,* — пісаў Леан Васілеўскі[40], — *таму што сціплая жменька праваслаўнага насельніцтва не здольная запоўніць усіх цэркваў; яны павінны дэкараваць горад у расійскім стылі. Мабыць, людзям прыезджым яны кідаюцца ў вочы, а гораду надаюць выгляд расійскага, але варшавяне не могуць пагадзіцца з гэтай думкай, каб Варшава тхнула Усходам.*

У папулярнай песні спявалася:

*Пачакайце, купалкі,*
*З Францыі яшчэ прыйдуць палкі,*
*Мы не хочам чужой веры,*
*Прыйдуць нашы і піяры.*

Незалежніцкі ўрад пастанавіў узарваць сабор на Доўгай. Падрыхтаваны на 24 снежня 1863 г. замах не ўдаўся.

Не толькі архітэктура, асаблівая мелодыя звонаў надавалі ўсходні тон, але і з'езды дзяржаўных дзеячаў, камандаванні войскаў, прадстаўнікоў консульстваў і замежных місій у святочныя дні.

*У саборы пахла мірай, гучаў візантыйскі хор, свяціліся золатам рызы святароў на тле іканастаса і мундзіры афіцэраў, якія б'юць паклоны.*

На дарозе перад былым касцёлам піяраў, як нідзе ва ўсім горадзе — заасфальтаванай, стаялі экіпажы «асаблівага стылю». Арыгінальная вупраж упрыгожвала коней, наперадзе сядзелі фурманы ў скураных кафтанах, белых фартухах, вялікіх чорных картузах роўна над каркам пастрыжаных валасоў. У нерухома выцягнутых руках трымалі нацягнутыя лейцы — выпінаючы «туга набіты ватай зад да пасажыра».

[40] Леан Васілеўскі (24.08.1870—10.12.1936) — палітычны дзеяч сацыялістычнага кірунку, блізкі супрацоўнік Юзафа Пілсудскага, архітэктар польскай усходняй палітыкі на пачатку польскай незалежнасці. *(Заўв. перакл.)*

Рэзідэнцыя праваслаўных мітрапалітаў знаходзілася на рагу вуліц Мядовай і Доўгай, у ранейшым будынку «Collegium Nobilium». Янікій (Гурскі) ад 1860 г., Лявонцій (Лебедзінскі) ад 1875 г., Флавіян (Гарадзецкі) ад 1891 г., Яўлогій (Георгіеўскі).

## Царскі універсітэт

«Даровать Привислинскому краю университет», — абяцаў цар.

*Растаптаўшы ўсе прынцыпы аб'ектыўнай веды, арганізаваны пры дапамозе чыста паліцыйных метадаў, дбаючы самааддана пра «добранадзейнасць» студэнтаў і прафесараў, сцеражэ, з дапамогай цэлай зграі педэляў, ці мундзіры зашпіленыя «на ўсе гузікі», а нагавіцы маюць адпаведны колер, у той самы час зусім абыякавы да ўзроўню навучання, да навуковай вартасці выкладчыкаў, якія мелі найгоршую рэпутацыю нават у цвяроза мыслячых навуковых колах Пецярбурга і Масквы, Варшаўскі універсітэт пакінуў чорны след у гісторыі асветы ў Польшчы. (Дэмбіцкі)*

Царскі Варшаўскі універсітэт быў створаны ў 1869 г. на базе існуючай ужо сем гадоў Галоўнай школы. У яго склад уваходзілі чатыры факультэты: гістарычна-філалагічны, фізічна-матэматычны, юрыдычны і медыцынскі. На вучобу прымаліся маладыя людзі, якім споўнілася 17 гадоў і якія скончылі курс навучання ў адной з класічных гімназій у Варшаўскай акрузе. Афіцыйнай мовай і мовай выкладання была расійская. З кола былых прафесараў засталася палова. Іх замянялі выкладчыкамі расійцамі, якія былі «цалкам добранадзейныя».

Універсітэт быў «паліцэйскім участкам», — пісаў Станіслаў Кашуцкі.

Нагляд за студэнтамі ў абсягу універсітэта належаў інспектару, па-за яго будынкам студэнты падлягалі распараджэнням паліцыі нароўні з жыхарамі Варшавы. У выпадку якога-кольвечы здарэння, у якім удзельнічаў студэнт, паліцыя тэрмінова паведамляла пра гэта ўладам універсітэта.

Плата за навучанне была 50 рублёў на год, плаціць трэба было ў губернскай касе двойчы на год авансам. Затрымка не магла быць большай за месяц, потым студэнта выключалі.

Міністр асветы Талстой заявіў, што

*Найважнейшай задачай універсітэта павінна стаць збліжэнне польскай нацыянальнасці і трывалае зліццё Прывіслінскага краю і Імперыі, а не навуковыя справы, да таго ж у польскім духу.*

*

У 1881 г. польская студэнцкая моладзь у Варшаве, нягледзячы на выразна нясхільную пазіцыю большасці, выслала ў Пецярбург сваю дэлегацыю з вянком на пахаванне забітага цара Аляксандра. Шчэпан Залескі дастаў за гэта

ў Пецярбурзе поўху ад студэнтаў мясцовай Медыцынскай акадэміі. Мечыслаў Бежынскі

*суправаджаў дэлегацыю з непрыемным пачуццем, але глыбока верачы, што выконвае патрыятычнае таемства найвышэйшай важнасці, маючы пераканаць Расію, што палякі верна стаяць і стаяць будуць надалей пры царызме.*

Вярнуўся ў Варшаву «з дужа маркотнай мінай» — у першы раз, як піша Людвік Кшывіцкі,

*у яго мозг, прасякнуты лозунгамі арганічнай працы і палітычным лаялізмам, пранікла думка, што лозунгі арганічнай працы дэмаралізуюць грамадства...*

*

Папулярныя былі падарожжы для атрымання вышэйшай адукацыі ў Кіеў, Дорпат (Тарту), Парыж.

## Цукар марожаны

**Уладзіслаў Сыракомля**:

*І дрэвы красуюць, і пташкі пяюць,*
*І аж покаюцца пупышкі лоз,*
*І ўсюды жыццё, а вы верыце,*
*Што вясна ўжо, што вясна ўжо!*

*Лёгкаверныя! Чуеш з вуліцы*
*Сына поўначы, вестуна гроз,*
*Як птах злавесны, Масквіцін верашчыць:*
*Сахар мороз, сахар мороз!*

Звычайна гэта быў высокі мажны мужчына з вялікай, светлай, пад кант стрыжанай барадой (*четырёхугольная борода*), такой, якую насіў цар Аляксандр III, з валасамі падстрыжанымі вышэй карка (вялікарускі тып), у чырвонай, з боку зашпільванай рубашцы, зморшчаных «у гармонік» ботах і чорнай, напханай ватай шапцы. На галаве ён насіў вялікую і цяжкую кадушку, накрытую зверху і перавязаную каляровай хусткай. Пад хусткай хаваліся дзве вялікія цынкавыя скрынкі з марозівам, багата абкладзеныя навокал лёдам. Гандляр марозівам, звычайна называны «кацапам», адной рукой прытрымліваў фаску на галаве, другой размахваў і крычаў: *сахар мороженный*! Ён меў поспех, асабліва сярод дзяцей. Марозіва было вельмі таннае — за залатоўку (г. зн. 15 капеек або 30 грошаў) поўны кубак з контурам.

*І даўней Польска, проста з Табольска,*
*Бачыла снег, лёд, пупышкі лоз...*
*Сёння вунь змены, пацукраваны*
Сахар мороз, сахар мороз!

*Хоць для жывых асцюкі, пустазелле,*
*Краскамі вянчаюць Канарскіх воз,*
*Варожаць надзею, а ў сэрцы вее*
Сахар мороз, сахар мороз!

*І паэты*
*Ў свае буклеты*
*Сыпнулі слоўцаў вясенніх стос;*
*Дурні, хто верыць*
*У іх шчырасць бяз меры!*
Сахар мороз, сахар мороз!

## Цыгарэты і запалкі

У галіцкай «Gazecie Narodowej» ад 11 снежня 1880 г. чытаем:

*Маскоўская прапаганда з дапамогай пушак ад запалак у нас не спыняецца, нягледзячы на неаднаразовыя нашы напаміны. У многіх нашых тытунёвых*



Злева: прадавец цыгар і цыгарэт падчас народнага гуляння на Макатоўскім полі (1892—1893 гг.).

*крамах усё яшчэ прадаюцца запалкі ў пушках, на якіх намаляваная нейкая пэцканіна з выявай маскоўскіх генералаў, сцэны іх п'янства, а каля іх пададзеная* царска гимна *(даецца поўны тэкст; па-маскоўску правільна «царский гимн», але відавочна паны агітатары не ўмеюць добра па-маскоўску). Запалкі ў такіх пушках вырабляюць фабрыкі Фюрта (Fürtha) з Вены і Ліпшуца (Lipschütza) з Скола.*

*

Самымі таннымі цыгаркамі ў той час былі «Попробуйте» або «Гостинные», самыя дарагія — «Смирно». Самыя папулярныя выраблялiся на фабрыцы Лафэрмэ на рагу вуліцы Залатой і Маршалкаўскай.

Патрыятычны *savoir-vivre* радзіў устрымлівацца ад цыгарэт і гарэлкі — «у сувязі з іх паходжаннем ад маскалёў» і дзеля «набівання кішэні ворагаў». Але тытунь быў наркотыкам стагоддзя, перш як пачалі вырабляць цыгарэты. Класікі і рамантыкі, паўстанцкія афіцэры і акторы на сцэне курaць люлькі на доўгіх цыбуках. «Смаліць» Міцкевіч і Жміхоўская. Нельга, аднак, гэтага рабіць у пакоі пры дамах, а таксама на вуліцы.

*

Навіной сталі шэра-карычневыя цыгары. Славацкі ў 1831 г., першы раз спрабуючы іх у лонданскім гатэлі, спаліў сабе шлафрок. Модныя цыгары прадаваліся пры ўваходзе на Везувій, каб турысты маглі іх прыпаліць ад лавы (так зрабіў Міцкевіч). Цыгара на кароткі час зрынула з трону люльку, а ў другой палове стагоддзя запанавала цыгарэта. Мексіканцы, астраўляне з Гаіці здавён даўна закручвалі тытунь у лісты кукурузы. Еўрапейцы прыдумалі гэты спосаб хіба дзеля нястачы цыгар ці люлек, дзесьці ў Іспаніі або ў Алжыры ўжо на пачатку стагоддзя. З іспанскай мовы паходзіць назва *cigarettos*, у Расіі — *папироска*. Хутка курыльную паперу замяняе гатовая папяровая скрутка, якая выраблялася на прыватных манаполіях і фабрыках (у Расіі — гільза, у Галічыне пад уплывам Вены — тутка). У падрасійскай Польшчы заўсёды ўжываліся гільзы.

## Цытадэль

16 кастрычніка 1835 г., калі цар Мікалай першы раз наведаў Варшаву пасля паўстання, ён заявіў дэпутацыі, якая яго вітала, што Цытадэль павінна служыць не для абароны горада, а супраць яго. Ён проста сказаў палякам, што іх чакае ў выпадку, калі яны не пакінуць сваіх «мечтаний о национальной обособленности, о независимости Польши и т. п. фантазиях». І скончыў наступнымі словамі:

*Я устроил здесь Цитадель. Говорю вам, что при малейшем волнении я прикажу стрелять в город, обращу Варшаву в развалины и, конечно, не отстрою ее.*

Сярэдняя частка Цытадэлі паўстала на тэрыторыі комплекса казармаў Пешай коннай гвардыі, пабудаваных у 1725 г. і значна павялічаных і перабудаваных у час панавання караля Станіслава Аўгуста. Асноўныя фартыфікацыйныя працы, якімі кіраваў генерал Дэн, былі скончаны ў 1836 г. Выдаткі будовы, каля 11 мільёнаў рублёў (!), паклаліся на Варшаву і скарб Каралеўства. Плошча Цытадэлі склала 2680 метраў, яе паверхня — 10,5 гектара. Да яе вялі чатыры брамы (*ворота*): Канстанцінаўскія, Александрыйскія, Міхайлаўскія і Іванаўскія.

Мікалай І назваў Цытадэль Аляксандраўскай, у гонар свайго папярэдніка. Яго імя насілі ўжо казармы на Жалібожы, вакол якіх яна была размешчана.

X корпус быў збудаваны яшчэ як казарменны корпус у 1829 г. паводле праекта Генрыха Мінтэра. Прыстасоўваючы яго для турэмных мэтаў, была збудавана кардэгардыя з дзвюма брамамі, такім чынам замыкаючы дзядзінец, падзелены на дзве часткі. Унутраная служыла зняволеным для шпацыраў, на яе памежжы стаяла спецыяльная кузня для закоўвання ў кайданы. З 1834 г. у гэтым корпусе знаходзілася следчая турма і сядзібы наступных Следчых Камісій, а таксама, амаль без перапынку, — сядзіба Ваеннага суда.

Некалькі дзесяцігоддзяў тут трымалі і асуджалі на смерць палякаў. Зямля на месцы закопвання целаў каля Цытадэлі была старанна ўтаптаная, не пакідаючы слядоў.

*Ужо прамінула дзевятая, — успамінае Тадэвуш Вянява-Длугашоўскі. — Крэпасць пайшла спаць. Там кіпіць Варшава, пачынае жыць — тут рускі аазіс заплюшчвае вочы, і толькі расстаўленыя варты будуць сцерагчы гэтыя месцы. Зайгралі трубы. «Корпус» не спіць, каб трубы маглі граць спакойна. Сапраўды — гэта малое мястэчка, у якім пераважае мужчынская, халасцяцкая стыхія. Колькі ж там мае быць ананістаў. Бо толькі афіцэры і вахмістры маюць свае «апараты раскошы» — так кажа пра жанчыну сумнай памяці Вайнінгер.*

Вызваліўшыся ў 1915 г. з Цытадэлі, Артур Опман апісаў яе так:

*Ад Брамы Смерці нябачнай ступой,*
*З зашмаргай на шыі ідзе Прывід. Нікога!*

*На трупным схіле шыбеніца дрэмле,*
*І вузел не душыць у святой Расіі імя.*

*Пад ціхім серабром месячнага твару*
*Сігналам смерці не бурчыць барабан,*

*І калідоры, з якіх на эшафот дарога,*
*Не прагнятае жандарская шпора.*

*Ад згнілай пусткі салдацкіх казармаў*
*Не вые дзікая песня Волгі і Дону,*
*І сканаў шайтан царкоўнага звана,*
*Які над Польшчай біў славься для цара.*

*З зашмаргай на шыі ідзе Прывід — алеяй,*
*Дзе з каштанаў кроў па кроплі сцякае,*
*І чалавек мёртвы вітаецца з Надзеяй, —*
*Бо тут — жывога няма чалавека...*

## Цэнзура

Гэтыя фігуры няцяжка ўявіць сабе ў якасці постацей з вадэвіля. Спяваюць і танчаць з чырвонымі алоўкамі ў руках вакол стала, застаўленага ікрой у бляшанках памерам з торт і бутэлькамі каньяку за 45 рублёў.

*Калі ў Варшаве цэнзарам быў я,*
*Як блін у смятане качаўся я,*
*Штодня з іншым рэдактарам*
Я пил и кушал, *што хацеў.*
*У Аркушэўскага на рагу*
*Меў я ўсё, чаго душа пажадае.*
*Чалавек вітаў мяне на парозе*
*І «пане саветніку» гаварыў мне...*

Вось ненавісны начальнік Янкуліо, строгі, цынічны, сімвал тупога прыгнёту, паводле чутак, каханак Марыі Андрэеўны.

Вось худы брунет з праніклівымі вачыма і жоўтым тварам, Іваноўскі, уладальнік дзвюх камяніц, свабодна гаворыць па-польску і ўмее чытаць паміж радкоў.

Вось славалюбны Сідараў з вуліцы Калікста, карэспандэнт «Нового времени», які не хавае сваіх літаратурных амбіцый.

Вось Эмаўскі, найвялікшы з хабарнікаў, знаходзіцца пад пятой агіднай мегеры, якая любіць рулетку ў Монтэ-Карла і любую колькасць гатоўкі. («Kurjer Warszawski» заўсёды фундаваў ёй білет на «Зюд Экспрэс» у абодва канцы.)

Чым лепшы быў сняданак, тым мякчэйшая была цэнзура. Чым больш алкаголю, тым менш чырвонага атраманту. Позірк, аслаблены відам банкноты аднавядлівай вартасці, абмінаў небяспечныя месцы. Праўда, не заўсёды.

Паскевіч даваў баль. «Kurjer» апісаў яго, успамінаючы, што на замкавых сходах стаяў рад пышных апельсінавых дрэваў з лазенкаўскай аранжарэі. Цэнзар да слова «рад» дапісаў літару «у» на пачатку і слова «апякунскі». Назаўтра можна было прачытаць, што «На замкавых сходах, пры ўваходзе ў бальную залу, стаяў *Апякунскі Урад* прыгожых апельсінавых дрэваў...». На такой самай падставе

«раба» страсці замянілі на знакамітага негра, які доўгі час фігураваў у старым выданні аднаго нашумелага рамана.

Але гэтая сістэма, званая мікалаеўскай, што спалучала камізм з поўнай бяздумнасцю, заснаваная на асвечаных традыцыяй фармулёўках і адміністрацыйных правілах, якія выключалі выкарыстанне пэўных выразаў, зваротаў, параўнанняў, прозвішчаў ці прыметнікаў, скончылася. Цяперашняя ўдасканаленая сістэма, аляксандраўская, з'яўляецца нашмат больш небяспечнай. Яна не дакляруе «прыгнёту любой думкі, слова ці прэсы», як мікалаеўская, але імкнецца толькі да «ўрадавага кантролю над імі». Яна як

*жаўнер, адзеты ў народную рускую кашулю і баранковую шапку, у параўнанні з мікалаеўскім жаўнерам у вузкім фрачку, у ласёвых штанах і мядзведжай шапцы на галаве. Салдат застаўся салдатам, змянілі яму толькі ўбор. Ранейшы быў жудасна цесны, мулкі і страшна нязручны. Цяперашняя «рубашка» свабаднейшая, шаравары больш шырокія, грудзі не так сціснутыя, як у жалезным гарсеце, але затое пах юхту і дзёгцю неадлучны ад новай формы і стаіць у носе з раніцы да вечара. Даўнейшая сістэма гналася толькі за словамі, гэтая ўсё больш чапляецца за думкі.*

*

Адзін нумар штотыднёвіка «Prawda» складаўся з 3400 радкоў. Здаралася, што да таго, як нумар гэтага выдання ўбачыць дзённае святло, цэнзар у карэктуры скрэсліць 7000 радкоў.

*

Варшаўскі камітэт цэнзуры, арганізаваны ў 1869 г., быў перададзены ў падпарадкаванне Галоўнаму ўпраўленню друку Міністэрства ўнутраных спраў у Пецярбургу. Бягучы кантроль над цэнзарамі і інспектарамі друкарняў выконваў варшаўскі генерал-губернатар. Кіраўніцтва васемнаццаціасабовым Варшаўскім камітэтам цэнзуры, які знаходзіўся ў правым крыле Архіепіскапскага палаца на вуліцы Мядовай, належаў да абавязкаў яго старшыні. Яму падпарадкоўваліся старшыя і малодшыя цэнзары, а таксама інспектары друкарняў і кніжнага гандлю. Варшаўскі камітэт цэнзуры ажыццяўляў кантроль над любымі творамі літаратуры, выяўленчага, пластычнага і дэкаратыўнага мастацтва, цэнзураваў часопісы, прывезеныя з-за мяжы, і ўсе публікацыі.

*І зноў, як і ўва ўсім, так і тут, пытанне асобы аказваецца важнейшым за пытанне сістэмы, і прыдзірлівасць ці асабістая ўпярэджанасць займаюць месца прынцыпу і права.*

Рэгламенту не існуе. Існуе закон аб цэнзуры, які гаворыць, што ніводнаму выданню, якое выходзіць у расійскай дзяржаве, нельга пісаць нічога пра імператара і членаў пануючага дому, акрамя інфармацыі, пададзенай на падставе «Урадовага весніка», што нельга крытыкаваць дзейнасці дзяржаўнай

улады, непрыязна выступаць супраць праваслаўнай рэлігіі, у любой форме крытыкаваць судовыя прысуды і падаваць падрабязнасці судовых спраў перад заканчэннем следства.

Тое, якім чынам цэнзар інтэрпрэтуе гэтыя пункты, залежыць толькі ад яго вынаходлівасці і амбіцый. Ва ўсім, калі ён захоча, можна знайсці парушэнне. Здаецца, няцяжка заўважыць палітычны намёк у сказе: «Сёння ідзе дождж, а заўтра павінна быць добрае надвор'е».

*У прынцыпе, цэнзура ў Расіі з'яўляецца ўладай наскрозь свавольнай, яна не кіруецца ніякімі інструкцыямі і не падпарадкоўваецца ніякім законам.*

*

Недазволены літаратурны твор заставаўся ў архіве Камітэта.

На ўсім, што выходзіла з друкарні, літаграфіі і г. д., на афішах і ўсякіх дробных аб'явах (асобныя выданні) мусіла змяшчацца назва і месца друкарні, літаграфіі і г. д., далей год, горад, у якім было надрукавана, і дазвол цэнзуры. На перыядычных выданнях апрача гэтага павінна быць пазначана прозвішча рэдактара і падпісная цана.

*

Расійскі гісторык, прафесар Варшаўскага універсітэта Мікалай Карэеў у «Польскіх лістах» падкрэсліваў, што

*ў Варшаве прынята правіла, каб далёка не ўсё, што надрукавана ў Расіі аб паляках і аб польскай справе, магло перакладацца ў Варшаве. (...) Для палякаў плады расійскай думкі былі пладамі забароненымі.*

## Цялесныя пакаранні ў войску

Галоўныя правілы генерала Сухазанета — дырэктара Царскай Вайсковай Акадэміі ў 1832—1854 гг.:

*On peut vaincre sans science, mais jamais sans discipline.*
*Un chef, qui est le père de ses subordonnés est un chef faible.*

*

Толькі пад канец 1817 г. скасавалі ірванне ноздраў, а ў 1830 г. — пакаранне бічом. Розгі ўжываліся паўсюль часта і ахвотна. У Варшаве на Віеле былі выдзелены спецыяльныя месцы, дзе расла лаза, і туды высылалі аддзелы з мэтай забеспячэння «матэрыялам» для розгаў.

Не білі толькі ў твар, бо гэта псавала б агульны выгляд строю.

На пачатку XX ст. вельмі часта выкарыстоўвалася т. зв. «прапусканне праз зялёную вуліцу», паміж двума шэрагамі жаўнераў, якія з усёй сілы сяклі парушальніка шпіцрутамі. Гэтая аперацыя выконвалася толькі публічна, з

смакам, без спеху, у прысутнасці сама мала цэлага батальёну, калі не палка. Афіцэры мусілі быць пры гэтым у парадных мундзірах.

Давалі і некалькі тысяч удараў, таму здаралася, што пакараны паміраў. Як толькі ён падаў у знямозе, яго адразу забіралі ў лазарэт, але толькі для таго, каб апрытомнеў настолькі, каб можна было скончыць выкананне прысуду.

Цялесным пакаранням падлягалі як жаўнеры, так і унтэр-афіцэры, моладзь надавала сабе вайсковыя рангі ў залежнасці ад таго, колькі разоў хтосьці быў высечаны.

У царскай Расіі нельга было сячы толькі дваран. Прывілей ад 1785 г. прызнаваў двараніну права на ўладанне зямлёй і звальняў ад цялесных пакаранняў. У лісце Чэхава Суворыну ад 22 сакавіка 1890 г. чытаем такую згадку:

*У нас увесь час б'юць у камісарыятах. Устаноўлена нават аплата. Ад селяніна за яго збіццё бяруць па 20 кап. за розгі і работу, ад мешчаніна 10 кап. Жанчын таксама караюць розгамі.*

Павел Ясяніца дадае: «Усё, што стаяла ніжэй за купецтва, юрыдычна падлягала сячэнню і называлася на паўафіцыйнай мове *секомое сословие*».

## Чорная біжутэрыя

Напачатку быў пярсцёнак. На кожны важны нацыянальны момант. Не з чырвонага золата, але з залатога дроту, а найчасцей з срэбра — пазалочанага ці адмыслова эмаляванага. Калі князь Юзаф Панятоўскі[41] патануў у Эльстэры, з'явіліся жалезныя пярсцёнкі, выкананыя з падковаў яго каня. Калі Шыман Канарскі[42] загінуў у 1839 г. на эшафоце ў Вільні, яго нарачоная даручыла адліць з яго кайданоў 82 пярсцёнкі. Калі ў Парыж дайшла вестка аб Грахоўскай бітве[43], Міцкевіч з Кляўдынай Патоцкай прапанавалі вырабіць залатыя крыжыкі і пярсцёнкі з дрэў у Альшынцы. Такіх пярсцёнкаў шмат хадзіла ў краіне і на эміграцыі. Нашмат больш, чым патэнцыйная вага сімвалічнай сыравіны.

Потым з'явіліся пярсцёнкі з пячаткамі. Напрыклад, такі: на шэра-белай эмалі дамавінка, аздобленая незалежніцкімі гербамі, а калі пацягнуць за спружынку, адтуль выскоквае касінер з белым арлом — надзея ўваскрашэння.

З часам да выявы польскага арла далучыліся іншыя сімвалы: мучаніцкай пальмы, ланцуга, цярновага вянка. Ужытковыя памяткі нацыянальнага патрыятызму, што сягалі Касцюшкавага паўстання, адыгралі асаблівую ролю ў пачатку шасцідзесятых гадоў пасля пахавання пяці ахвяр і падчас ваенна-

[41] Юзаф Антоні Панятоўскі (7.05.1763—19.10.1813) — польскі вайсковы і палітычны дзеяч, міністр вайны і камандуючы войскамі Варшаўскага княства, маршал Францыі. (Заўв. перакл.)

[42] Шыман Канарскі (нар. 5.03.1808 каля Сейнаў — 27.12.1839 павешаны ў Вільні) — лістападаўскі паўстанец, сябра эміграцыйных таварыстваў «Маладая Польшча» і «Польскі народ». (Заўв. перакл.)

[43] Бітва пад Альшынкай Грахоўскай у ваколіцах Варшавы 25.02.1831 г. з расійскімі войскамі, адна з самых крывавых падчас лістападаўскага паўстання. (Заўв. перакл.)

га становішча. Не толькі дадаткі да ўбору, сам яго выбар станавіўся жэстам палітычнай дэманстрацыі.

«Нашыя дзяўчаты кінулі дарагія камяні і зыркія ўборы і прыбіраліся сціпла, у чорныя сукенкі. Усе разам з уборамі пасур'язнелі», — пісаў ксёндз Серафін Шульц. «Уся нацыя ахінулася ў чорнае, а жанчыны абвясцілі жалобу», — занатавала генераліха Наталля з Біспінгаў Кіцка. Замест дарагой біжутэрыі (яе кідалі ў касцёлах на ахвярныя тацы, каб умацаваць нацыянальны рух), паненкі пачалі насіць брошкі, крыжы, пярсцёнкі і медальёны, вырабленыя з менш каштоўных матэрыялаў (срэбра, медзь, цынк, мосенж, жалеза, свінец, алюміній). Сціплы аздобны элемент давалі цёмныя оніксы, чорная эмаль, агаты, часам дробныя дыяменты.

У Інстытуце шляхетных дзяўчат у Пулаве, калі выхаванкам было загадана зняць жалобу, шмат дзяўчат намалявалі сабе атрамантам чорныя пасы на шыі і руках, называючы гэта «нязДымнай жалобай».

Рэдка было відаць каляровыя ўборы. Здаралася, што каляровыя сукенкі палілі азотнай кіслатой. Сам намеснік Людэрс у лісце да цара ў траўні 1862 г. наракае, што «тутэйшая разбадзяная моладзь пераследуе паненак, убраных у каляровыя строі, і мужчын, якія носяць высокія капелюшы», а аўтар скіраваных у Пецярбург рапартаў Паўлішчаў даносіў, што нацыянальная жалоба была «пад кантролем вулічных тэрарыстаў».

Саксонскі парк выглядаў маляўніча. Натоўпы ўбраных у чорнае кабет з балесным выразам твару, якія, з'едліва заўважае Берг, соўваліся як цені, што прыпаміналі постаці мніхаў, якія падчас шпацыру дыхаюць свежым паветрам. Мужчыны таксама былі ў чорным, многія насілі азнакі жалобы пры каўнерах і зашпілках сурдутаў і венгерак. Нават лялькі ў руках дзяўчатак былі ўбраныя жалобна, а абручы, ужываныя для дзяціных забаваў, абкручвалі белай і чорнай стужкамі. Жаночыя капялюшыкі аздаблялі чорнымі ці шэрымі кветкамі — астрамі, ружамі, касачамі з белымі пруцікамі. Больш вытанчаныя прадметы жалобы прывозіліся з Парыжа.

Неўзабаве з'явіліся брошкі і спражкі для рэменяў з выявамі Траўгута[44], на месцы якога раней былі выявы Касцюшкі. Выгравіроўваліся памятныя даты, дарчыя надпісы і ініцыялы. Самыя ўжываныя: «Божа, выратуй Польшчу!», «Маці, бarані нас!», «Ойча, ратуй!». А чорныя пацеркі з гагату як сімвалы жалобы настолькі паўсюдна ўмацаваліся, што ўвайшлі ў моду ў Іспаніі, дзе іх называлі «польскімі слязьмі».

Чорная біжутэрыя хутка зрабілася папулярная ў Еўропе, як, напрыклад, і тосты за «няшчасліваю, святую, гераічную» Польшчу. На знаным фотаздымку Карла Маркса з дачкой Жэні мае на сабе любімы просты ланцужок з польскім крыжам, што бацька даволі дакладна апісвае ў адным з лістоў.

«Жалобныя пацеркі», як іх пагардліва называлі прадстаўнікі пануючага парадку, былі прычынай шматлікіх вайскова-паліцэйскіх рэпрэсій. Выраб і

[44] Рамуальд Траўгут (16.01.1826 – 5.08.1864) — адзін з вядучых кіраўнікоў студзеньскага паўстання 1863 – 1864 гг. Загінуў на шыбеніцы ў Варшаве. (Заўв. перакл.)

продаж патрыятычнай біжутэрыі былі сурова забароненыя. (Пані Галінскую, уладальніцу галантарэйнай крамы ў будынку тэатра, пакаралі штрафам на 500 рублёў за продаж польскіх арлоў і косаў Мераслаўскага.) Забарона оберпаліцмайстра ад кастрычніка 1863 г. тычылася нашэння бачных знакаў жалобы і ўсіх народных эмблемаў. Арыштам каралі за нашэнне чорных капелюшоў, за шпількі з «незалежніцкімі» арламі, за брошкі і пярсцёнкі з забароненымі сімваламі. Жанчына ў чорным, якая ідзе пехатою, павінна была заплаціць 10 рублёў, а калі ехала на брычцы ці амнібусе — 15 рублёў, а экіпажам — 100 рублёў. Каб насіць жалобу па мужу ці бацьках, трэба было мець спецыяльны дазвол. Рэпрэсавалася і нашэнне акутых металам палак і пэўнага кшталту вусоў, якія атаясамліваліся з шляхецкім выглядам. Забараняўся таксама і чорны колер, таксама як канфедэраткі і т. зв. польская адзежа. Каралі не толькі ініцыятараў яе нашэння, але і краўцоў.

Асаблівым прыкладам чорнай біжутэрыі былі крыжыкі, бранзалеты і пярсцёнкі, выраблены вязнямі (у тым ліку Цытадэлі) і сібірскімі катаржнікамі. Паводле сваіх якасцяў яны не адставалі ад вырабаў прафесіяналаў, хоць выконваліся з таго, што было пад рукой, напрыклад, з хлеба.

## Школа

Стэфан Жаромскі скажа аб сваёй гімназіі ў Кельцах, што тая робіць на яго ўражанне бальніцы, у якой яму рабілі аперацыю. Юзаф Пілсудскі адгукаўся пра сваю гімназійную эпоху ў Вільні як пра «свайго роду катаргу». Ён пісаў:

*Бяссільная злосць душыла мяне не раз, а сорам, што ні ў чым не магу перашкодзіць ворагам, што павінен моўчкі зносіць патаптанне маёй годнасці і слухаць хлуслівыя, пагардлівыя словы аб Польшчы, паляках і іх гісторыі, распальваў мне шчокі. Пачуццё прыгнечанасці, пачуццё нявольніка, якога кожную хвіліну могуць растаптаць, як чарвяка, ляжала мне на сэрцы млынавым каменем.*

У васьмідзесятыя гады XIX ст. у Варшаве было сем дзяржаўных філалагічных сямікласных мужчынскіх гімназій (у тым ліку адна на Празе), адна рэальная шасцікласная мужчынская гімназія, дзве мужчынскія прагімназіі трох- і чатырохкласныя, чатыры дзяржаўныя жаночыя гімназіі і адна жаночая прагімназія. У 1886 г. у мужчынскіх школах палова настаўнікаў былі праваслаўныя, у жаночых — 75 %. У 1899 г. адпаведна — 60 % і 80 %. Палякі звычайна працавалі кантрактнікамі, рэдка калі мелі поўную колькасць гадзін і атрымлівалі нашмат больш нізкія заробкі за расійцаў — у сярэднім ад 300 да 1300 рублёў на год у залежнасці ад становішча і прадмета, у той самы час заробак расійцаў вагаўся паміж 1500 і 2000 рублёў. Да гэтага дадаваліся рознага роду даплаты, якія прызначаў дырэктар. Сярэдні заробак настаўніка для палякаў быў не нашмат большы за заробак кваліфікаванага рабочага, то бок каля 45 рублёў на месяц.

У апошнія гады XIX ст. у Варшаве было 19 прыватных сярэдніх мужчынскіх школ рознага профілю і перыяду навучання і 48 прыватных сярэдніх жаночых школ. У 1883 г. у прыватных школах вучылася 6400 вучняў. У адрозненне ад дзяржаўных, не ўсе прыватныя гімназіі маглі выдаваць дыпломы аб заканчэнні навучання (што было ўмовай далейшага навучання). Леан Васілеўскі згадвае на той час толькі 4 мужчынскія і 22 жаночыя школы, якія мелі гэты прывілей. Яны на ўласны кошт прымалі на працу інспектара расійца (у іншых выпускныя экзамены здаваліся дзяржаўнай камісіі экстэрнам). Больш за тое, прыватная школа не давала права скарочанай вайсковай службы. І, адрозна ад дзяржаўнай, была платнай.

Творцам новага плану выхавання маладых пакаленняў палякаў быў граф Дзмітры Талстой.

Сам Аляксандр II з смехам прыняў права навучання польскай мовы па-расійску. «Хоць акурат ён сам прыдумаў гэта педагагічнае бяспраўе», — заўважыў Станіслаў Кшэмінскі. Аляксандр Краўсгар прыводзіць адбіткі апухцінаўскіх школьных выданняў, «хрестоматий» — дзе нават паэзія Міцкевіча, а таксама Ленартовіча, Поля, КахаНоўскага, Мальчэўскага, друкаваліся ў польскім гучанні, але кірылічнымі шрыфтамі. У школе была абавязковай таксама расійская «Грамматика польского языка». Хрэстаматыя польскай літаратуры Вяжбоўскага падавала размешчаныя храналагічна тэксты ў арыгінале, а ўвесь каментарый, урок меў адбывацца па-расійску.

Вялася карпатлівая праца над правільнай выбудовай літаратурнай іерархіі. Не без дай прычыны найбольш вялікім польскім паэтам быў Брадзінскі, а не Міцкевіч.

Гісторыя Польшчы выкладалася ў «ганебна сфальшаваным выглядзе» ў рамках сусветнай гісторыі паводле падручніка Карамзіна, а потым Ілавайскага.

Заняткі польскай мовы адбываліся ў найменш спрыяльныя гадзіны (першы і апошні ўрок) і не ўсюды былі абавязковымі. «Родная мова дзіцяці не перастае быць папялушкай, мовай чужаземнай».

Сумнавядомы дырэктар II варшаўскай гімназіі, Троіцкі, прагульваючыся па калідорах або гімназійным дворыку, заўважыўшы, што малыя пры яго з'яўленні перастаюць размаўляць, звяртаўся да іх з пытаннем: «Как ваша фамилия?» Хлопец, які яшчэ добра не авалодаў расійскай і не ведаў суровых прадпісанняў, адказваў па-польску: «Dziękuję panu dyrektorowi, moja rodzina ma się dobrze» («Дзякуй вам, пане дырэктар, мая сям'я маецца добра»). Пасля такога адказу яго кідалі ў карцар на гадзіну, дзве або і на пэсць. Падобнае пакаранне награжала таму, хто адмовіўся, напрыклад, чытаць антыпольскі верш або ўдзельнічаць у прадстаўленні расійскай трупы. (У той жа час гэты самы дырэктар забараняе вучням хадзіць на польскія прадстаўленні, тлумачачы, што яны непрыстойныя.) За пашкоджанне абраза, што вісеў у класе, вучань V варшаўскай гімназіі быў выдалены з школы. Выдаленне з «воўчым білетам» пазбаўляла магчымасці трапіць у якую-небудзь іншую навучальную ўстанову.

На ўроках рэлігіі (адзіныя, што засталіся на роднай мове) для супрацьвагі польскай малітве часта ўводзіліся спевы Мапошкі па-расійску.

Пра стаўленне расійскіх настаўнікаў да польскай літаратуры найлепш сведчыць анекдатычнае ўжо выказванне аднаго з іх, Залескага: «Если бы кто из вас или из ваших родителей написал мне такого «Пана Твардовского», я бы ему двойку поставил!»

«Мы не раз грашылі аблудным апартунізмам, — згадае Фердынанд Хёсік, былы вучань VI варшаўскай гімназіі. — У пагоні за лепшымі адзнакамі, праз зразумелую прагу здабыць прыхільнасць настаўнікаў расійскай мовы, якая заўсёды лічылася найважнейшым з усіх прадметаў, пісалі ў школьных «сочинениях» — *наш русский царь, наш Пушкин*, а нават *наша императрица Екатерина Великая*». Гэта была «безумоўная праява дэмаралізуючых уплываў тагачаснай школы, што, зрэшты, было яе галоўным заданнем, каб дэмаралізаваць характары вучняў, каб у іх сістэматычна ўліваць яд расійскага ладу мыслення». Часта не ставала «благонадёжного» зместу «сочинения», заставалася яшчэ адно абвінавачанне: «Вы постоянно думаете по-польски, а необходимо думать по-русски».

З цягам часу шмат у каго развівалася непрыязь да гэтай мовы, да гэтай культуры.

*Гэтая ў варшаўскіх школах урэшце набытая агіда да расійскай мовы засталася са мной на ўсё жыццё настолькі моцна, што ад моманту заканчэння школы Апухціна я ніколі не прачытаў ніводнай расійскай кніжкі, а калі мне пасля афіцыйнай рэкламы Мельхіёрам дэ Вогам (Melchior de Vogue) расійскага рамана выпала пазнаёміцца з аповесцямі Тургенева і Талстога, я чытаў іх у польскіх або французскіх перакладах, бо не мог перамагчы сябе, каб чытаць арыгіналы, кожная літара якіх раздражняла б загоеныя раны, нагадвала б адным сваім выглядам пра мой школьны час.*

Іх цяжкай неадназначнасці Ігнацы Балінскі прысвячае фрагмент свайго верша:

*Што гэтыя школьныя жакі*
*Бедныя, малыя, нявінныя дзіцяткі*
*Учыніць павінны, каб не заблудзіць,*
*Як толькі не сумнявацца, не верыць і судзіць?*
*Насуперак патокам хлусні, аблуды, паклёпу,*
*Што ім укладаюць штодзённа ў галовы,*
*Насуперак прымусу чужой, варожай мовы,*
*Супярэчнасці паміж думкам і словамі,*
*Што павінны стаяць на сваіх вуснаў варце,*
*І што камедыю страшную пакрыёма*
*Ламаць павінны у кожную дня хвіліну?*
*Для іх адных у свеце — чорнае дома.*
*Ёсць белым у школе. Ах, і для іх толькі.*

*Для іх — падзея дзікая, няўцямная —*
*Ранкам праклятае тое, што ўвечары свята...*

## Шыльды

Ужо ў 1844 г. тагачасны варшаўскі обер-паліцмайстар загадаў увесці дзвюхмоўныя шыльды, але тады не вельмі яшчэ гэтай пастановы трымаліся. Паліцыйнае распараджэнне з чэрвеня 1864 г. абавязвала перагледзець усе шыльды з загадам

*паведаміць купцам, фабрыкантам, рамеснікам і ўсякага роду прамыслоўцам, каб свае шыльды не пазней за 15 (27) ліпеня бягучага году пад пагрозай закрыцця перарабілі такім чынам, каб каля польскіх надпісаў былі надпісы і расійскай мовай, каб расійскія літары не былі меншыя за польскія.*

*Чыноўнікі, пасланыя адмыслова з аршынамі і вяршкамі, мераюць вышыню і таўшчыню літар на шыльдах, і польскія, надта вялікія, даводзяць да ладу.*

Дзвюхмоўныя былі таксама надпісы на скрыжаваннях вуліц, а таксама тэатральныя афішы. Дапушчальныя былі шыльды на французскай мове — у двукоссі. Паводле правілаў, толькі некралогі дапускаліся без расійскага тэксту. У Вільні і па-за межамі Каралеўства польская мова, нават побач з расійскай, была забароненая.

Шыльды варшаўскіх крамаў і складоў з яшчэ адной нагоды розніліся ад падобных у Еўропе. Краўсгар пісаў:

*У нас, за выняткам крамаў рытуальных прыналежнасцяў, шыльды якіх маюць белыя надпісы на чорным фоне, большасць шыльдаў была каляровая, чырвоная, жоўтая, зялёная, сіняя, фіялетавая; выпуклыя літары на іх блішчэлі жоўтым жывапісным золатам або латунню, радзей белым срэбрам.*

Гэтая, на першы погляд, дробная рыса змяняла, аднак, дэкор горада, і мела свае вытокі ў «гісторыі паліцыйных цкаванняў, якіх нам з лішкам выпала за апошнія дзесяцігоддзі, падчас апошняй расійскай улады». Перафарбаванне шыльдаў у зыркія колеры было рэакцыяй на знешнюю жалобу горада ў 1861, 1862 і да сярэдзіны 1863 г., калі на ўсіх выставах сустракаліся толькі чорныя тавары. Фірма «J. A. Krausse» на Банifратарскай выставіла батарэю чорных і белых лакаў і бутлю чорнага атраманту. Фірма «Ludwik Spiess i Syn» на Сенатарскай, каля касцёла сясцёр капанічак, рэкламавала вялікія чорныя каробкі з пастай намаляваць пасілогі. Фартэпіяны Юлія Германа з Мядовай паводле прыроды сваёй адпавядалі новым патрабаванням. У кандытарскіх белыя цукеркі перамешваліся з цёмнымі шакаладкамі. Вінныя крамы прэзентавалі свае вы-

рабы ў бутэльках, запакаваных у чорнае. А на выставе жырардаўскіх палотнаў у доме Лёвенберга на рагу Сенатарскай і Белянскай грувасціліся стосы белага і чорнага палатна і хустачкі для носа з чорнай аблямоўкай. Чорны быў абавязковым колерам вуліцы.

У адказ Варшава «пажоўкла» і «паружавела». Гэта быў першы крок да новай рэформы ў галіне дзвюхмоўных шыльдаў.

## Юльянскі каляндар

Так званы стары стыль у XIX і XX стст. ужываўся афіцыйна толькі на тых польскіх землях, што ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Улады пачалі ўводзіць яго на занятых тэрыторыях ужо пасля падзелаў, аднак у канстытуцыйны перыяд Каралеўства Польскага дзейнічаў грыгарыянскі каляндар (т. зв. новы стыль). Падвойнае датаванне ці датаванне паводле юльянскага календара практыкавалася галоўным чынам у карэспандэнцыі з расійскімі ўладамі. Падвойны спосаб датавання ўвайшоў ва ўжытак у адміністрацыйных органах Каралеўства пасля паўстання 1830—1831 гг. Аднак няўрадавая карэспандэнцыя і пазней датавалася часцей паводле новага стылю. Рэформы адміністрацыі Каралеўства, якія адбыліся пасля паўстання 1863—1864 г., супалі з увядзеннем старога стылю як выключна адзінага спосабу датавання ў дзяржаўнай адміністрацыі. Прэса, гандлёвая (і прыватная) карэспандэнцыя звычайна падвойна датаваліся аж да 1915 г., калі юльянскі каляндар у Каралеўстве перастаў дзейнічаць.

Юльянскі каляндар апераджаў грыгарыянскі ў XVIII ст. (ад 1.03.1700) на 11 дзён, а ў выніку розніцы ў акрэсленні вісакосных гадоў у XIX ст. (ад 1.03.1800) на 12 дзён, а ў XX ст. (ад 1.03.1900) на 13 дзён.

## Post scriptum

Светлай памяці генерал Сувораў нібыта сказаў: «Калі Бог не пакарае Расію за ўсё тое, што мы вырабляем з палякамі, я перастану верыць у Бога».

### Рэкамендаваная літаратура

А. Сидоров. Русские и русская жизнь в Варшаве (1815—1895). — Варшава, 1895.

Armia rosyjska, studium militarne, napisał YXZ, 1887.

I. Baliński. Wspomnienia o Warszawie. -- Edynburg, 1946.

Dr. X. Prawo a bezprawie w zaborze rosyjskim. - Lwów, 1894.

A. Kraushar. Czasy sądownictwa rosyjskiego w Warszawie 1876--1915. Kartka z pamiętnika starego mecenasa. Warszawa, 1916.

A. Kraushar. Czasy szkolne za Apuchtina (1879 - 1897). Kartka z pamiętnika. Warszawa, 1915.

A. Kraushar. Warszawa historyczna i dzisiejsza. Zarysy kulturalno-obyczajowe - Lwów, 1925.

S. Krzeminski. Listy spod zaboru rosyjskiego. Krakow, 1898.

S. Kutrzeba. Przeciwieństwa i źródła polskiej i rosyjskiej kultury. — Lwów, 1916.

Z. Przygodny (L. Wasilewski). Warszawa współczesna w 12 obrazkach. — Lwów, 1903.

T. Racławicki (A. C. Bem). Spod zaboru rosyjskiego. — Poznań, 1892.

W. Studnicki. Stosunki polsko-rosyjskie. — Kraków, 1897.

J. Szczepkowski. Warszawa w latach 1885—1904. Szkice o warszawskich sprawach i ludziach. — Archiwum m. st. Warszawy, rękopis 387.

J. Wołyński. Wspomnienia z czasów szkolnictwa rosyjskiego w byłym Królestwie Polskim 1868—1915. — Warszawa, 1936.

W. Zaleski. Z dziejów prostytucji w Warszawie. — Warszawa, 1923.

А таксама прэса, календары і праваднікі па Варшаве...

*Пераклад зроблены паводле выдання:*
*Tuszyńska Agata.* Rosjanie w Warszawie. — *Warszawa: Oficyna Wydawnicza INTERIM, 1992.*

# Пасляслоўе

Перакласці кнігу польскай пісьменніцы Агаты Тушынскай «Rosjanie w Warszawie» прапанаваў былы польскі амабасадар у Беларусі Марыюш Машкевіч. Гэта адбылося падчас нашай сустрэчы ў Кракаве ў 2005 г. у межах культурнага мерапрыемства «Другія Дні Беларускай культуры ў Кракаве», якія разам са мною арганізоўвалі неабыякавыя да беларушчыны польскія студэнты Ягелонскага універсітэта. Знайшоўшы тэкст у свайго сябра з Кракава, доктара гісторыі Генрыха Глэмбоцкага, і прачытаўшы, я зразумеў, чаму амабасадар прапаноўваў пераклад. Марыюш Машкевіч за гады выканання сваіх дыпламатычных абавязкаў не толькі палюбіў Беларусь, яе людзей, культуру і прыроду, але змог глыбока зразумець нашыя праблемы. Адна з найвялікшых праблемаў беларусаў — гэта татальная русіфікацыя, суб'ектыўная і аб'ектыўная.

З часу той сустрэчы мінула добрых пяць гадоў. Аднак праблема «русіфікацыі» надалей застаецца актуальнай у нашым штодзённым жыцці.

Для польскага грамадства XIX — пачатку XX стст. панаванне Расійскай імперыі на іх айчынных землях было абсалютна новым і дзікім. Край з багатай еўрапейскай культурай і сфармаванай нацыянальнай свядомасцю сутыкнуўся з з'явамі іншай «цывілізацыі», якую белаэмігранты пазней назвалі «еўраазіяцкай». Бяда была ў тым, што новая ўлада не шукала кампрамісаў, а гвалтоўна разбурала традыцыі і культурныя здабыткі польскага грамадства і гвалтам накідала свае. А «новае» расійскае было часам прымітыўнае і грубае, часам «салдафонскае», моцна разбэшчанае і абмежаванае. Натуральна, што ўсё гэта выклікала пратэст, як вонкавы, так яшчэ больш і ўнутраны. Мастацкімі сродкамі Агата Тушынска яскрава намалявала формы і механізмы расійскага гвалту і палітыкі. А з іншага боку — паказала супрацьстаянне насельніцтва Варшавы «добразычлівасці» і «вызваленню» акупантаў.

Яшчэ адна вартасць публіцыстычнага тэксту Агаты Тушынскай бачыцца ў падказцы кірункаў для сур'ёзных навуковых гістарычных і культурнаантрапалагічных даследаванняў беларусаведаў у пытаннях месца і значэння расійскай гісторыі і культуры ў айчынным дыскурсе. Існыя сучасныя нарацыі напісаны пераважна з пазітывісцкіх метадалагічных пазіцый, а большасць яшчэ абаперта на вульгарным марксізме-ленінізме і падставах каланіяльнай культуры, мыслення і паводзінаў. Менавіта таму тэлебачанне і афіцыйныя газеты інфармуюць нас пра 200-, 150-, 100-гадовыя юбілеі на нашых землях, альбо адсылаюць у сучасных беларускіх культурных традыцыях да часу Пятра I, Лізаветы I ды Кацярыны II.

У беларускіх дыскурсе і нарацыях, а глыбей — у душах і свядомасці людзей, сядзіць не меншае зло — «савецкасць», якая з'яўляецца пачварным працягам «імперскай расійскасці». Дадзеная «савецкасць» замацаваная ў ідэалогіі і паводзінах улады, у сістэме адукацыі і культурных дзеяннях. Асабліва гэта выяўляецца ў цынічных акцыях абароны «савецкіх традыцый» так званых «грамадскіх і моладзевых» дзяржаўных утварэнняў. Улада душыць нас безгустоўнымі і кічавымі помнікамі «правадырам» сусветнай рэвалюцыі і іхным памагатым і хаўруснікам. «Савецкасць» замацавана ў шматлікай тапаніміцы і на шыльдах вуліц і плошчаў нашых гарадоў. Магчыма, прапанаваны пераклад кнігі польскай пісьменніцы будзе ўзорам для падобнага твору ў беларускай літаратуры і дапаможа ў змаганні з «русіфікацыяй» і «савецкасцю».

Агата Тушынска нарадзілася ў 1957 г. у сям'і спартовага журналіста Багдана Тушынскага і журналісткі Галіны Пшэдборскай. Вядомая і папулярная ў свеце літаратарка, рэпарцёрка, гісторык літаратуры і тэатру. Скончыла факультэт ведаў пра тэатр Вышэйшай тэатральнай школы ў Варшаве. Абараніла дысертацыю па гісторыі тэатру. З'яўляецца лаўрэаткай прэміі Ксаверыя Прушынскага. Жыве ў Таронта, але рэгулярна праводзіць заняткі з студэнтамі Ягелонскага універсітэта на літаратурна-артыстычных курсах. Аўтарка наступных твораў: «*I znowu list*» (Warszawa: Oficyna Poetów, 1990), «*Wisnowska*» (Warszawa: WAiF, 1990), «*Rosjanie w Warszawie*» (Warszawa: Interim, 1992), «*Wyznania gorszycielki. Pamiętniki Ireny Krzywickiej*» (Warszawa: Czytelnik, 1992), «*Zamieszkałam w ucieczce*» (Lublin: Kresy, 1993), «*Kilka portretów z Polską w tle. Reportaże izraelskie*» (Gdańsk: Marabut, 1993), «*Singer. Pejzaże pamięci*» (Gdańsk: Marabut, 1994), «*Wygrać każdy dzień*» (Warszawa: Diana, 1996), «*Adresat nieznany*» (Warszawa: Diana, 1998), «*Długie życie gorszycielki. Losy i świat Ireny Krzywickiej*» (Warszawa: Iskry, 1999), «*Maria Wisnowska. Jeśli mnie kochasz — zabij!*» (Warszawa: Wydawnictwo Książkowe Twój Styl, 2003), «*Miejsce przy oknie*» (Warszawa: Wydawnictwo Nowy Świat, 2004), «*Łęczyca*» (Warszawa: Diana 2005), «*Rodzinna historia lęku*» (Kraków: Wydawnictwo Literackie, 2005), «*Ćwiczenia z utraty*» (Kraków: Wydawnictwo Literackie, 2007).

Пераклад кнігі Агаты Тушынскай «*Rosjanie w Warszawie*» з'яўляецца плёнам калектыўных намаганняў. Розныя фрагменты перакладалі Аляксей Шота, Ірына Баглановіч і Натальля Місько, беларускія студэнты з Кракава, а таксама студэнт Арцём Ткачук і Альбіна і Генадзь Семянчукі з Гародні.

*Генадзь Семянчук*